WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 ВЕРАСНЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 179
(26787)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ ЎЗМАЦНІЦЬ АДКАЗНАСЦЬ ВАДЗІЦЕЛЯЎ ЗА ЯЗДУ Ў НЕЦВЯРОЗЫМ СТАНЕ

**Задачу прапрацаваць гэта пытанне ён паставіў 13 верасня на нарадзе па ўнясенні паправак у Правілы дарожнага руху.**

У прыватнасці, Прэзідэнту быў прадстаўлены праект указа «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Правілы дарожнага руху».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, пытанні забеспячэння бяспекі дарожнага руху закранаюць непасрэдна правы і законныя інтарэсы практычна ўсяго насельніцтва краіны. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў сувязі з важнасцю гэтых пытанняў яшчэ ў 2005 годзе было прынята рашэнне аб зацвярджэнні Правіл дарожнага руху на ўзроўні Прэзідэнта. «Чаму гэта было зроблена? Тады было сказана, што Правілы дарожнага руху — сур'ёзная рэч, карэктаваць іх такому сур'ёзнаму ведамству, як МУС, або каму б там ні было, нельга. І пасля таго, як мінула пяць гадоў, я пераконваюся, што гэта рашэнне было правільным», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Калі мне чарговы раз паступіў праект указа па карэкціроўцы Правіл дарожнага руху, прачытаўшы яго, я зразумеў, што Міністэрства ўнутраных спраў або нехта яшчэ маючы дачыненне да гэтых змяненняў не тое што «цягнуць коўдру на сябе», але занадта перастараліся», — сказаў Прэзідэнт.

У прыватнасці, МУС прапаноўвала абавязаць веласіпедыстаў і вадзіцеляў гужавых павозак у цёмны час сутак рухацца па дарозе ў адзенні са святловяртальнымі элементамі, а таксама знізіць дапушчальную хуткасць руху аўтамабіляў у населеных пунктах у цёмны час сутак з 60 да 50 км/гадз.

Аднак Аляксандр Лукашэнка выказаў сумненні ў мэтазгоднасці гэтых новаўвядзенняў. «У мяне ёсць сумненні: ці ўсе прапанаваныя змяненні адпавядаюць грамадскім інтарэсам? Наколькі яны з'яўляюцца своечасовымі, і ці не будзе аб'ектыўных цяжкасцяў пры іх прымяненні?» — сказаў ён.

На думку Прэзідэнта, не могуць Правілы дарожнага руху мяняцца так часта, як гэта прапануецца. «Значыць, або вы не дапрацоўваеце, не бачыце, што будзе заўтра-паслязаўтра, не можаце прадбачыць гэтага і пачынаеце карэктаваць гэтыя Правілы ледзь ці не кожны год, або ў нас сапраўды такая дрэнная сітуацыя, што трэба, напрыклад, хуткасць недзе ў населеным пункце ў цёмны час сутак абмежаваць 50 км/гадз. замест 60 км/гадз. Нібыта гэта вялікая розніца і гэта нешта зменіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Насцярожанасць Прэзідэнта выклікалі таксама змяненні, якія датычацца больш шырокага выкарыстання святловяртальных элементаў. «Ведаеце, мяне гэта насцярожваць пачынае, нібыта нейкая фірма ўжо сёння гатова вырабіць гэтыя святловяртальныя элементы, і мы кожнаму каню на хвост іх павесім і такім чынам створым поспех гэтай фірме», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Я не папракаю вас у гэтым, але гэта не можа мяне не насцярожваць», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што з апошняга варыянта праекта ўказа ў адпаведнасці з яго заўвагамі ўрад выключыў названыя нормы. «Але я хацеў бы вярнуцца да разгляду гэтых пытанняў, узважыўшы ўсе «за» і «супраць».

СТАР. 2

## РАБОЧЫЯ І ПРАЦАЎНІКІ ВЁСКІ СКЛАДУЦЬ ПАЛОВУ ДЭЛЕГАТАЎ НА VI З'ЕЗДЗЕ ФЕДЭРАЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ

**Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід Козік у час сустрэчы 13 верасня праінфармаваў кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнку аб гатоўнасці да чарговага, VI з'езда Федэрацыі прафсаюзаў, які намечаны на 15—16 верасня. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Як расказаў Леанід Козік, практычна палова дэлегатаў — рабочыя і працаўнікі вёскі. Аляксандр Лукашэнка лічыць важным, што пры разглядзе актуальных для нашага грамадства тэм будуць удзельнічаць прадстаўнікі ўсіх слаёў насельніцтва.

Аб намеры дэлегатаў актыўна абмяркоўваць унесеныя ў парадак дня пытанні на маючым адбыцца з'ездзе сведчыць хаця б той факт, што ў спісы для прамоўцаў ужо запісаліся каля 50 чалавек.

Леанід Козік перадаў Прэзідэнту Беларусі, які з'яўляецца дэлегатам з'езда, запрашэнне і матэрыялы па мерапрыемстве.

На сустрэчы былі таксама закрануты пытанні развіцця ў краіне сістэмы дзіцячага аздараўлення і, у прыватнасці, стану дзіцячых аздараўленчых устаноў. Год таму Прэзідэнт даваў даручэнне навесці там належны парадак. Паводле слоў кіраўніка ФПБ, шмат ужо зроблена, але разам з тым шэраг пытанняў яшчэ трэба будзе вырашыць.

Размова ішла аб рабоце працоўных калектываў. Паводле слоў Леаніда Козіка, у краіне засталося некалькі дзясяткаў прадпрыемстваў, на якіх пакуль працуюць няпоўныя рабочы дзень і тыдзень. Але пры гэтым у параўнанні з мінулым годам становішча кардынальна палепшылася.

Аляксандр Лукашэнка цікавіўся функцыянаваннем кантрактнай сістэмы найму. Паводле слоў кіраўніка ФПБ, з прыняццем рашэння аб магчымасці пераходу работнікаў з працоўнага кантракта на доўгатэрміновы або бестэрміновы працоўны дагавор спыніліся спекуляцыі на гэту тэму. Цяпер добрасумленныя працаўнікі самі могуць выбраць найбольш прымальныя для сябе ўмовы найму на работу.

Прэзідэнт прапанаваў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі сумесна з урадам выпрацаваць інструкцыі і нарматыўна-прававыя акты, неабходныя для ўдасканалення гэтых працэдур. Аляксандр Лукашэнка сказаў аб неабходнасці прадоўжыць маніторынг гэтай тэматыкі ў працоўных калектывах.

Каментуючы на сустрэчы чуткі пра нібыта магчымае павелічэнне пенсійнага ўзросту ў краіне, кіраўнік дзяржавы заявіў аб тым, што «размовы аб гэтым не ідзе».

## На Залатой Гары

**МІКАЛАЙ Фралоў і яго суседка Ідэя Казакевіч жывуць у Чашніках на вуліцы, якая некалі называлася Залатая Гара. Назва была настолькі арыгінальная, што і дагэтуль некаторыя жыхары райцэнтра яе ўжываюць у размовах, хоць пасля вайны старажытную вуліцу перайменавалі ў Пралетарскую. У Беларусі мала гэткіх красамоўных гістарычных назваў і вельмі шкада, што і Чашнікі адракліся ад выключна прыгожай, сапраўднай назвы-жамчужыны. Ды і не толькі ад гэтай.**

— Калі горад аднаўлялі пасля вайны, вуліцу Замкавую перайначылі ў Валадарскага, а Лепельскую — у Луначарскага, — кажа 75-гадовы Мікалай Іванавіч, які нарадзіўся і вырас на Залатой Гары. З яе пайшоў служыць у армію, а вярнуўся ўжо на... Пралетарскую.

Ідэя Фёдараўна кажа, што вуліца была надзвычай вясёлая і шматдзетная. На ёй жыло шмат яўрэяў. Да вайны. У вайну амаль усіх яўрэяў расстралялі. Яна добра памятае той дзень, калі людзей павялі на расстрэл. Помніць і прозвішчы некаторых колішніх суседзяў: Глозманы, Шпільманы, Фальбусы...

У хлопчыкаў, якія ў гэты час вярталіся са школы, запытаўся пра старую назву і пачуў, што яны нічога пра яе не ведаюць. Але і пра Валадарскага з Луначарскім таксама ім невядома.

— Можа, каб вярнулі прыгожую назву назад, дык і вуліцу б трохі давялі да ладу, заасфальтавалі і добраўпарадкавалі, — кажуць-пытаюцца старэйшыя жыхары-суседзі Мікалай і Ідэя.

Сапраўды, Залатая Гара заслугоўвае большай увагі ад горада. Днямі ў Чашніках прайшло чарговае свята, а вуліца, хоць менавіта з яе пачынаўся некалі горад і знаходзіцца яна амаль у цэнтры, застаецца не самай прывабнай. І гэта мякка кажучы.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

## ТЫДЗЕНЬ БАБІНАГА ЛЕТА І ДАЖДЖЫ

### Пахаладае толькі бліжэй да выхадных

**Сёння Беларусь застанецца ў зоне павышанага атмасфернага ціску з камфортным надвор'ем, што завітала да нас з боку поўдня Еўропы. Толькі ўвечары да паўночна-заходніх раёнаў падыдзе слабы атмасферны фронт, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў аўторак будзе сухое цёплае надвор'е, а ўвечары месцамі ў Гродзенскай і па захадзе Віцебскай вобласці магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы 7—13, удзень — 18—24 градусы. У сераду ў краіну завітае шырокі атлантычны цыклон з боку Скандынавіі, таму па паўночным захадзе і ў цэнтральных раёнах пройдзе кароткачасовы дождж. Раніцай у асобных раёнах па паўднёвым усходзе магчымы туман. Уначы будзе 8—14, удзень — 15—21, а па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да 25 градусаў.

Сіноптыкі прагназуюць, што ў чацвер кароткачасовыя дажджы будуць назірацца ўжо амаль паўсюдна на тэрыторыі Беларусі, удзень месцамі навальніцы. Тэмпература ўначы 7—14, удзень 16—23 градусы. У пятніцу ападкаў стане значна менш. Толькі ўначы на паўднёвым усходзе, а ўдзень месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, часам навальніцы. Уначы будзе ад 6 цяпла на захадзе да 13 на ўсходзе, удзень — 16—21.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у выхадныя да нас завітае больш халоднае паветра з боку Балтыйскага мора. Павялічыцца воблачнасць, зноў у многіх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. У суботу ўдзень на паўднёвым усходзе магчымыя навальніцы. Тэмпература ў суботу ўначы 7—14, удзень — 14—20, а ў нядзелю яшчэ на некалькі градусаў халадней.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ГАРЭЛІ ПАНЧОШНА-ТРЫКАТАЖНЫЯ ВЫРАБЫ

**У Віцебску гарэў склад гатовай прадукцыі — панчошна-трыкатажных вырабаў прыватнай фірмы. Як паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо, выратавальнікі на месца пажару прыехалі а дзявятай гадзіне раніцы. Фірма арандуе склад у вытворчага аб'яднання «Маналіт».**

Калі выратавальнікі прыехалі на месца, назіралася гарэнне склада плошчай 110 квадратных метраў. Прадукты гарэння па калідорах першага паверха распаўсюдзваліся на другі паверх, дзе знаходзяцца адміністрацыйныя памяшканні. Людзі, якія працавалі на другім паверсе, аказаліся адрэзанымі ад шляхоў эвакуацыі. Стварылася рэальная пагроза іх жыццю. Падчас правядзення разведкі ў будынку пажарныя высветлілі, што на складзе, які гарыць, ёсць два газавыя балоны, якія маглі выбухнуць у любую секунду. На месцы пажару стварылі спецыяльны штаб, у склад якога ўвайшлі кіраўнікі фірмы, аб'яднання «Маналіт» і Віцебскага ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. З памяшканняў другога паверха выратавальнікі з прымяненнем спецыяльных лесвіц эвакуявалі 13 чалавек. У выніку пажару ніхто не пацярпеў. Страта ад пажару ўстанаўліваецца, яго прычыны высвятляюцца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Дзержинский райагросервис» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже **нефтебазы**, расположенной по адресу: **Минская обл., г. Дзержинск, пер. Коммунистический, 16,** в составе: административное здание (об. пл. 58,6 кв.м); насосная (38,3 кв.м); склад (42,2 кв.м); бытовое здание (48,9 кв.м); производственно-бытовое здание (77,9 кв.м); гараж (70,8 кв.м); **подъездной железнодорожный путь**, иные сооружения и оборудование нефтебазы.

Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 1 274 859 217 бел. руб.

Площадь земельного участка **2,7534 га.**

Задаток 50 000 000 бел. руб.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.07.2010.

Аукцион состоится **21.09.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі дзіцячых фондаў Альберта Ліханава з 75-годдзем

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі дзіцячых фондаў, старшыню праўлення Расійскага дзіцячага фонду Альберта Ліханава з 75-годдзем.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ВУП Беларусі ў студзені—жніўні вырас на 6,1 працэнта

**Аб'ём валавога ўнутранага прадукту Беларусі ў студзені—жніўні 2010 года павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ў супастаўных цэнах на 6,1 працэнта, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

У адпаведнасці з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, у 2010 годзе прадугледжаны рост ВУП на 11—13 працэнтаў.

Вытворчасць прамысловай прадукцыі за восем месяцаў 2010 года склала 109,8 працэнта (гадавы прагноз 110—112 працэнтаў) да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года і перавысіла Br100,137 трлн. Выпуск спажывецкіх тавараў склаў Br22,336 трлн (112 працэнтаў), у тым ліку харчовых — Br12,087 трлн (111,1 працэнта), нехарчовых — Br8,906 трлн (113,6 працэнта). Прагноз на 2010 год па вытворчасці спажывецкіх тавараў — 114—115 працэнтаў.

ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ
КУПП «Витпекс»
(36 кв. м; 40,8 кв. м; 793,9 кв. м; 1042,7 кв. м; 1207,8 кв. м; 1189,9 кв. м; 2939,2 кв. м)
в г. Витебске
по ул. Володарского, 100.
ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.
Информация на сайте:
www.vitinvest.biz.
Тел.: 431498, +375336480387; +375292962323 МТС.
УНП 300149663

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЗША СПАЛІЛІ КАРАН

**Нягледзячы на тое, што пастар царквы штата Фларыда Тэры Джонс адмяніў прызначаную на 11 верасня гучную акцыю спалення Карана і шчыра заклікаў іншых гэтага не рабіць, планы святара ўсё ж былі выкананыя ў іншым штаце. «Вызначыўся» пастар Боб Оўлд з мястэчка Нэшвіл штата Тэнесі.**

Яшчэ толькі планы некаторых амерыканцаў па спальванні Карана выклікалі ў мусульманскім свеце буру абурэння. Некаторыя ісламскія дзеячы казалі нават пра магчымасць пачатку вайны ў гэтай сувязі. Рашуча асуджалі антымусульманскія выхадкі і кіраўнікі шматлікіх заходніх краін і міжнародных арганізацый. У цяперашні час у Афганістане працягваюцца дэманстрацыі пратэсту супраць спалення Карана. Удзельнікі маніфестацыі выкрыкваюць антыамерыканскія і антынатаўскія лозунгі, паляць аўтапакрышкі. Супраць спалення святой кнігі выступілі таксама прадстаўнік адміністрацыі прэзідэнта ЗША і лідары розных рэлігійных рухаў. Разам з тым мэр Нью-Ёрка Майкл Блумберг выступіў з абаронай святара, які спаліў Каран.

### ЕЎРОПУ ЧАКАЕ САМЫ ЛЮТЫ МАРОЗ ЗА ТЫСЯЧУ ГАДОЎ

**Польскія метэаролагі чакаюць, што зіма 2010—2011 гадоў можа стаць адной з самых суровых у Еўропе за апошняе тысячагоддзе.**



На думку навукоўцаў, астуджэнне Еўропы звязана з тым, што хуткасць руху водаў Гальфстрыма знізілася ў два разы ў параўнанні з тым, якая была яшчэ некалькі гадоў таму. І зараз ён не ў стане кампенсаваць холад, які прыносяць паветраныя масы з Арктыкі. Па словах кліматолага з Інстытута метэаралогіі і воднай гаспадаркі Польшчы, гэтыя змены ўжо прыкметныя ў Нарвегіі і шэрагу іншых скандынаўскіх краін. Калі Гальфстрым цалкам знікне, то Еўропу чакае ледавіковы перыяд, а ў Скандынавіі магчымае ўтварэнне буйнага ледніка. Некаторыя навукоўцы нават звязваюць прычыну паслаблення Гальфстрыма з аварыяй нафтаздабывальнай платформы Deepwater Horizon кампаніі BP у Мексіканскім заліве, якая адбылася 22 красавіка.

### У КРЫМЕ ПАТАНУЛА ДЗЕВЯЦЬ ЧАЛАВЕК

**Падчас шторму, які прайшоў на Чорным моры каля берагоў Крыма ў мінулыя выхадныя, патанула дзевяць чалавек.**

У ліку патанулых — адзін крымчанін, двое беларусаў, двое грамадзян Расіі і жыхар Луганскай вобласці. Асобы яшчэ траіх загінулых пакуль не высветленыя. Шторм, які працягваўся каля паўднёвага берага Крыма два дні, дасягаў сілы ў шэсць балаў. Па звестках МНС Украіны, усяго з пачатку купальнага сезона ў Чорным моры патанулі 74 чалавекі.

### ПАМЁР КЛАСІК ФРАНЦУЗСКАГА КІНО

**Ва ўзросце 80 гадоў у нядзелю памёр вядомы французскі кінарэжысёр Клод Шаброль.**



Шаброль быў адным з самых яркіх прадстаўнікоў «новай хвалі» ў французскім кінематографе. Першая стужка Шаброля — «Прыгажунчык Серж» (1958) — стала маніфестам новага кінаруху і зрабіла фурор, як і наступная карціна — «Кузены» (1959). Асабліва яркім быў перыяд канца 1960-х — пачатку 1970-х гадоў: «Няслушная жонка» (1969), «Хай памрэ звер» (1969), «Мяснік» (1969), «Разрыў» (1970), «Крывавае вяселле» (1973), калі крытыка звала рэжысёра, яго пастаяннага суаўтара сцэнарыяў Поля Жэгофа і актрысу і жонку Шаброля Стэфан Адран стваралнікамі «новай чалавечай камедыі», параўноўваючы з Бальзакам.

### ПУГАЧОВА ЗАБЯРЭ Ў БАНКІРА КВАТЭРУ І ЗЯМЛЮ

**Дарагамілаўскі суд спагнаў на карысць знакамітай спявачкі Алы Пугачовай звыш 4,5 мільёна долараў з экс-уладальніка банка «Сенатар» Алега Рафановіча.**



Раней прадстаўнік спявачкі паведаміў СМІ, што яго давэральніца ў лістападзе 2009 і студзені 2010 гадоў пазычыла Рафановічу дзвюма партыямі каля 4,38 мільёна долараў. Прычым грошы даваліся пад распіскі, якія былі прад'яўленыя суду. Пугачова звярнулася з іскам у суд, калі Рафановіч перастаў выходзіць на сувязь. Суд наклаў арышт на маёмасць экс-банкіра, пад арышт патрапілі дзве кватэры ў Маскве і некалькі зямельных участкаў у Падмаскоўі. Сам былы банкір падчас працэсу заявіў, што не лічыць сябе даўжніком Пугачовай: «Я браў грошы, я іх вярну, і не трэба мне пагражаць, устаньце ў чаргу і паводзьце сябе прыстойна».

Харчовая бяспека

# БУДЗЕ КАША З МАСЛАМ. ВА ЎСЁЙ КРАІНЫ

**ТЭМА прэс-канферэнцыі, якая прайшла ўчора ў Нацыянальным прэс-цэнтры, гучала даволі агульна і нават традыцыйна для гэтай пары года, паколькі з 15 верасня пачынаецца закладка асноўных прадуктаў харчавання на міжсезонны перыяд: «Харчовы рынак Беларусі: стан і перспектывы». Аднак і выступоўцы, прадухіляючы непазбежныя пытанні журналістаў, і самі прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі перыядычна на працягу ўсяго мерапрыемства зноў і зноў вярталіся да таго, што на слыху апошні час. А менавіта: да ажыятажнага попыту з боку насельніцтва на некаторыя віды харчовых тавараў, часовыя перабоі з іх наяўнасцю на паліцах крамаў.**

### Дзе былі грэцкія крупы...

Вядома, галоўным было пытанне пра грэцкія крупы. На ім у ліку першых і спыніўся **міністр гандлю Валянцін ЧЭКАНАЎ**, заявіўшы, што ажыятажны попыт на яе нічым не апраўданы.

— З года ў год, хачу падкрэсліць, аб'ёмы вытворчасці розных крупаў павялічваюцца. Так, вытворчасць грэцкіх крупаў за апошнія два гады павялічылася больш чым у два разы: з 5 400 тон у 2008 годзе да 12 тон сёлета. За 8 месяцаў арганізацыям гандлю пастаўлена 26,3 тысячы тон крупаў, у тым ліку 8,6 тысячы тон грэцкіх, г.зн. больш за 1 100 тон у месяц, — сказаў міністр. — З верасня вытворчасцю грэцкіх крупаў займаюцца два айчынныя прадпрыемствы — «Гомельхлебапрадукт» і «Гроднахлебапрадукт», якія забяспечваюць гандаль рытмічнымі пастаўкамі. Я ўпэўнены, што ніякіх праблем з гэтым таварам ужо на гэтым тыдні не будзе, паколькі гэтыя два прадпрыемствы ў стане цалкам забяспечыць унутраны рынак.

Па словах **намесніка міністра — дырэктара дэпартамента па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Васіля СЕДЗІНА**, сёлета ўраджай грэчкі, як мяркуецца, складзе 27 тысяч тон, з якіх плануецца вырабіць не меней за 9 тысяч тон грэцкіх крупаў, што павінна забяспечыць патрэбы краіны. На экспарт Беларусь не плануе яе пастаўляць, паколькі наша краіна ніколі не была значным экспарцёрам гэтай прадукцыі, дадаў выступоўца.

Працягваючы тэму, **намеснік старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КАЛТОВІЧ** паведаміў журналістам, што, дзякуючы ажыятажнаму попыту, пастаўкі грэцкіх крупаў у рознічны гандаль павялічыліся ў 2,5 раза. Напрыклад, 9 верасня ў гандлёвую сетку Мінска пастаўкі склалі 28,8 тоны, 10 верасня — 29,8 тоны, 11 верасня — 27 тон, 12 верасня — 20 тон. Гэта ў два-тры разы больш за сяроднядзённую норму, канстатаваў Уладзімір Калтовіч. З яго далейшых слоў вынікала, што зараз на складах у сталіцы знаходзіцца 167 тон грэцкіх крупаў.

А ўсяго за першую дэкаду верасня ў рознічную сетку краіны, паводле слоў міністра гандлю, было пастаўлена 588 тон грэчкі, што складае амаль 50 працэнтаў сяроднямесячнай вытворчасці. У Мінску аб'ём рэалізацыі грэцкіх крупаў за гэты ж час склаў 342 тоны, што на 16 працэнтаў больш за сяроднямесячны аб'ём рэалізацыі ў гэтым годзе.

### ...і хто ў тым вінаваты?

Чаму ж тады ўзнікла такая сітуацыя, калі людзі бегалі па крамах і, калі бачылі ў продажы грэцкія крупы — а сустрэць іх можна было далёка не ў кожнай гандлёвай арганізацыі, імкнуліся прыкупіць не кілаграм, а некалькі адразу?

Каментуючы падзеі мінулага тыдня, міністр гандлю Валянцін Чэканаў мякка папракнуў журналістаў, маўляў, сітуацыю крыху падагрэлі сродкі масавай інфармацыі.

А намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Седзін агучыў трохі іншы аспект сітуацыі.

— У дачыненні да грэцкіх крупаў: з'явіліся нядобрасумленныя імпарцёры. Калі ім было добра, яны максімальна сюды імкнуліся. А цяпер ёсць такія факты, якія дэстабілізуюць абстаноўку ў краіне. Значыць, адправілі нашу хлебную інспекцыю і выявілі: у той час, як у некаторых крамах адсутнічалі грэцкія крупы, дык па стане на 10 верасня ў адной арганізацыі мелася на складах 164 тоны грэцкіх крупаў. Уяўляеце? 164 тоны, якія не пастаўляліся ў рознічную сетку! Я так думаю, гэта асабіста маё меркаванне, яны чакалі павышэння цаны. Але гэта няправільная пазіцыя, — сказаў Васіль Седзін.

Дарэчы, наконт цаны на грэцкія крупы. Тыя спажыўцы, якім пашчасціла на мінулым тыдні знайсці ў продажы гэты прадукт, заўважалі, што рознічная цана на яго павялічылася ці не з кожнай новай партыяй. Ніхто не сумняваўся, што дэфіцыту грэцкіх крупаў не будзе. Але чаму цяпер, калі прадукт з'явіўся на паліцах крамаў, цану на яго не вярнулі назад? Гэтае пытанне і задалі журналісты.

— Трэба разумець сітуацыю, якая адбываецца не толькі ў нашай краіне. Мы бачым, што побач з намі. А побач з намі — у Расіі і іншых краінах — цана вышэйшая. Нашмат вышэйшая па некаторых відах тавараў, — адказаў міністр гандлю. — У гэтым выпадку мы прааналізавалі і гэты тавар — грэчку. Высветлілася, што яны вышэйшыя. Таму і было прынятае гэта рашэнне: трохі павысіць цэны. Але я магу сказаць вам адназначна: гэтая цана ніжэйшая, чым за мяжой. Не здзіўляе, што недзе, у бліжэйшых да нашай краіны раёнах, з'яўляецца тавар нашых вытворцаў. Гэта нармальна. Ідзе ператок... Цана будзе трымацца такой, якая яна ёсць. Калі мы пабачым, што працягваецца такая тэндэнцыя (ажыятажны попыт — **С. Р.**), будзем ва ўрадзе прымаць адпаведныя меры. Пакуль такой неабходнасці няма.

### Масла ў нас дастаткова

Яшчэ адной тэмай, якая закраналася на прэс-канферэнцыі, была тэма масла. Апошнім часам пайшла пагалоска, што гэты прадукт нароўні з грэцкімі крупамі таксама быццам бы можа патрапіць у разрад дэфіцытных.

На гэтыя чуткі міністр гандлю Валянцін Чэканаў адрэагаваў наступнымі словамі: «Таксама незразумелая сітуацыя ўзнікла. Як быццам бы не хапае гэтага прадукту. Ужо чагочаго, а масла ў нашай краіне дастаткова... Каб і краіну накарміць і, як вы ведаеце, прадаць большую частку гэтага прадукту на знешніх рынках, зарабіць валюту. Сёння праблем няма. Асартымент: тры-восем-дзевяць найменняў — ёсць у крамах. Холадакамбінаты маюць дастатковую колькасць гэтага тавару ў сабе ў халадзільніках, яно пастаўляецца ў сетку... Хачу адзначыць, што на ўнутраны рынак пастаўляецца ўсяго толькі 30 працэнтаў масла. Так што гэтая праблема, калі яе так можна назваць (хутчэй — пытаннем) не мае пад сабой ніякай глебы... Калі будзе неабходнасць павялічыць колькасць паставак, тавару ў крамы, мы іх павялічым».

Карыстаючыся выпадкам, прысутныя журналісты папрасілі міністра адказаць: ці будуць павялічвацца цэны на масла для ўнутранага рынку? «Я ў гэтым пакуль не бачу неабходнасці — ніякай абсалютна», — адказаў Валянцін Чэканаў.

### Запасы будуць павялічаныя

Падчас сустрэчы было падкрэслена, што забеспячэнне ўнутранага рынку харчовымі таварамі вядзецца ў асноўным за кошт прадукцыі айчыннай вытворчасці. Удзельная вага тавараў айчыннай вытворчасці па харчовых таварах у агульным аб'ёме іх продажу за студзень—ліпень склала 85,2 працэнта. Гэтыя лічбы сведчаць пра забеспячэнне харчовай бяспекі краіны. Удзельная вага імпарту харчавання ў структуры тавараабароту харчовых тавараў не павінна перавышаць, згодна з Канцэпцыяй нацыянальнай харчовай бяспекі Рэспублікі Беларусь, 20—25 працэнтаў. Заразпаказчык складае каля 15 працэнтаў.

Для забеспячэння насельніцтва ў міжсезонны перыяд 2010—2011 гадоў вядзецца нарыхтоўка прадуктаў раслінаводства і жывёлагадоўлі. Урадам зацверджаныя адпаведныя аб'ёмы і наменклатура стабілізацыйных фондаў, што ствараюцца аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам; яны павялічаныя ў параўнанні ў леташнім годам. Так, бульбы будзе закладзена 65 400 тон, што на 15 працэнтаў больш у параўнанні з закладкай 2009-2010 гадоў, капусты — 33 010 тон (на 17 працэнтаў больш), морквы — 16 320 тон (на 14 працэнтаў), буракоў — 12 190 тон (на 12 працэнтаў), цыбулі — 16 440 тон (на 50 працэнтаў), садавіны — 12 550 тон (на 26 працэнтаў), масла — 1 945 тон (на 9 працэнтаў), сыра сычужнага — 1 420 тон (на 27 працэнтаў), сухога малака — 2 170 тон (на 24 працэнты), свініны і ялавічыны — 2025 тон (на 9,5 працэнта адпаведна).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.09.2010 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 3 025,00 | 1 чэшская крона | 157,00 |
| ▲ 1 еўра | 3 879,26 | 1 польскі злоты | 985,65 |
| 1 латвійскі лат | 5 468,68 | ▲ 1 расійскі рубель | 98,59 |
| 1 літоўскі літ | 1 122,20 | 1 украінская грыўня | 382,21 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,6831 |
| 10 UAH | 38,7658 |
| 1000 BYR | 10,1198 |
| EUR | 39,3235 |

Агенцтва Уладзіміра Грачова

## ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА З 20-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ПІЯНЕРСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

*Дарагія сябры!*

*Ад усёй душы віншую Беларускую рэспубліканскую піянерскую арганізацыю з 20-годдзем з дня ўтварэння.*

*Захоўваючы лепшыя традыцыі савецкай піянерыі, авеяныя духам сяброўства, рамантыкі, добрых спраў, Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя стала сучаснай, дынамічнай, прывабнай больш як для паўмільёна дзяцей, якія сёння з'яўляюцца яе членамі.*

*Патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне падрастаючага пакалення, яго творчае развіццё, «цімураўскі» і юнармейскі рухі, дапамога дзецям-інвалідам — гэта толькі нямногае з таго, чым славіцца наша піянерыя, у чым яна з'яўляецца надзейным партнёрам дзяржавы.*

*Юныя суайчыннікі! Піянер — той, хто ідзе наперадзе, смела глядзіць у будучыню. А гэта важная якасць, бо мы самі будуем свой заўтрашні дзень.*

*Будзьце патрыётамі роднай зямлі. Добрасумленна вучыцеся, не адступайце перад цяжкасцямі. Пастарайцеся праз усё жыццё пранесці высокія ідэалы піянерыі — сумленнасць і справядлівасць, спагадлівасць і ўзаемадапамогу.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту і поспехаў ва ўсіх добрых пачынаннях.*

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ ЎЗМАЦНІЦЬ АДКАЗНАСЦЬ ВАДЗІЦЕЛЯЎ ЗА ЯЗДУ Ў НЕЦВЯРОЗЫМ СТАНЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асноўным дакладчыкам на нарадзе выступіў міністр унутраных спраў Анатоль Куляшоў. Паводле яго слоў, прапанаваныя змяненні накіраваны на стварэнне максімальнай абароненасці ўсіх удзельнікаў дарожнага руху.

Асноўнай прычынай жа ўнясення змяненняў і дапаўненняў у ПДР стала неабходнасць рэалізацыі ўказа № 519, які прадугледжвае ўдасканаленне заканадаўства па пытанні транспартнага страхавання. Так, значна спрасціўся парадак афармлення неабходных дакументаў аб ДТЗ без удзелу супрацоўнікаў ДАІ (пры ўроне, які не перавышае 200 еўра) і істотна знізіліся тэрміны выплаты страхавой кампенсацыі (з 30 да 5 дзён).

Уносіцца дакладнасць па выкарыстанню ўдзельнікамі дарожнага руху трамвайнага пуці як дадатковай паласы пры павароце налева і развароце.

Сярод іншых прапаноў МУС па карэкціроўцы правіл — дазвол перавозкі пасажыраў на мапедах адпаведнай канструкцыі, зняцце забароны на спыненне транспартнага сродку на тратуары пры падвозе тавараў да гандлёвай кропкі, выкладанне некаторых тэрмінаў у новай рэдакцыі, што выключае розначытанні, а таксама тэхнічныя папраўкі.

Анатоль Куляшоў пагадзіўся з заўвагамі кіраўніка дзяржавы аб немэтазгоднасці ўнясення паправак, якія датычацца больш шырокага выкарыстання святловяртальных элементаў. Прэзідэнт наконт гэтага заўважыў, што неабходна больш актыўна весці растлумачальную работу з насельніцтвам па выкарыстанні гэтых элементаў, паколькі ў першую чаргу размова ідзе аб уласнай бяспецы грамадзян.

Што ж датычыцца абмежавання хуткасці руху ў населеных пунктах з 60 да 50 км/гадз. у цёмны час сутак і пры недастатковай бачнасці дарогі, то Анатоль Куляшоў заўважыў, што такая прапанова ўносілася з улікам вывучэння вопыту іншых краін. Паводле яго слоў, такое абмежаванне хуткасці дзейнічае ва ўсіх краінах Еўропы, за выключэннем Польшчы і постсавецкіх дзяржаў.

Аднак, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, няма неабходнасці ўвядзення такой нормы паўсюдна. На яго думку, у населеных пунктах, дзе гэтага патрабуе сітуацыя, можна ўстанавіць спецыяльныя знакі, якія абмяжоўваюць хуткасць руху. У цэлым жа, як пагадзіліся ўсе ўдзельнікі нарады, рашэнне аб абмежаванні хуткасці паблізу таго або іншага населенага пункта будзе прымацца зыходзячы з асаблівасці дарогі, умоў дарожнага пакрыцця, а таксама іншых істотных фактараў.

«Давайце не будзем такімі нормамі перагружаць Правілы дарожнага руху. Няхай чалавек сам вырашыць, трэба яму гэта ці не трэба, — падвёў вынік Прэзідэнт. — Вось мяне, напрыклад, не трэба агітаваць за тое, каб дзіцяці наклеіць на рукаў святлоадбівальны элемент. Як і любым іншым свядомым бацькам». Акрамя таго, на думку кіраўніка дзяржавы, прапісванне такой нормы ў ПДР таксама створыць дадатковыя цяжкасці для работнікаў міліцыі. «Трэба як мага радзей мяняць Правілы дарожнага руху. А калі мы да іх звяртаемся, то звяртацца трэба па сутнасці, трэба глядзець у корань праблемы», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка лічыць мэтазгодным перагледзець нормы правіл, якія датычацца кіравання транспартным сродкам у стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення. «Шмат людзей гіне на дарогах па прычыне п'янства. Вось гэтага быць не павінна!» — падкрэсліў ён.

На думку Прэзідэнта, за такія правапарушэнні неабходна прыцягваць да строгай адказнасці. «За п'янкі трэба прыцягваць да самай сур'ёзнай адказнасці. Таму што гэта, напэўна, галоўная прычына ўсіх бед на дарозе», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт даручыў яшчэ раз дэталёва разгледзець усе нормы ПДР, якія датычацца дапушчальнага ўзроўню алкаголю ў крыві. «Давайце да гэтага вернемся, але толькі аб'ектыўна. П'янства — гэта раскоша для вадзіцеля! Спаганяць трэба жорстка!» — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы закрануў і пытанне тэхнічнага стану транспартных сродкаў. У прыватнасці, ён даручыў Міністэрству ўнутраных спраў і дзяржаўнаму сакратару Савета Бяспекі вясной будучага года арганізаваць агляд машынных двароў і транспартных сродкаў ва ўсіх сельскагаспадарчых арганізацыях краіны. На думку Прэзідэнта, гэта — адзін з фактараў бяспекі, паколькі па прычыне тэхнічнай няспраўнасці транспартных сродкаў гіне вялікая колькасць людзей.

Акрамя таго, у сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца вельмі дарагая тэхніка, да якой не заўсёды належным чынам ставяцца. «Калі б сёння гэтай тэхнікі не было, мы мелі б катастрофу. Мы не забяспечылі б харчовую бяспеку, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі прыватнік яшчэ беражэ гэту тэхніку, то ў так званых рэфармаваных гаспадарках мала што змянілася з ранейшых часоў». «Мы фактычна за кошт дзяржавы ўкінулі вялікую колькасць тэхнікі, а берагчы не навучыліся. Гэта мяне таксама насцярожвае», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў прапрацаваць гэта пытанне і ўнесці яму прапановы. Ён таксама лічыць неабходным прапісаць асабістую адказнасць вадзіцеляў і кіраўнікоў гаспадарак за стан тэхнікі. «Мы павінны гэта зрабіць, каб пазбегнуць цяжкіх выпадкаў з-за няспраўнасці тэхнічных сродкаў і прымусіць нармальна ставіцца да тэхнікі, каб яе зберагчы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Што ж датычыцца паправак у Правілы дарожнага руху, кіраўнік дзяржавы даручыў дапрацаваць праект указа з улікам выказаных заўваг. Ён таксама ўказаў на неабходнасць больш актыўнай работы з насельніцтвам, шырокага інфармавання аб усіх прапанаваных у ПДР новаўвядзеннях праз сродкі масавай інфармацыі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ДА КАНЦА ГОДА ПАДПІШУЦЬ НОВАЕ ПАГАДНЕННЕ АБ ПАСТАЎКАХ СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫІ

**Пра гэта заявіў учора журналістам у Санкт-Пецярбургу прэм'-ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Паводле слоў прэм'ер-міністра, мінсельгасхарчы дзвюх краін вядуць актыўны дыялог, абмяркоўваючы перспектывы паставак мясной і малочнай груп тавараў. Чакаецца, што на пасяджэнні калегіі двух міністэрстваў будзе падпісаны дакумент, які вызначыць, якім чынам будуць ажыццяўляцца пастаўкі сельгаспрадукцыі.

«Цяпер мы з урадам Расіі заканчваем падрыхтоўку дакументаў па адзінай эканамічнай прасторы Мытнага саюза, адным з пытанняў з'яўляецца работа на сельгасрынках, — расказаў Сяргей Сідорскі. — Гэта пагадненне мае высокую ступень гатоўнасці, над ім працуюць эксперты як у Мінску, так і ў Маскве». Паводле слоў прэм'ер-міністра Беларусі, пагадненне па пастаўках сельгаспрадукцыі будзе падпісана да 1 студзеня наступнага года.

Парламенцкі дзённік

# І ПА СЛУЖБЕ, І ПА ДРУЖБЕ

## Супрацоўніцтва з Кітаем — прыярытэтнае ў знешняй палітыцы Беларусі

**Наша сяброўства з Паднябеснай вытрымлівае праверку і часам, і адлегласцю. Сувязі паміж дзвюма такімі рознымі краінамі толькі мацуюцца, а паездкі «ў госці» адна да адной пачашчаюцца. Гэтымі днямі ў Беларусі знаходзіцца кітайская парламенцкая дэлегацыя.**

— Паміж парламентамі Беларусі і Кітая ўсталяваліся цёплыя сяброўскія адносіны, — адзначае **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**, прыгадваючы свой візіт у прыгожую ўсходнеазіяцкую краіну. — Нас радуе, што міжпарламенцкія кантакты носяць такі рэгулярны характар.

Менавіта дзякуючы такім сувязям — на высокім і найвышэйшым узроўнях, на яго думку, і стала прыкметным «сур'ёзнае прасоўванне ва ўсіх сферах нашага супрацоўніцтва». Супрацоўніцтва, якое, на думку палітыка, носіць узаемавыгадны характар. Патэнцыял тут вялікі і яшчэ не выкарыстаны. Было б толькі жаданне для яго рэалізацыі.

— З боку беларускіх парламентарыяў такое жаданне ёсць, — запэўнівае У. Андрэйчанка кітайскіх калег.

Кіраўнік замежнай дэлегацыі Цзян ШУШЭН меркаванне аб важнасці міжпарламенцкіх сувязяў падзяляе:

— Мы былі абраныя сваімі народамі, таму сувязь паміж парламентарыямі можа ўмацоўваць узаемаразуменне паміж народамі. У гэтай сферы важныя кантакты не толькі на высокім узроўні, але і паміж спецыялізаванымі камісіямі, працаўнікамі. Спадзяюся, што акрамя міжпарламенцкіх сувязяў, будуць умацоўвацца таксама міжурадавыя і міжпартыйныя сувязі.

Намеснік старшыні Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў таксама з задавальненнем адзначыў, што «18 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносінаў кітайска-беларускае супрацоўніцтва стабільна развівалася». І ў стымуляванні двухбаковых адносінаў вельмі важным фактарам з'яўляюцца, на яго думку, цесныя кантакты на высокім і найвышэйшым узроўнях. У прыватнасці, сустрэча лідараў дзвюх дзяржаў, паводле інфармацыі спадара Шушэна, можа адбыцца ўжо ў каст-рычніку.

— Наколькі нам вядома, Прэзідэнт Беларусі мае намер узяць удзел у Дні Беларусі на выставе «Экспа-2010» у Шанхаі. У гэты час можа адбыцца сустрэча кіраўнікоў дзвюх дзяржаў, якая абавязкова акрэсліла б новыя перспектывы для супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, — паведаміў намеснік старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў.

Кіраўнік дэлегацыі падзякаваў беларускаму боку за падтрымку ў жыццёва важных для Кітая пытаннях, звязаных з дзяржаўным суверэнітэтам, тэрытарыяльнай цэласнасцю і правамі чалавека. А таксама за гуманітарную дапамогу падчас разбуральнага землятрусу ў памеры 1 млн долараў. Гэта, на думку кітайскага палітыка, «у поўнай меры прадэманстравала шчырыя сяброўскія пачуцці паміж нашымі краінамі».

У верхняй палаце парламента кітайскую дэлегацыю сустракаў **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Леанід КРУПЕЦ**.

— Развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва з Кітаем з'яўляецца асноўным прыярытэтам знешняй палітыкі Беларусі, — падкрэсліў віцэ-спікер.

Высокі ўзровень двухбаковага супрацоўніцтва, на яго думку, падкрэслівае тэзіс пра стратэгічны характар нашага партнёрства, кірункі якога разнастайныя, а маштабы — істотныя. Скажам, узаемны тавараварот з 2002 года павялічыўся амаль у 10 разоў. Прыкметныя поспехі і ў галіне адукацыі, аховы здароўя, навукова-тэхнічнага развіцця. Ад імя Савета Рэспублікі віцэ-спікер выказаў гатоўнасць пашыраць міжрэгіянальнае супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў.

— Мы ў Беларусі высока цэнім сяброўскія сувязі з Кітаем і вітаем рост яго міжнароднага аўтарытэту і ўплыву.

Адносіны з гэтай усходняй дзяржавай выклікаюць гонар, паколькі «ашаламляльны поспех, які дэманструе Кітай па ўсіх кірунках, з'яўляецца прыкладам для Беларусі».

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Сярэдняя пенсія ў Беларусі за 9 месяцаў 2010 года на 23,5 % вышэйшая за ўзровень студзеня-верасня 2009 года

**Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў галоўным упраўленні пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацабароны. Сярэдняя пенсія ўсіх відаў складае ў гэтым верасні Br530,3 тыс.**

Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў верасні 2010 года складае Br537,4 тыс., сярэднямесячная працоўная пенсія ў студзені-верасні бягучага года павялічылася на 23,6 працэнта да адпаведнага перыяду мінулага года.

Сярэдняя пенсія па ўзросту ў верасні складае Br555 тыс., мінімальная па ўзросту (з улікам даплаты да яе) — Br296,7 тыс. Сярэдняя пенсія па інваліднасці складае Br484,8 тыс., з прычыны страты карміцеля — Br322,5 тыс., за выслугу гадоў — Br730,1 тыс., за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — Br808,1 тыс.

Сярэдні памер сацыяльнай пенсіі складае ў верасні гэтага года Br205,9 тыс. Сярэднямесячны памер сацыяльнай пенсіі ў студзені-верасні 2010 года ўзрос на 9,6 працэнта ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам. Мінімальны памер пенсіі па ўзросту складае ў верасні Br68 тыс. 628.

## У Брэсце праходзіць XV Международны тэатральны фестываль

Фота БЕЛТА.

Спектакль «Нашэсце іншапланецян» на цэнтральнай вуліцы горада Брэста.

# «ШЭРАГ СМІ РАЗГАРНУЛІ КАМПАНІЮ ПА ДЭЗЫНФАРМАЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА НАКОНТ СМЕРЦІ ЖУРНАЛІСТА А. БЯБЕНІНА»

**НЕКАТОРЫЯ СМІ, асвятляючы смерць журналіста Алега Бябеніна, праводзяць адносна Беларусі кампанію па дэзынфармацыі насельніцтва. Аб гэтым учора заявіў журналістам намеснік генеральнага пракурора Беларусі Андрэй Швед, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Андрэй Швед адзначыў, што ў шэрагу СМІ з'яўляюцца суб'ектыўныя меркаванні, недакладныя звесткі, якія датычацца названага інцыдэнту. Разам з тым намеснік генпракурора падкрэсліў, што пракурорскія работнікі дзейнічаюць у рамках КПК, а таксама іншых законаў і ніякі націск на іх не дапушчальны.

Цяпер следства адпрацоўвае дзве асноўныя версіі: самагубства і забойства з інсцэніроўкай самагубства. Па выніках праведзенай праверкі і іншых мерапрыемстваў пакуль не атрымана ніякіх даных, якія ставілі б пад сумненне першую версію. Аднак другая ўсё роўна не здымаецца і адпрацоўваецца ў поўным аб'ёме.

Як паведаміў Андрэй Швед, ужо ўстаноўлены шэраг бясспрэчных фактаў. У прыватнасці, вядома, што 2 верасня Алег Бябенін па сваёй ініцыятыве ўзяў ключы ад дачнага доміка і паехаў у вёску Пярхурава Дзяржынскага раёна, дзе і размяшчаецца дача. Па дарозе ён набыў спіртное, пасля куплі або ў яе момант ён зрабіў званок асабістага характару, змест якога пракуратура не мае права паведамляць. У далейшым ён адхіляў усе ўваходныя звонкі і размаўляў з дапамогай СМС, змест якіх таксама меў асабісты характар і не можа быць раскрыты грамадскасці па этычных меркаваннях. Пасля гэтага ён увесь час знаходзіўся ў вёсцы Пярхурава. Пакуль няма ніякіх даных аб тым, што да яго смерці маюць дачыненне пабочныя асобы. Слядоў барацьбы не знойдзена, асабістыя рэчы не зніклі. Паводле папярэдніх даных, у момант смерці ён знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення. Прычым спіртное было выпіта за пэўны час да яго смерці.

Між тым шэраг СМІ, як ужо было сказана, распаўсюджваюць недакладныя звесткі. Напрыклад, заяўляецца, што цела знайшоў брат нябожчыка, хоць на самай справе гэта зрабілі знаёмыя яго жонкі. Паведамленне аб тым, што ў загінулага была зламана нага, а на целе знойдзены сінякі — таксама хлусня, адзначыў Андрэй Швед. Ён падкрэсліў, што тым, хто спрабуе паказаць дасведчанасць у акалічнасцях гібелі журналіста праз СМІ, неабходна спыніць кампанію па дэзынфармацыі насельніцтва. Пракуратура пра ўсё паведаміць пасля правядзення праверкі. На думку намесніка генпракурора, не трэба рабіць з трагедыі піяр.

Ён таксама падкрэсліў, што цяпер праводзіцца комплекснае экспертнае даследаванне. Беларусь прыняла беспрэцэдэнтныя меры ў сувязі з расследаваннем гэтага інцыдэнту. Рэспубліка аб'явіла аб тым, што да работы могуць падключыцца эксперты-крыміналісты з краін АБСЕ. Калі неабходна, будзе праведзена эксгумацыя цела. У выпадку, калі хто-небудзь мае дадатковую інфармацыю адносна гібелі Алега Бябеніна, то ён можа звярнуцца ў праваахоўныя органы.

Як паведамлялася, па заключэнні судова-медыцынскага эксперта, на трупе Алега Бябеніна не знойдзена якіх-небудзь цялесных пашкоджанняў, за выключэннем странгуляцыйнай баразны (чырвоны след на шыі ад вяроўкі). Смерць надышла ад механічнай асфіксіі ў выніку сціскання дыхальных шляхоў пятлёй пры павешанні. Існуючыя даныя паказваюць на тое, што Алег Бябенін учыніў самагубства. Разам з тым праваахоўнікі праводзяць праверку, каб устанавіць іншыя акалічнасці здарэння.

Фота БЕЛТА.

## 11 верасня гомельскія дзяўчаты прынялі ўдзел у традыцыйным забегу на абцасах. Перамагла ўдзельніца мінулагодніх спаборніцтваў Кацярына ПАПЛАЎСКАЯ.

## ДВАЙНЫ НАЕЗД

Ля вёскі Шульцава Віцебскага раёна «Нісан», за рулём якога быў грамадзянін Расіі, збіў двух пешаходаў (1978 і 1975 гадоў нараджэння), а потым на іх наехаў «Опель», які ехаў услед за «Нісанам». Пешаходы загінулі. Шанцаў выжыць пасля двайнога наезду было ў іх мала.

## АРСЕНАЛ ЧАСОЎ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ

Пры правядзенні земляных работ каля вёскі Макарава Віцебскага раёна знайшлі тры мінамётныя міны калібру 120 міліметраў, больш за сорак мінамётных мінаў калібру 81 міліметр, 27 артылерыйскіх снарадаў калібру 45 міліметры, чатыры гранаты і каля дваццаці артылерыйскіх узрывальнікаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Выклікалі сапёраў, якія і знішчылі арсенал.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У ФРУНЗЕНСКІМ РАЁНЕ СТАЛІЦЫ БАЦЬКОЎ-АЛКАГОЛІКАЎ ДАЛУЧАЮЦЬ ДА ЦАРКВЫ

**Нетрадыцыйны спосаб барацьбы з п'янствам бацькоў, чыіх дзяцей выхоўвае дзяржава, практыкуюць у Фрунзенскім раёне сталіцы. Учора «абавязаных асобаў», якія падпадаюць пад дзеянне Дэкрэта № 18, сабралі ў праваслаўным храме у гонар Архістраціга Міхаіла, што знаходзіцца ў мікрараёне Сухарава. Зразумела, што большасць гора-бацькоў прыйшлося збіраць участковым інспектарам і прывозіць у прымусовым парадку.**

Сустрэча пачалася з размовы з настаяльнікам прыходу айцом Ігарам. Прычым не толькі пра п'янства, наркаманію, кінутых дзяцей, але і пра тое, што жыццё можна наладзіць — трэба толькі пастарацца. Пасля агульнай лекцыі ўсе ахвотныя атрымалі ад святара асабістыя настаўленні і прайшлі абрад акраплення святой вадой. Самых злосных ухілістаў пасля акцыі міліцыянеры даставілі на працоўныя месцы.

Ініцыятарам акцыі стаў намеснік начальніка Фрунзенскага РУУС, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Дзінас Лінкус. «Хочацца спадзявацца, што мерапрыемства будзе мець належны вынік.

У 2010 годзе ў бацькоўскіх правах у Фрунзенскім раёне адноўлена толькі адна матуля, а з моманту дзеяння Дэкрэта № 18 — 13 чалавек. Спадзяюся, што сустрэча прымусіць хоць кагосьці з бацькоў задумацца, перастаць злоўжываць спіртным, прапускаць працоўныя дні, і адноўленых у бацькоўскіх правах будзе больш», — расказаў Дзінас Лінкус.

Як паведаміла прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС сталіцы Ала Галубовіч, на гэты раз на сустрэчу ўдалося сабраць 22 «абавязаныя асобы», сярод якіх 6 жанчын. Усяго ж пад дзеянне Дэкрэта № 18 у Фрунзенскім раёне падпадае крыху больш за 200 чалавек.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**Утерянные полисы** страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН серии ПТ №№ 0522129, 0522495, 0522524, 0522777, 0522791, 0524690, 0524691, серии БА № 0031335, формы 2РН, 2 РП серии БА № 0001507; по гражданской ответственности владельцев транспортных средств серии АЗ №№ 0282044, 0282393, квитанции 1 СУ серии КС № 0695448; по добровольному страхованию имущества граждан формы 2 РН серии ПУ №№ 0004561, 0004562, 0007804, 0007805 **считать недействительными**.

## Віншуем калегу

## ГРЫБНЫХ ДАЖДЖОЎ, МІХАІЛ ВАСІЛЬЕВІЧ!



Сёння свой юбілей святкуе **Міхаіл Васільевіч МІХАЕВІЧ**, у недалёкім мінулым першы намеснік галоўнага рэдактара «Звязды». Дружна далучаемся да святочных віншаванняў — іх, несумненна, будзе сёння шмат у юбіляра, бо ва ўсе часы ён умеў і ўмее цаніць шчырыя чалавечыя ўзаемаадносіны, бясцэнныя скарбы сапраўднага сяброўства. Ён — адзін з нямногіх, хто ва ўсіх жыццёвых сітуацыях можа скарыстацца кароткай, але дакладнай формулай здатнага кіраўніка і грунтоўнага чалавека: рабі, як я! Высокі прафесіяналізм плюс рэпутацыя сумленнага чалавека — дастаткова для непахіснага аўтарытэту. А яшчэ ўменне заўважыць «божы дар» у маладых аўтараў, падтрымаць, парадаваўца ўдачам... У вострай сітуацыі апынуцца ў эпіцэнтры, узяць адказнасць на сябе... У час адпачынку пасмяяцца ад душы, успомніць безліч павучальных ды проста займальных гісторый... За ўсё гэта помнім і любім. І зычым ніколі не зачахляць нашу галоўную зброю за годнае ўладкаванне жыцця — журналісцкае слова і чалавечую, грамадзянскую пазіцыю. Да ўсяго — цёплых вераснёўскіх дзянькоў, доўгай сонечнай восені. А калі дажджоў — то толькі грыбных.

**Звяздоўцы.**

## Абзац

◢ Два каткі з сінтэтычным лёдам з'явіцца ў Мінску.

◢ **Споўнілася 220 гадоў з дня нараджэння Івана Грыгаровіча, беларускага гісторыка, археографа, краязнаўцы, рэлігійнага дзеяча. Нарадзіўся ў Прапойску (цяпер Слаўгарад). Быў рэктарам Гомельскага, затым Віцебскага духоўных вучылішчаў. Пісаў палітычную і царкоўную гісторыю Беларусі, рыхтаваў да друку першы беларускі архіяграфічны зборнік «Беларускі архіў старажытных грамат». Склаў слоўнік беларускай мовы.**

◢ Чатырнаццаць чалавек загінулі на дарогах Беларусі ў мінулую пятніцу і ў выхадныя.

◢ **Штогод каля мільёна чалавек добраахвотна зводзяць рахункі з жыццём. У сярэднім кожныя 40 секунд адбываецца адно самагубства. Такія звесткі прыводзіць Сусветная арганізацыя аховы здароўя.**

◢ Кожнае трэцяе дзіця ў ЕС нараджаецца па-за шлюбам. У новым даследаванні Еўрастата адзначаецца, што лідзіруе па колькасці дзяцей, народжаных па-за шлюбам, Эстонія. У 2008 г. такіх дзяцей было 59 %. Далей ідуць Швецыя — 54,7 %, Славенія — 52,8 %, Францыя — 52,6 %. Менш за ўсё дзяцей па-за шлюбам нараджаецца ў Грэцыі — 5,9%. Сярэдні паказчык па Еўропе складае 35,1%. У даследаванні адзначаецца, што ва ўсіх краінах ЕС гэты паказчык расце.

◢ **Пінскія памежнікі за мінулыя выхадныя затрымалі ў памежных лясах 19 нелегальных грыбнікоў з Украіны. З пачаткам грыбнога сезона і перыяду збору журавін украінскаму боку перададзена больш за 190 грыбнікоў — парушальнікаў беларускага заканадаўства. Гэтую статыстыку папаўняюць таксама больш за 1 тыс. нелегальных зборшчыкаў чарніц.**

◢ Беспрацоўная жанчына 1956 года нараджэння пазбавілася абедзвюх ног, трапіўшы пад камбайн на кукурузным полі пад Салігорскам. Жанчына збірала кукурузу для асабістых мэтаў на полі СВК «Краснадворцы». Яна не заўважыла камбайн «Палессе-80», які праводзіў уборку гэтай сельгаскультуры. У выніку жанчына трапіла пад жняярку. У Салігорскай цэнтральнай райбальніцы ўрачам давялося ампутаваць пацярпелай абедзве галёнкі. Цяпер жанчына ў стане траўматычнага шоку знаходзіцца ў рэанімацыі. Яе стан ацэньваецца як цяжкі.

◢ **Жыхар Мсціслаўскага раёна загінуў, трапіўшы пад плуг. Пракуратура Мсціслаўскага раёна правядзіць праверку па факце гібелі 29-гадовага жыхара вёскі Шамава. У мінулыя выхадныя малады чалавек дапамагаў аднавяскоўцу разворваць зямельны ўчастак. Кіруючы плугам, у які быў запрэжаны конь, у нейкі момант вясковец упаў. Спалоханая жывёліна панесла. Спрабуючы яе спыніць, мужчына трапіў пад плуг, атрымаў траўму брушной поласці, ад чаго памёр на месцы здарэння.**

## Поўны абзац

◢ У адным з гарадкоў штата Вермонт (ЗША) ёсць завод марозіва Dtn&Jerry's Ice Cream. Гэта мясцовая славутасць. Завод выпускае безліч гатункаў марозіва і кожны год істотна абнаўляе свой асартымент. Тое, што надакучыла людзям, здымаюць з вытворчасці. І дзе, вы думаеце, яно апынаецца? На могілках. На ўзгорку за фабрыкай стаіць больш за 200 пластыкавых надмагілляў. На кожным з іх намалявана марозіва, напісаная эпітафія, яго інгрэдыенты і гады «жыцця», г.зн. выпуску. Тут можна ўшанаваць памяць таго гатунку, які вам падабаўся, напрыклад, у дзяцінстве ці юнацтве. Цікава, што людзі могуць вярнуць «нябожчыка» ў свет жывых. Для гэтага дастаткова прагуляцца па віртуальных могілках на сайце кампаніі і прагаласаваць за любімы «памерлы» смак. Калі ён збярэ дастаткова галасоў, то яго «адродзяць» — зноў пачнуць выпускаць.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# БЕЛАРУСЬ ЗАПРАШАЕ НА ФОРУМ ІНВЕСТАРАЎ

**17 лістапада ў германскім Франкфурце-на-Майне ў рамках Еўрапейскага фінансавага тыдня пройдзе Беларускі інвестыцыйны форум — пра гэта паведаміў намеснік міністра эканомікі Андрэй ТУР.**

Мэта форуму — павысіць інтарэс да нашай краіны з боку патэнцыяльных інвестараў. У прыватнасці, падчас форуму плануецца правесці пасяджэнні на тэмы «Чаму выгадна інвеставаць у эканоміку Беларусі» і «Як інвеставаць у Рэспубліцы Беларусь», расказаць пра інвестыцыйную прыцягальнасць банкаўскай сферы, новыя магчымасці інвеставання ў Мытным саюзе Беларусі, Казахстана і Расіі, а таксама пра найбольш перспектыўныя напрамкі ўкладання сродкаў у нашу эканоміку. Галоўнымі з такіх напрамкаў ужо сёння называюцца праекты, звязаныя з энергетыкай, транспартнай лагістыкай, перапрацоўкай нафты, машынабудаваннем, электронікай.

Дарэчы, паведаміў Андрэй Тур, чакаецца, што ў Беларускім інвестыцыйным форуме возьмуць удзел дзелавыя колы не толькі Германіі і Еўрасаюза, але таксама Лацінскай Амерыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Больш за 60 працэнтаў расіян адчуваюць пачуццё сораму за сваю краіну

**64 працэнты расіян адчуваюць пачуццё сораму за сваю краіну. Аб гэтым сведчаць вынікі апытання, праведзенага сацыёлагамі фонду «Грамадскае меркаванне», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прычым 39 працэнтаў апытаных заявілі, што ім бывае соромна за Расію часта, 25 працэнтаў — часам.

Асноўная прычына (25 працэнтаў), якая выклікае ў жыхароў Расіі гэта пачуццё, — нізкі сацыяльны ўзровень жыцця ў краіне: нізкія зарплаты, сацыяльная неабароненасць, моцнае сацыяльнае расслаенне. 6 працэнтаў расіян саромеюцца няўдач у спорце, 5 працэнтаў занепакоеныя беспрацоўем. Па 4 працэнты апытаных адчуваюць сорам за стан расійскай эканомікі, дрэнную работу ўлады і недастойныя паводзіны палітыкаў.

Па 3 працэнты рэспандэнтаў адзначылі карупцыю, беззаконнасць у краіне, алкагалізм насельніцтва, высокія цэны, а таксама нядаўнія палітычныя падзеі — развал СССР, вайну ў Чачні. Па 2 працэнты расіян саромеюцца становішча Расіі ў свеце, тэрарызму, нізкага ўзроўню адукацыі і аховы здароўя, высокага ўзроўню беспрытульнасці, стану дарог і сітуацыі з ляснымі пажарамі.

Адначасова 31 працэнт расіян часам ганарацца сваёй краінай, яшчэ 29 працэнтаў адчуваюць гэта пачуццё часта. 21 працэнт рэспандэнтаў ганарацца дасягненнямі Расіі ў спорце, 4 працэнты — рускім народам у цэлым, 3 працэнты — расійскай арміяй і 2 працэнты — кіраўніцтвам краіны.

# ТРЫМАЮЦЬ ПАЎЗУ

З 5 верасня адкрыўся сезон збору журавін.
Насельніцтва, як і ў мінулыя гады, адправілася па ягады на балота...

**ТОЛЬКІ ў Ганцавіцкім раёне дазвол на закуп ягад атрымалі 30 суб'ектаў гаспадарання. Праўда, з іх толькі 10 мясцовыя, а астатнія «залётныя».**

У 2009 годзе з журавінамі людзям не вельмі пашанцавала, бо нарыхтоўшчыкі напачатку прымалі ягады па вельмі нізкай цане — 1,8 тысячы рублёў за кілаграм і толькі пад канец сезона за журавіны плацілі па 3,5 тысячы. Але і тыя, хто закупіў журавіны, не ведалі, што з імі рабіць. Напрыклад, у Ганцавіцкім спажыўтаварыстве доўгі час некалькі дзясяткаў тон журавін не былі запатрабаваныя.

Сёлета закупляць балотную ягаду пачалі з 3 тыс. за кг. Менавіта такую цану прапанавала сваім нарыхтоўшчыкам Брэсцкае аблспажыўтаварыства. Такая стартавая цана ўстаноўлена не толькі ў Ганцавіцкім, але і суседніх раёнах. Іншая справа, ці доўга яна пратрымаецца, бо людзі за такія грошы здаваць журавіны не спяшаюцца.

Вось зборшчыкі і трымаюць паўзу ў надзеі на больш высокі кошт. У іх ёсць сур'ёзная перавага — журавіны могуць ляжаць да вясны і не сапсавацца.

Але і нарыхтоўшчыкі не спяшаюцца падымаць цану, хоць зрабіць гэта ім ўсё ж давядзецца.

*— Канкурэнцыя падштурхне прадпрымальнікаў да гэтага, і цана на журавіны будзе расці,* — лічыць **начальнік аддзела нарыхтовак Ганцавіцкага спажыўтаварыства Аляксандр ЕРМАКОВІЧ**.

Былі сезоны, калі кошт кілаграма журавін вырастаў да пяці тысяч. На такую цану людзі спадзяюцца і сёлета. Вось і чакаюць.

Многае залежыць ад запатрабаванасці журавін перапрацоўчымі прадпрыемствамі ці закупам іх на экспарт. Калі сёлета быў попыт на чарніцы, то за іх плацілі па 8 тысяч, і не толькі нарыхтоўшчыкі. Гэтыя ягады добра куплялі і на рынку.

Менавіта попыт стварае перадумовы для росту цаны. І тут у прадпрымальнікаў больш прасторы для манеўра, чым у спажыўкааперацыі. Сёлета, як і раней, цану на ягады фарміруюць камерсанты, а спажыўтаварыствам даводзіцца не адставаць ад канкурэнтаў.



Калі дзікія журавіны збіраюць ужо тыдзень, то на навукова-эксперыментальнай базе «Журавінка» ў Ганцавічах ураджай яшчэ даспявае і збор яго пачнецца напрыканцы верасня.

Тут вырошчваюць журавіны амерыканскіх гатункаў. Супрацоўнікі

Канстанцін СУМАР:

# «ЗНАЧЫЦЬ, ДОБРУЮ СПРАВУ РОБІМ, КАЛІ ПРЫРОДА НАМ СПРЫЯЕ»

## На Брэстчыне адсвяткавалі абласныя «Дажынкі»

Маларыта доўга рыхтавалася да галоўнага свята года, і не толькі года. Сталыя гараджанкі, з якімі давялося перамовіцца, адзначылі, што такіх маштабных праграм добраўпарадкавання гарадоў не перажываў з пасляваенных часоў. Маларыта — 11-тысячны райцэнтр на самым поўдні заходняй часткі вобласці. Горад з 500-гадовай гісторыяй не вызначаўся багатай інфраструктурай. Так склалася гістарычна. Напрыклад, у Маларыце не было гасцініцы. Начаваць прыезджыя мусілі ехаць у Брэст, за 50 кіламетраў. А цяпер яна ёсць: сучасны трохпавярховы гатэль вырас на вуліцы Савецкай. У горадзе з'явіўся таксама фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнамі і тэніснымі кортамі. Змяніліся вуліцы Савецкая, Леніна, Школьная, Паркавая, Паўднёвая, іншыя. Праведзена вялікая работа, якой і не бачна на першы погляд: рэканструяваны сеткі водаправоду, мадэрнізаваны цеплавыя магістралі, пабудавана ліўневая каналізацыя. А ўжо дамы, установы зззяюць свежай фарбай побач з новай агароджай, малымі архітэктурнымі формамі, свежымі клумбамі. Усе месцічы ў адзін голас казалі, што варта праводзіць такія святы, так і атрымалася: здавалася, усе людзі церпяць нязручнасці, каб потым — па прыгожых тратуарах ды на абцасіках. Яны і выйшлі на вуліцы. Колькі кавярняў было разгорнута пад адкрытым небам — і ўсе столікі занятыя. Гуляў горад.

Зранку надакучаў дробны, але настойлівы дождж, а перад самым адкрыццём свята перастаў. Пра што і сказаў губернатар у самым пачатку свайго выступлення: «Значыць, добрую справу робім, калі прырода нам спрыяе». Старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар, перш чым уручыць заслужаныя ўзнагароды перадавікам жніва, агучыў некаторыя вынікі работы хлебаробаў рэгіёна ў гэтым годзе. З кожнага гектара гаспадаркі вобласці атрымалі ў сярэднім па 30,7 цэнтнера збожжа. Сярод раёнаў самы высокі намалот — звыш 100 тысяч тон — дасягнулі ў Пружанскім і Баранавіцкім. Лепшая ўраджайнасць збожжавых у Брэсцкім раёне —35,6 цэнтнера з гектара, у Камянецкім — 35,2 цэнтнера. Сярод гаспадарак рэкорд па ўраджайнасці паставілі СВК «Палеская ніва» Столінскага раёна — 61,3 цэнтнера з гектара і ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» — 61 цэнтнер.

Сёлета 112 экіпажаў камбайнераў намалацілі больш за тысячу тон збожжа, два экіпажы — больш за дзве тысячы тон. Пераможцамі абласнога спаборніцтва на ўборцы збожжавых і зернебабовых культур у 2010 годзе сярод старшых камбайнераў і камбайнераў сталі Сяргей Мікульчык (СВК «Крошын» Баранавіцкага раёна), Анатоль Філіновіч (СВК «Агра-Моталь» Іванаўскага раёна), Аляксандр Кіндрук і Сяргей Ільючык (СВК «Дварэцкі» Лунінецкага раёна). Сярод вадзіцеляў на адвозцы збожжа лепшымі названы Леанід Каштэлян (філіял «Прамень» ААТ «Бярозаўскі сыраробчы камбінат» Бярозаўскага раёна), Васіль Плескацэвіч (ААТ «Ляхавіцкі райаграсэрвіс»), Іван Голуб (СВК «Квасевічы» Іванцэвіцкага раёна). Сярод раёнаў пераможцам абласнога спаборніцтва на ўборцы прызнаны Пінскі, а сярод гаспадарак — СВК «Святая воля» Іванцэвіцкага раёна, ААТ «Баранавіцкая птушкафабрыка» Баранавіцкага раёна і СВК «Дарава» Ляхавіцкага раёна.

Узнагароджвалі, акрамя названых катэгорый, і маладыя, а таксама сямейныя экіпажы камбайнераў, маладых вадзіцеляў, машыністаў збожжаачышчальна-сушыльных комплексаў. Людзей з чырвонымі стужачкамі перадавікоў налічвалася ў гэты дзень каля 90 чалавек. Першым, каго давялося сустрэць са стужачкай, аказаўся старшыня СВК «Палеская ніва» Мікалай Ажог. Яго гаспадарка сёлета паставіла абсалютны рэкорд ураджайнасці збожжавых — больш за 60 цэнтнераў намалацілі з кожнага гектара. Пытаюся: «Як удалося атрымаць ураджай удвая большы за іншых, ці іх гаспадарку не зачапілі маразы зімой, летам спёка невыносная, ліўні абышлі?»

— Не, — адказвае Мікалай Іванавіч, — усё ў нас было: і маразы, і спёка, і ліўні. Проста... мы так працуем, а сёлета ва ўраджайнасці прыбавілі на 12 цэнтнераў да леташняга. Мы вырошчваем элітнае насенне збожжа, элітную бульбу, развіваем эксперыментальную жывёлагадоўлю, гадуем элітных коней, такіх жа цялушак. У нас і працаўнікі — эліта. Прыязджайце, пабачыце на свае вочы.

Запрашэнне нельга не прыняць на будучае. А старшыня СВК «Дарава» Ляхавіцкага раёна, таксама чалавек з ганаровай стужкай, сказаў аўтару гэтых радкоў, што яны працавалі ў гэтым годзе, як заўсёды, ні на якія лаўры пераможцаў не разлічвалі. А калі трапілі ў ганаровыя спісы, то гэта прыемна.

У святочным натоўпе быў заўважаны і генеральны дырэктар ААТ «Будаўнічы трэст № 8» Брэста Міхаіл Водчыц. У некаторым сэнсе ён таксама герой дня. Бо менавіта будаўнікі названага трэста добраўпарадкавалі горад да свята. Міхаіл Васільевіч сказаў аўтару гэтых радкоў, што такія аб'екты здаваць асабліва прыемна, як прыемна павіншаваць хлебаробаў — людзей, якія забяспечваюць харчовую бяспеку краіны.

Міхаіл Пацукевіч, камбайнер СВК «Фядорскі» Столінскага раёна распавёў, якой нялёгкай была ўборка, што прывычна для чалавека яго прафесіі, але зазначыў, што на свяце хочацца адпачыць. І апошняе, думаю, удалося, бо брэсцкія артысты пастараліся. Канцэртная праграма была проста цудоўнай. Песні, танцы, выступленне тэатра з вулічным спектаклем «Мара пра Дон Кіхота» збіралі многа гледачоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# БАБІНА ЛЕТА

## На Століншчыне цвітуць каштаны

Мы ўжо звыкліся з тым, што восенню маладыя яблынькі не-не — ды і ўпрыгожацца некалькімі кветачкамі. Але гэтая восень ураўвае новай квеценню! Спачатку ў вёсцы Рубель Столінскага раёна зацвіла чаромха, а потым пачалі цвісці каштаны. Белыя свечкі гэтых дрэў спыняюць зачараваных людзей, якія бачаць такі цуд упершыню ў жыцці.

Дзіва — у верасні на каштанах поруч з іх калючымі мячыкамі з'явіліся кветкі — далікатныя, кволенькія, але такія прыгожыя!

Гэты дзівосны малюнак прыроды я назірала ў першы дзень бабінага лета. Разам са мною кветкамі-свечкамі любаваліся і маленькія павучкі, што накіроўваліся ў сваё падарожжа на павуцінках-карабліках.

**На здымку:** цвітуць каштаны каля вёскі Радчыцк у Столінскім раёне.

**Таццяна СЕГЕН.**
**Фота аўтара.**

# АДЗІН ДЗЕНЬ НА «МІНСКІМ ПАДВОРКУ»

## Акурат як кожная сям'я адзначае кожнае свята па-свойму, так і кожны куточак Мінска святкаваў Дзень горада па-рознаму

Святочныя мерапрыемствы адбываліся на 60 пляцоўках па ўсім Мінску. Але самым незвычайным стаў, відаць, «Мінскі падворак», што на вуліцы Рэвалюцыйнай. У маленькім, ізаляваным, утульным дворыку ў цэнтры старога горада можна было пабачыць сапраўдныя дзівосы! «Мінскі падворак», дарэчы, адкрыўся для падобных мерапрыемстваў толькі сёлета, і Дзень горада — другая значная падзея ў яго старадаўніх сценах. «Тых, хто задумаў гэты падворак, відаць, мы не знойдзем. Таму што гэта і людзі, якія будавалі стары Мінск, і сённяшнія будаўнікі, якія яго рэканструявалі, — гаворыць Аляксандр Вавілаў, галоўны рэжысёр пляцоўкі «Мінскі падворак» — Тут, пры Музеі гісторыі Мінска, утварыўся глухі дворык, які сам па сабе напрошваецца на нейкую музычную або вершаваную ідэю. Калі мы думалі, чым насыціць канцэртную праграму ў «Мінскім падворку», то вырашылі, што гэта павінен быць абсалютна жывы гук. Так, як некалі было ў Мінску. Наогул, мінская музычная культура мае сваю музычную гісторыю, якую сёння мала хто ведае».Таму на Дзень горада ў «Мінскім падворку» вырашылі наладзіць праграму, дзе акцёры тэатра і кіно чытаюць вершы; дзе можна было б паглядзець, як танчыць гарадскую мінскую польку, вальс і танга; паслухаць нашы цымбалы і баян і нават паглядзець цыганскае шоу ў выкананні ансамбля «Алюр».

Але гэта былі яшчэ не ўсе дзівосы. На ўваходзе ў «Мінскі падворак» гараджанаў сустракалі... гусары. Так-так, самыя сапраўдныя беларускія гусары з ГА «Ваенна-гістарычнага клуба «Бярэзіна 1812», які знаходзіцца ў Барысаве. На пытанне «А ці самі вы шыеце касцюмы?» мне годна адказалі: «Так, самі». «Толькі мундзіры не шыюць, а строяць», — патлумачылі гусары. А я ўсё паверыць не магла сваім вачам: як такое можа пашыць чалавек! Але здзівілася яшчэ больш, калі даведалася, што нашы гусары яшчэ і ў ваенных дзеяннях удзельнічаюць — толькі не ў сапраўдных, а ў імітаваных. «Мы займаемся рэканструкцыяй бітваў не толькі на тэрыторыі Беларусі, але на ўсёй тэрыторыі, дзе некалі былі войны Напалеона: Польшча, Літва, Расія, Чэхія, — распавядае начальнік штаба Беларускага гусарскага палка. — У нас, як і ў тагачасным гусарскім палку, ёсць пешыя і конныя палкі. І служыць гусарам сёння не менш складана і дорага, чым тады». Больш за ўсё пашчасціла, вядома, вясельным парам, якія ў гэты дзень выехалі ў горад на фотасесію і напаткалі гусараў: у фотаальбоме маладзёнаў цяпер назаўжды незабыўныя фотаздымкі.

Вось каго яшчэ нельга было абмінуць, дык гэта чароўных сабак, якіх таксама прывялі на свята ў «Мінскі падворак» члены ГА «Руская выжла». Грэйхаўнды, рускія псовыя выжлы і беларускі ганчак — ад гэтых дагледжаных дружалюбных істотак немагчыма было адарваць рук: іх хацелася гладзіць і гладзіць. Сапраўдным адкрыццём, праўда, стала апошняя парода, якая аказалася нядаўна зарэгістраванай адзінай беларускай нацыянальнай паляўнічай пародай. «З даўняга часу, — распавядае Уладзімір Лазарэнка, кінолаг, старшыня Рэспубліканскай камісіі па вывядзенні пароды «беларускі ганчак», — нашы паляўнічыя палявалі з гэтым сабакам. Нават у Гусоўскага ў «Песні пра зубра» «шчэкаюць ганчакі»! Але парода была згубілася, і толькі нядаўна, калі ездзілі па вёсках з адмысловай мэтай яе адшукаць, нам пашчасціла. Яшчэ б крыху — і парода вымерла б. Але цяпер беларускі ганчак у бяспецы. Больш за ўсё, дарэчы, іх у Гродзенскай вобласці». Пакуль ветлівы гаспадар у касцюме паляўнічага-кінолага размаўляў са мной, беларускі ганчак, якога, як аказалася, клічуць Рагнеда, лезучы абдымацца, выпацкаў мне ўсе джынсы, а яшчэ злавіў і з'еў пчалу.

Цікавым наватарствам у Дзень горада сталі гарадавыя, пераапранутыя ва аўтэнтычныя касцюмы пачатку XIX стагоддзя. Цяпер іх чатыры пасты (прыгожыя карычневыя міні-домікі) будуць «ахоўваць» увесь Верхні горад. А па святах гарадавыя будуць пераапранацца ў святочнае і адмыслова вітаць асабліва важных гасцей. Афіцыйная пасада гарадавых называецца «кантралёр стаянкі трэцяга разраду», і ў іх абавязкі ўваходзіць кантраляваць уезд машын. Але гэта простая функцыя пераўтвараецца ў нейкі чароўны абрад, як толькі гарадавыя пераапранаюцца ў гістарычныя касцюмы. «Гэты эксперымент, — расказваюць гарадавыя Ігар Васільевіч і Васіль Іванавіч, — цягнецца ўжо два месяцы. І Дзень горада — гэта першы наш дзень у касцюмах».

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

**Факт**

### ЛЯСНІК-ЗЛОДЗЕЙ

Начальнік аддзела аховы Нацпарка «Белавежская пушча» заявіў у Пружанскі РАУС, што нехта з 22-га квартала, каля вёскі Пяскі, украў 15 куб.м драўніны коштам 3,5 млн рублёў.

Злодзея пачалі шукаць і выйшлі на лесніка з гэтай жа вёскі.

Драўніну забралі, а што рабіць з лесніком, яшчэ не вырашылі.

### РАЗГЕРМЕТЫЗАВАЛАСЯ ЁМІСТАСЦЬ

На двары жыхара в. Альгомель (Столінскі раён) разгерметызавалася самаробная ёмістасць, якая знаходзілася пад ціскам. У выніку быў цяжка траўмаваны вартаўнік мясцовага СВК. 39-гадовага мужчыну даставілі ў бальніцу Давыд-Гарадка, дзе ён праз суткі памёр.

### І Ў ЛЕСЕ НЯМА СПАКОЮ

Жыхар в. Рэчыца (Столінскі раён) паехаў у грыбы на аўтамашыне «Фальксваген-Пасат» і пакінуў яе ў лесе каля в. Верхні Церабежаў.

Калі гаспадар вярнуўся да аўтамабіля, то ўбачыў, што лабавая шыба выбітая, а з салона зніклі сумачка, мабільнік, аптэчка ды вядро з грыбамі.

Злодзея шукаюць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### САБАКА ЗНАЙШОЎ ЗЛОДЗЕЯ

У Віцебску міліцэйскі сабака з дэпартамента «Ахова» знайшоў па слядах злодзея, які ўвечары скраў прадукты з гандлёвай залы прыватнай крамы.

Як высветлілася, у краме па вуліцы Праўды раней судзімы за крадзеж і хуліганства 18-гадовы беспрацоўны з халадзільніка скраў прадукты харчавання. Гандлярка выклікала міліцыю. Усяго праз пяць хвілін злодзея затрымалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДАЖЫЦЬ БЫ ВЕК СПАКОЙНА ДЫ ПРЫ ПАМЯЦІ

**На тэрыторыі Брэстчыны ёсць 10 дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў. Але з іх толькі два з'яўляюцца інтэрнатамі агульнага тыпу, а астатнія псіханеўралагічныя. Ці не зашмат?**

На старасці нешта планаваць на будучыню — марна, бо будучыні няма. Хоць і ў восемдзесят гадоў чалавек на нешта спадзяецца і марыць. Але гэта калі ў яго з галавой усё нармальна. Колькі даводзілася бачыць нямоглых, якім цяжка бывае перайсці пакой, а яны цікавяцца жыццём. Чалавек хварэе, але яму цікава, што адбываецца ў свеце, ён глядзіць тэлевізар, чытае газету... З такім старым лягчэй і родным. А што рабіць, калі бацька ці маці страцілі розум?

Часта бывае, што чалавек на нагах, а яго дома не пакінеш, бо можа нарабіць бяды. Не выпусціш і на вуліцу — пойдзе і не вернецца. Нават за цікім патрэбен пастаянны нагляд, але ж бываюць і неспакойныя. У такіх выпадках застаецца толькі адно: уладкаваць хворага ў спецыялізаваную ўстанову ці адправіць у псіханеўралагічны дом-інтэрнат.

Апошнім часам удалося скараціць чаргу на пасяленне ў псіханеўралагічныя інтэрнаты. Калі ў 2007 годзе ў вобласці чаргі чакала 350 чалавек, то ў гэтым — толькі 25. Такія зрухі выкліканыя тым, што ў Целяханах (Іванцэвіцкі раён) адкрылі дом-інтэрнат на 180 месцаў, а ў Кобрыне пансіянат ветэранаў вайны і працы ператварылі ў аддзяленне для псіханеўралагічных хворых.

Рэканструкцыі праводзяцца і ў іншых дамах-інтэрнатах. Напрыклад, за кошт сродкаў Сусветнага Банка рэканструкцыі і развіцця выкананы работы па цеплавой рэабілітацыі ў Жабчыцкім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце. Там замянілі аконныя блокі на шклопакеты. А ў Косаўскім доме-інтэрнаце павінны былую сталовую перабудаваць пад жылы корпус.

**— У нас рэканструкцыя яшчэ не пачыналася, яна запланавана на 2011-2015 гады,** — сказаў намеснік дырэктара Валерый Пытляк.

— Колькі чалавек пражывае ў Косаўскім доме-інтэрнаце?

**— На сёння 270 чалавек, у пераважнай большасці яны хворыя.**

— Гэта людзі адзінокія?

**— Не зусім так. Прыкладна палова з іх маюць дзяцей ці родных. Але калі дактары зрабілі заключэнне, то хворага адпраўляюць да нас. Тут кругласутачны нагляд, ёсць кабінеты фізіятэрапіі, пакой псіхаэмацыянальнай разгрузкі... Хворыя не пакінутыя.**

— Валерый Аляксандравіч, але ж інтэрнат застаецца інтэрнатам. Колькі на чалавека прыпадае жыллёвай плошчы?

**— Ніхто не сцвярджае, што ў доме-інтэрнаце створаны ўсе ўмовы, але ж гэтыя людзі не пакінутыя. У нас ёсць і ляжачыя, а іх неабходна накарміць, абмыць, змяніць пасцель... Будзем шчырымі, а ці ва ўсіх сем'ях яны мелі б такі догляд? Далёка не ва ўсіх. А што датычыцца жылой плошчы, то на аднаго чалавека прыпадае 7 кв. м, гэта адпавядае санітарным нормам.**

— Клопату ў абслуговага персаналу шмат?

**— Улічваючы, які кантынгент, то хапае. Дарэчы, у нас знаходзяцца і тыя, хто ў іншых дамах-інтэрнатах парушаў рэжым, хто выйшаў з турмы і на старасці нікому не патрэбен.**

— Клопату ў абслуговага персаналу шмат?

**— Улічваючы, які кантынгент, то хапае. Дарэчы, у нас знаходзяцца і тыя, хто ў іншых дамах-інтэрнатах парушаў рэжым, хто выйшаў з турмы і на старасці нікому не патрэбен.**

— Апошнім імкнуцца ўсталяваць свае парадкі?

**— Калі чалавек 7 разоў пабываў у турме, то чаго ад яго можна чакаць? Для такіх у нас асобная тэрыторыя, міліцэйскі пост... Трымаем сітуацыю пад кантролем.**

Усе разумеюць, што дажываць свой век у інтэрнаце ніхто не хоча, але што рабіць.

Знаёмая пашкадавала сваю маці і забрала дамоў з псіханеўралагічнага дома-інтэрната, але не вытрымала і праз месяц назад адвезла. Хворая, яшчэ фізічна моцная, магла наладзіць у кватэры вэрхал — нельга было без нагляду пакінуць на хвіліну.

Магчыма, няма іншага выйсця, як адправіць хворага чалавека ў дом-інтэрнат. Але не трэба яго забываць, бо нават у такім стане яму радасна атрымаць гасцінец, убачыць родных.

На старасці многія баяцца: «Усё што хочаце, але каб быць пры памяці». Кожны чалавек хацеў бы адысці ў нябыт ціха, у прысутнасці родных... Толькі ў жыцці не заўсёды так атрымліваецца. У яго свой расклад.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# АД ДОЙКІ ДА ДОЙКІ

**На адзін працоўны вясковы дзень я прымерала на сябе пасаду калгаснага пастуха ў СПК «Майскае-Агра», што ў Крупскім раёне. Можна было б, вядома, і ў даяркі паспрабаваць пайсці, але з маім манікюрам наўрад ці мне ўдалося б дасягнуць высокіх надояў. А тут яшчэ і старэйшага пастуха Уладзіміра ў дапамогу далі, чалавека вопытнага і даволі цікавага. Ды і працаваць трэба было на прыродзе, што пасля душнага гарадскога жыцця, пагадзіцеся, — даволі значны аргумент. Шчыра кажучы, старшыня калгаса не надта ўзрадаваўся майму візіту. Ды яно і зразумела: навошта яму лішнія клопаты? Спраў заўсёды ў гаспадарцы хапае, асабліва зараз. Уборачная кампанія амаль што завяршылася, але гэта не значыць, што працы стала менеў. Зараз у гаспадарцы займаюцца сяўбой азімых, копкай бульбы, нарыхтоўкай кармоў на зіму. Мне пашанцавала, што пастух трапіўся з пачуццём гумару і адобрыў такую задумку. Праўда, трохі сумняваўся наконт таго, ці ўвесь дзень я вытрымаю на полі. Такім чынам, бліжэй да справы.**

### СОНЕЙКА ЯШЧЭ НЕ ПРАЧНУЛАСЯ...

**...А мы ўжо на працоўным месцы.** Выганяць кароў у поле прынята рана. А летам дык іх наогул не заганяюць у хлявы — яны так і застаюцца начаваць у полі разам з пастухамі. Правамернае пытанне: а як жа ж бяспека?! Ці не разбрыдуцца кароўкі па ўсім полі ў змроку? Для гэтага прадугледжаны спецыяльны **электра-«пастушок»**, які ўяўляе сабой дрот пад напружаннем. Увесь статак абносіцца такой вось агароджай з магутнасцю ў **12 вольт**. Такім чынам, статак не разбрыдаецца, а знаходзіцца ў зоне бачнасці для пастухоў. Гэта велічыня току бяспечная для чалавека, ён амаль што не адчувае магутнасці ўдару. Толькі троху пальцы паказытае. А вось каровам дастаткова, каб спужацца гэтай своеасаблівай агароджы і не лезці больш на яе. Як мне паведаміў Уладзімір, які працуе пастухом ужо каля трох гадоў, гэтыя жывёлы вельмі адчувальныя да электрычных разрадаў. Вось чаму раяць падчас навальніцы адыходзіць далёка ад статка. Бо калі маланка трапіць у карову, то можа перакінуцца і на чалавека. Здараліся нават і смяротныя выпадкі з-за неасцярожнасці пастуха. Праўда, і каровы зараз нейкія разумныя трапляюцца: навучыліся пралазіць і пад такім, небяспечным для іх, дротам. Пастух сваімі вачамі аднойчы бачыў, як жывёліна прапаўзала, як сабака, пад агароджай. У выніку яна пасвілася ў полі асобна ад статка. Ёсць яшчэ адна асаблівасць: ноччу каровы не пасвяцца, а стаяць, збіўшыся ў кучу: зрок у іх слабы, і ў змроку перамяшчацца складана. Таму яны і стаяць, жуюць «жвачку» і чакаюць раніцы. Карова ж адразу траву не пражоўвае, а глытае цалкам. А ўжо пасля, калі спакойна прыляжа, пачынае пераціраць усё тое, што паспела з'есці. Вось менавіта гэта і называецца «жвачкай». А яшчэ, як расказаў мне Уладзімір, спіць гэта жывёліна з расплюшчанымі вачыма. Я ж думала, што каровы наогул не спяць...

З самай раніцы статак спакойна разбрыдаецца на пэўнай тэрыторыі. За гэты час (гадзіны дзве) пастухі могуць сабе дазволіць адпачыць. У полі прыстасавана спецыяльная будка, у якой даволі цёпла і ўтульна. Я вельмі здзівілася гэтаму, паколькі з першага погляду гэта збудаванне выглядае вельмі халодным. А знешнім сваім выглядам нагадвае шпакоўню — гэта некалькі дошак, збітых у выглядзе трохкутніка. Здавалася б, як там могуць змяшчацца два-тры чалавекі?! Аказваецца, спакойна. Яшчэ і прылегчы можна.

— А як добра ў нашай будцы, калі ідзе дождж! — кажа Уладзімір. — Звонку палівае, а ў нас тут суха і зацішна. Можна і кніжку пачытаць, і ў карты пагуляць, каб асабліва не сумаваць. Так час хутчэй прабягае.

Пасля гэты будынак перацягваецца на новае месца, куды пераходзіць і статак: каровы паспяваюць ужо добра наесціся гадзін да дзесяці-адзінаццаці.

### ДОЙКА — РЭЧ НЕ ТОЛЬКІ ВАЖНАЯ, АЛЕ І НЕАБХОДНАЯ

**Першы раз даяркі ў статак на дойку прыязджаюць дзесьці каля сямі раніцы.** Чым раней, тым лепей. Другі раз — пад полудзень. Апошні — увечары. Цяпер, вядома, рукамі кароў у калгасах не дояць. Існуюць спецыяльныя машыны, якія называюцца «дойкамі». Яны стаяць у полі, а працуюць ад трактара. Кожная даярка ведае сваіх кароў. Таму ўмела і хутка заганяе кожную на сваё месца ў дойцы. І слухаюцца ж яны іх! Мне таксама далі паспрабаваць загнаць на месца дзве-тры кароўкі. Але я не такая спрытная, як даяркі, якім дастаткова было толькі крыкнуць — і ўсе жывёлы сталі па сваіх месцах.

Пакуль ідзе дойка, у пастухоў ёсць час адпачыць і перакусіць. У калгасе прадугледжаны падвоз гарачай ежы працаўнікам прама ў поле. А на свежым паветры ежа падаецца яшчэ смачнейшай. Падчас спякоты, якая стаяла ўсё лета, быў арганізаваны падвоз халоднай вады. І кароў трэба ж папаіць, і пастухам ахаладзіцца. На працягу дня бочка з вадою не адзін раз на дзень дастаўляецца да месца.

— Гэтым летам было асабліва складана, — расказвае Уладзімір. — Такая спякота стаяла, што ўжо часам і не ведалі, куды хавацца. І нам цяжка, і жывёле таксама. Каровы, дык тыя каля вады ўсё круціліся. Не паспявалі падвозіць. А нас толькі наша будка і ратавала.

Дойка скончылася. Даяркі сабралі малако і паехалі на ферму, там яно будзе праходзіць далейшую апрацоўку, рыхтавацца да адпраўкі на завод. А наш статак заварушыўся. Каровы зноў пацягнуліся да травы. Цікава, што язык у іх вельмі ўчэпісты. Адна тарганула мяне за рукаў (мабыць, той смачна пах) і пачала шкумутаць. Амаль што з'ела палову. Вось так я даведалася, што язык у каровы на самой справе шурпаты. Уладзімір расказаў мне, што аднойчы яго малодшая дачка пакінула без увагі свае калготкі, а пасля знайшла ад іх толькі шматкі. Аказваецца, іх з'ела карова.

### ДА ВЕЧАРА ТРЭБА ПАДРЫХТАВАЦЦА

Вось так цэлы дзень пастухі разам са статкам вандруюць па полі. Трэба і месца лепшае выбраць, каб надоі былі вышэйшыя, і не праспаць той момант, калі неабходна перанесці «пастушок», і сачыць, каб са статкам усё было добра. Працоўны графік не сказаць, што даволі зручны: звычайна суткі праз суткі, ды і заробак не адрозніваецца бязмежнымі сумамі. Вядома, пад вечар адчуваецца стома. І гэта я праверыла на сабе. Вельмі баляць ногі, бо цэлы дзень трэба рухацца ўслед за статкам, які часам даводзіцца і далёка пераганяць з аднаго поля на другое. У такія моманты галоўнае — не збыцаць калгасных кароў са свойскімі, якія пасвяцца зусім недалёка. Лепш іх наогул блізка не падпускаць, бо можна і не ўтрымаць статкавы інстынкт. У летнія месяцы, калі надоі высокія, пастух зарабляе па мільёну рублёў, а то і больш — усё залежыць, паўтаруся, ад таго, колькі даяркі надояць малака ад сваіх гадаванак. Восенню — крыху менш атрымліваецца — тысяч семсот, зімой кароў, вядома, не пасвяць, але знаходзіцца іншая работа — корм падвесці, парадак на ферме падтрымліваць трэба... Зімовая зарплата адпаведная: у лепшым выпадку — паўмільёна. Але скардзіцца няма чаго. У вёсцы людзі жывуць не толькі на зарплату: на агародзе нешта вырасце, ды і ў хляве жывёла водзіцца...

Вось такая працоўная вясковая змена ў мяне атрымалася. Я вытрымала, нягледзячы на ўсе асцярогі Уладзіміра...

**Паўнавартасны дзень з вясковага жыцця пражыла Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

# Паліклініка з дэгустацыяй

## У БРЭСЦЕ СТАРТАВАЎ ЧАРГОВЫ КІРМАШ ЗДАРОЎЯ

**Смачныя сокі з Баранавічаў.**

**Шостая міжнародная выстава-кірмаш «Садзейнічанне здаровому ладу жыцця» распачала работу ў самым вялікім спарткомплексе абласнога цэнтра «Віктарыя». Тут размясціліся больш за 130 прадпрыемстваў, якія прапануюць прадукты для здаровага харчавання, вітаміны і мінералы, чыстую ваду, парфуму, лекавыя сродкі расліннага паходжання, адзенне, тавары для спорту, турызму і шмат іншага. На кірмашы працуе шмат спецыялістаў, дыягностыкаў і кансультантаў.**

З самай раніцы, за дзве гадзіны да афіцыйнага адкрыцця выставы выстраіліся чэргі да століка ў надпісамі «Ультрагукавое даследаванне шчытападобнай залозы», «Вымярэнне ціску», «Вызначэнне глюкозы ў крыві». Утрыманне халестэрыну ў крыві вызначала фельчар-лабарант цэнтральнай паліклінікі горада Святлана Асьмушнікава. Многія адыходзілі ад століка ні з чым, бо Святлана Юр'еўна пыталася ў кожнага, што ён ёй. Паводле правілаў, гэты аналіз можна праводзіць толькі, калі кроў здаеш нашча. Інакш вынік можа быць зусім няправільны. І разам з тым фельчар Асьмушнікава тлумачыла наведвальнікам, як важна кантраляваць узровень глюкозы, каб папярэдзіць такія каварныя хваробы, як цукровы дыябет, паражэнне падстраўнікавай залозы.

Цікава, што на камп'ютарную дыягностыку чарга стаяла ў тры рады, пакрышху падыходзілі людзі да гінеколага, анколага, валеолага, а доктар з шыльдачкай «псіхатэрапеўт» сядзеў у адзіноце. І гэты факт сам па сабе вельмі паказальны: ну баяцца нашы людзі ўрачоў такіх спецыяльнасцяў, хоць многім і многім яны патрэбныя. Пытаюся ва Уладзіміра Бут-Гусаіма, урача Брэсцкага псіханеўралагічнага дыспансэра, ці першы я ў яго суразмоўца. Аказалася, другі. Была толькі адна жанчына (прайшло крыху больш за гадзіну прыёму — **С. Я.**). І дарэмна. Доктар Бут-Гусаім яшчэ раз нагадаў, што стрэсы, неўрозы — гэта прыкметы сучаснага стану цывілізацыі, і толькі адзінкі могуць спраўляцца з названымі праблемамі самастойна. Усё-такі варта ісці да ўрача, як толькі адчуеш трывогу, павышаную стамляльнаць, заўважыш расстройства сну. Такі стан рэчаў, які склаўся зараз у нашай краіне, Уладзімір Уладзіміравіч лічыць спадчынай савецкага мінулага, калі службы псіхатэрапеўтаў наогул не было. Гэта служба ў нашай краіне, па сутнасці, толькі фарміруецца. А сёння ў кожнай бальніцы патрэбны кваліфікаваны псіхатэрапеўт для дапамогі людзям, напрыклад, для прафілактыкі тых жа суіцыдаў. Можа таму так марудна ідзе развіццё патрэбнай грамадству службы, што само грамадства не гатовае яе прыняць. Пацвярджэнне таму на кожным кроку: развітваюся з доктарам і прашу першую жанчыну, што трапляецца на вочы, сесці на маё месца: няёмка ж фатаграфаваць доктара ў адзіноце. Яна садзіцца, чытае таблічку і... пачынае казаць пра свае праблемы. Аб чым і гаварылася раней!

На кірмашы працуе шмат валанцёраў, якія агітуюць за здаровы лад жыцця — супраць курэння, п'янства, наркотыкаў. Звярнае на сябе ўвагу стэнд грамадскай арганізацыі «Маці супраць наркотыкаў». Разгаварыліся са старшынёй Таццянай Мішковіч. Арганізацыя працуе ў Брэсце сем гадоў. І ўжо многім людзям дапамагла вярнуцца да нармальнага жыцця. Жанчынам у іх добрых справах спрыяюць царква, спонсары, людзі, якія самі пабывалі ў бядзе і змаглі выкараскацца. Таццяна Іванаўна расказала адносна нядаўнюю гісторыю трох братоў, якія жылі... на беразе Мухаўца. Так, хлопцы былі бамжамі. Але нехта падказаў ім прыйсці ў офіс арганізацыі на вуліцы Савецкай. Потым яны прайшлі рэабілітацыю. Зараз усе трое маюць работу, жыллё, двое ажаніліся, адзін купіў машыну, — словам, жывуць як нармальныя людзі.

Да століка грамадскай арганізацыі не сказаць, каб многа, але падыходзілі наведвальнікі, якім Таццяна Іванаўна і яе калегі пакідалі кантактныя тэлефоны.

Пакуль ішлі кансультацыі ў адным канцы будынка і дэгустацыі — у другім, пад'ехалі госці, артысты і пачалося афіцыйнае адкрыццё выставы-кірмашу. Трэці год запар мерапрыемства адкрывае старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар, падкрэсліваючы тым самым актуальнасць кампаніі за здаровы лад жыцця. Арганізатары падрыхтавалі цікавую культурна-забаўляльную і навукова-пазнавальную праграмы.

Летась на такой жа выставе ўрачэбныя кансультацыі атрымалі больш за 2800 чалавек, дыягнастычныя даследаванні прайшлі звыш 2200 наведвальнікаў, а выставу наведалі каля 15 000 жыхароў Брэста і вобласці. Сёлета за тры кірмашовыя дні чакаецца не менш.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Сувязь

# РАБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ РАЗАМ

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» на базе дзіцячага рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра «Надзея» (Вілейскі раён) правяло рабочую нараду з начальнікамі раённых вузлоў паштовай сувязі па абмеркаванні задач, якія стаяць перад прадпрыемствам на фінішы 2010 г., і шляхоў яго развіцця ў бліжэйшай пяцігодцы, у тым ліку сістэмы лагістыкі, маркетынгавай і рэкламнай дзейнасці аб'ектаў, укаранення новых сістэм аўтаматызацыі паслуг на базе інфармацыйных тэхналогій і інш.**

У абмеркаванні азначанай тэмы прымалі ўдзел генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Ю.А. Комар, намеснікі генеральнага дырэктара І.І. Саксонава, С.А. Патапенка, М.Г. Новікаў, старшыня аб'яднанага камітэта прафсаюза А.Я. Дробава, дырэктары і намеснікі дырэктараў абласных філіялаў... Яны ў сваіх выступленнях падзяліліся досведам і напрацоўкамі, начальнікі раённых вузлоў паштовай сувязі абазначылі праблемныя пытанні, якія неабходна вырашаць сумесна.

Хацелася б адзначыць, што ўпершыню такі пашыраны семінар праводзіўся ў 1996 годзе. І стаў за правіла. Як і імкненне рабіць сваю справу разам.

**Ул. інф.**

Ёсць нагода!

# «ХУДЫ, У АКУЛЯРАХ, З СІНЯКАМІ ПАД ВАЧЫМА...»

Учора быў 256-ы дзень у годзе. Можа, гэта вам ні пра што і не скажа, а вось праграмісты адзначалі 13 верасня сваё прафесійнае свята. Менавіта 256 лічбаў можна закадзіраваць з дапамогай аднаго байта. Сёння стварэннем праграм для Парка высокіх тэхналогій у нашай краіне займаецца каля 10 тысяч чалавек. Відавочна, ёсць каму адзначаць. Пра гэтую прафесію ўжо склалася пэўнае ўражанне. Мы паспрабавалі высветліць, як уяўляюць сабе тыповага праграміста жыхары Мінска.

**Раман Дзьячук, студэнт гістфака БДУ:**

— Адразу ўзнікае асацыяцыя з маладым хлопцам, які носіць акуляры, пастаянна слухае плэер і цягае з сабой торбу з ноўтбукам. Стасункі мае ў асноўным з моладдзю, бо сам часцей за ўсё да яе належыць.

**Ала Мікалаеўна, супрацоўнік мінскага метрапалітэна:**

— Разумны, шмат часу праводзіць за камп'ютарам. Гэта, па-мойму, вельмі важная прафесія, але мой сын не праграміст, таму больш нічога сказаць не магу.

**Ягор Яроўскі, студэнт МДМК:**

— Гэта чалавек з сінякамі пад вачыма ад напружанага ўглядання ў манітор. У яго дома ці на працы заўжды беспарадак, а значная частка жыцця праходзіць у праглядванні інтэрнэт-старонак.

**Дзве Алены, супрацоўніцы банка:**

— Доўгавалосы, неразлучны з прыладай сваёй працы — ноўтбукам, прасунуты, вельмі адкрыты і камунікабельны.

**Сцяпан Палонік, намеснік дэкана па навуковай рабоце эканамічнага факультэта БДУ:**

— Мне здаецца, што ён любіць актыўна адпачываць, добра ведае сваю прафесію. Гэта чалавек будучыні.

**Анастасія, аператар ПК:**

— Худы, апрануты ў світар і джынсы, бледны. Але гэта вельмі цікавыя людзі з нестандартнымі хобі.

**Андрусь, дзесяцігадовы хлопчык:**

— Праграміст — гэта чалавек, які карыстаецца якой-небудзь праграмай.

Наколькі справядлівае ўяўленне навакольных пра прафесію праграміста, яго заняткі і знешні выгляд, мы пацікавіліся непасрэдна. Адказ на пытанне, што думаюць самі праграмісты пра нестандартныя хобі, сваю вялікую адказнасць перад будучыняй і сінякі пад вачыма, вырашана было шукаць у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Групка студэнтаў-праграмістаў засела на лавачцы ў чаканні чарговай лекцыі. Тут іх і заспелі цікаўныя журналісты.

Аляксей, Сяргей, Пірат (назваўся так :), Віталь, Руслан, Валера і Пашка пасля просьбы назваць свае імёны, на ўсялякі выпадак удакладнілі:

— А нашы нікнэймы не падыдуць?

Усе хлопцы вучацца на першым курсе па спецыяльнасці «Радыёэлектронная абарона інфармацыі».

Згодна з апытаннем, уражанне пра праграміста склалася наступнае. Наконт хударлявага доўгавалосага хлопца, які не сочыць за модай, нашы субяседнікі выказалі згоду. Нават сінякі пад вачыма палічылі вельмі верагоднай дэталлю.

— І што, у вас зусім няма модных праграмістаў?

— Можа і ёсць, але гэта не з нашай групы, — адазваўся хлопец у паласатай кашулі.

— Не ведаю, вось я не падыходжу пад гэты стэрэатып, — заспрачаўся яго аднакурснік.

Што наконт характару? Згадзіліся з тым, што праграмісты вельмі разумныя і валодаюць прафесіяй, але не заўсёды бываюць камунікабельнымі. А вось адпачываюць праграмісты сапраўды актыўна: займаюцца спортам, бавяць час у клубах і ездзяць у лес, каб падыхаць свежым паветрам і ненадоўга забыцца на камп'ютар. Прынамсі, так сказалі нашы суразмоўцы.

Да таго ж, «гуру клавіятуры» і досыць адказныя.

— Мы б яшчэ што-небудзь расказалі, калі б вы нас адпрасілі з лекцыі. Нам ужо пара ісці, — заспяшаліся хлопцы.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## Гэта ж мы, Госпадзі!

### АД БЯСПРАЎНЫХ ПАКУТУЮЦЬ ДЗЕЦІ...

27-гадовы жыхар гарадскога пасёлка Янавічы на аўтамабілі ВАЗ-2103 паблізу вёскі Глазомічы Віцебскага раёна з'ехаў у кювет і перакуліўся. У выніку ДТЗ 14-гадовы хлопчык, які знаходзіўся на заднім пасажырскім сядзенні, загінуў. Кіроўца, які, як паведамілі ў Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі, не меў пасведчання і рухаўся на чужым аўтамабілі, з месца здарэння ўцёк (!), але ў хуткім часе быў затрыманы.

У той жа дзень у Маладзечне 44-гадовы мужчына, пазбаўлены правоў за паўторнае кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення, на «Фальксвагене-Пасат» наехаў на 10-гадовага веласіпедыста, які перасякаў праезную частку. Школьнік з траўмамі дастаўлены ў бальніцу.

**Надзея ДРЫЛА.**

### ЗДАБЫЎ ДЗІКА, ПЕРАВЁЗ, РАЗАБРАЎ

Пра незаконную здабычу дзіка ў лясным масіве каля вёскі Чарнічнае Капыльскага раёна работнікам Нясвіжскай міжрайінспекцыі паведаміў паляўніцтвазнаўца Капыльскай раённай структуры «Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў».

Падчас агляду месца здарэння каля жывёлагадоўчага комплексу ААТ «Старыца — Агра» былі знойдзены рэшткі жывёлы, у аўтамабілі «УАЗ» кроў і поўсць, а ў раздзелачным цэху — і сама разабраная туша дзіка. У цэху былі затрыманыя кіраўнік аддзялення, дзяжурны спецыяліст комплексу, інжынер па працаёмкіх працэсах — усе работнікі ААТ «Старыца — Агра». Затрыманыя патлумачылі, што інжынер на кукурузным полі каля комплексу здабыў дзіка, пасля чаго самавольна ўзяў «УАЗ», які належаў ААТ, і перавёз тушу ў цэх, дзе самастойна разабраў яе. У работніка канфіскаваная паляўнічая стрэльба. Шкода ацэнена ў 2,1 мільёна рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### МІНЧАНІНА АБРАБАВАЛІ СТУДЭНТКІ

Жыхар Мінска, які спыніўся ў віцебскім гатэлі «Віцебск», што ў самым цэнтры горада, паскардзіўся ў міліцыю, што зніклі 200 долараў і 100 тысяч беларускіх рублёў. Высветлілася, што раніцай (па словах пацярпелага, яшчэ і васьмі гадзін не было) з незачыненага нумара гатэля грошы скралі дзве студэнткі (1990 і 1989 года нараджэння). Як яны ў такую рань апынуліся ў гатэлі, ці былі знаёмыя з 45-гадовым уладаром купюр — высветліцца. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### НЕАСЦЯРОЖНА КУРЫЛІ

У вёсцы Замшэна Лёзненскага раёна ў выніку пажару жылога дома загінулі 60-гадовы гаспадар і ягоная 52-гадовая сяброўка. Мяркуецца, што прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні гаспадара ў нецвярозым стане.

У Браславе па гэтай жа прычыне ў сваёй кватэры загінуў таксама 60-гадовы пенсіянер.

У Віцебску з-за неасцярогі пры курэнні гарэлі кватэры на вуліцы Гагарына і Маскоўскім праспекце. Калі пажарныя прыехалі на першую з іх, выратавалі гаспадара і ягонага сябра. Мужчын шпіталізавалі ў аддзяленне таксікалогіі Віцебскай абласной клінічнай бальніцы. А ў выніку пажару на Маскоўскім праспекце атручванні прадуктамі гарэння атрымалі гаспадыня кватэры і яе 33-гадовы сын. Мяркуецца, што ён неасцярожна курыў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**ОАО «БОРИСОВБЫТСПЕЦСЕРВИС»**

Уведомляет акционеров о приобретении на баланс Общества простых (обыкновенных) акций собственного выпуска, на которые не распространяется преимущественное право приобретения, в количестве 1000 штук по цене 4200 белорусских рублей за одну акцию с целью аннулирования акций и уменьшения уставного фонда.

**Предоставление предложений акционеров на продажу акций принимаются Обществом с 15 сентября по 25 сентября 2010 г. по адресу: 222525, г. Борисов-15, ул. имени братьев Вайнрубов, 7, тел. 8 (0177)787958.**

Совершение внебиржевых сделок по приобретению акций на баланс Общества с заключением договора купли-продажи и регистрацией сделки в депозитарии эмитента с 26 сентября по 30 сентября 2010 г.

Оплата будет произведена денежными средствами по безналичному расчету в течение 10 рабочих дней после зачисления акций на счет «депо» Общества.

УНН 600009802

Па чутках і кампетэнтна

# НАКОЛЬКІ НЕБЯСПЕЧНЫ ПАРАЦЭТАМОЛ?

**РАСІЙСКІЯ СМІ палохаюць небяспекай, звязанай з ужываннем такога гарачкапаніжальнага і абязбольвальнага сродку як парацэтамол. Маўляў, аднаго яго прыёму ў год дастаткова, каб павялічыць рызыку астмы ў падлеткаў 13-14 гадоў на цэлых 43 працэнты. Указваецца і на адначасовы рост верагоднасці ўзнікнення алергічнага рыніту і экзэмы, «што наўрад ці выпадкова, паколькі ў гэтых хваробаў шмат агульнага з астмай». Усё гэта, як сцвярджаецца ў адным з выданняў, выявілі новазеландскія вучоныя, якія прааналізавалі звесткі міжнароднага даследавання астмы ў больш як 300 тысяч дзяцей з 50 краін свету. Так, яшчэ ў 2008 годзе было даказана: у малых, якіх на першым годзе жыцця лячылі парацэтамолам, у 6-7 гадоў астма развівалася часцей на 46 працэнтаў, алергічны рыніт — на 48, а экзэма — на 35.**

Дарэчы, варта нагадаць, што парацэтамол прыйшоў на змену аспірыну. Як вядома, шкоду арганізму нярэдка наносіць не сам прэпарат, а яго спалучэнне, напрыклад, з вірусной інфекцыяй. Гэта ў першую чаргу датычыцца аспірыну, які ва многіх краінах свету забараняецца прымяняць да 18-гадовага, а ў нас — да 12-гадовага ўзросту. Справа ў тым, што «ў спалучэнні» з вірусам грыпу або вірусам, які выклікае ветраную воспу, у пацыентаў з мітахандрыяльнай недастатковасцю аспірын спрыяе развіццю сіндрому Рэйе — хваробы, якая мае клініку вострай пячоначнай недастатковасці, цяжкіх парушэнняў з боку цэнтральнай нервовай сістэмы, расстройства свядомасці, нават лятальнага зыходу.

Калісьці яшчэ для паніжэння гарачкі выкарыстоўвалі пірамідон, або амідапірын, аднак высветлілася, што ён схіляе да развіцця сутаргавага сіндрому. Парацэтамол жа ва ўсіх памянёных сэнсах аказаўся значна больш бяспечным. Таму эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя рэкамендуюць яго як прэпарат першага раду для зніжэння тэмпературы.

Безумоўна, у любога прэпарата ёсць свае рызыкі, пабочныя эфекты. Аднак тут важна, на фоне якіх праблем са здароўем і асабліваццяў арганізма прымяецца лекавы сродак. Па гэтай прычыне спецыялісты і настойваюць на медабследаванні. З асцярожнасцю давядзецца прымаць парацэтамол хворым на гепатыт, з пэўнай спадчыннай схільнасцю. Акрамя таго, бацькам трэба ўзяць на заметку наступнае: тэмпература, якая не перавышае 39 градусаў, не нясе ніякай небяспекі, а ўсяго толькі сведчыць пра выпрацоўку арганізмам інтэферону — абаронцы ад інфекцыі.

## КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

**Дацэнт кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя Беларусі па дзіцячых інфекцыйных хваробах Іна ГЕРМАНЕНКА:**

*— Парацэтамол (фармакалагічная назва прэпарата — ацэтамінафен) дазволены да выкарыстання з моманту нараджэння. Ужыванне гэтага сродку залежыць ад вагі дзіцяці, паказанняў, формы выпуску. Для кожнага ўзросту распрацавана форма, якой аддаецца перавага. Для дзяцей першых месяцаў жыцця больш зручна, каб гэта быў раствор, суспензія, сіроп або рэктальныя свечкі. Для дзяцей старэйшага ўзросту могуць прымяняцца таблеткі, капсулы.*

*Прэпарат адносіцца да групы гарачкапаніжальных і абязбольвальных, прычым гарачкапаніжальны эфект у парацэтамолу вышэй за эфект абязбольвання. Такім чынам, першым паказаннем для прымянення з'яўляецца павышэнне тэмпературы. Паводле рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, павышэннем тэмпературы ў дзіцяці ва ўзросце да 2 месяцаў жыцця трэба лічыць значэнне 38,5 градуса, пасля 2 месяцаў — звыш 39 градусаў. Калі дзіця мае нейкі неспрыяльны фон — прыкметы паражэння цэнтральнай нервовай сістэмы, парок сэрца, хваробы нырак, або калі ў анамнезе ёсць сутаргі і некаторыя іншыя станы, то такому дзіцяці тэмпературу пачынаюць «збіваць» пры 38 градусах. Бацькі могуць пачынаць «збіваць» тэмпературу яшчэ да прыезду «хуткай дапамогі» ці прыходу ўрача, паколькі нярэдка высокая, звыш названых значэнняў, тэмпература небяспечная для дзіцяці ўзнікненнем некантралюемых зменаў метабалізму, развіццём сутаргавага прыпадку і г.д.*

*Максімальная дазволеная ў нашай краіне сутачная доза парацэтамолу — 60 мг/кг. Вельмі важна не перавышаць разавую дозу прэпарата, а гэта 10-15 мг/кг. У гэтай справе заўсёды лепей ужываць крыху менш, чым крыху больш. Наогул прэпарат прызначаецца не планава, сістэмна, а сімптаматычна. Парацэтамол можна ўводзіць да 6 разоў на дзень — па 10 мг/кг, але гэта не азначае, што так сапраўды трэба рабіць. Можа быць, дастаткова аднаразовага выкарыстання.*

*Любы фармакалагічны прэпарат, у тым ліку і парацэтамол, нясе ў сабе пэўныя рызыкі. Асабліва небяспечныя прэпараты гэтай групы для пацыентаў, якія маюць змяненні з боку печані, метабалічныя, спадчынныя хваробы. Абумоўлена гэта тым, што ўтылізацыя ацэтамінафену адбываецца ў печані. Выяўленыя падчас клінічных выпрабаванняў пабочныя эфекты абавязкова ўказваюцца ў інструкцыі па выкарыстанні парацэтамолу. У першую чаргу ўзгадваюцца алергічныя рэакцыі. Аднак прэпарат можа падштурхнуць да развіцця і пячоначнай недастатковасці, калі пацыент не звяртае ўвагі на абмежаванні дозы прэпарата. У любым выпадку праблема не з'явіцца на пустым месцы. Толькі калі ёсць нейкі фон, — напрыклад, спадчынная недастатковасць ферментаў, якія ўтылізуюць тыя ці іншыя рэчывы, хімічныя злучэнні. Такім пацыентам трэба ведаць, што абвастрэнне пячоначнай недастатковасці можа справакаваць не толькі парацэтамол, але і які-небудзь харчовы прадукт — воцат, кетчуп і іншыя.*

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

«Eurovision-news»

# НА ДЗІЦЯЧАЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ» ПАЕДЗЕ ШКОЛЬНІК З ЖАБІНКІ

**Беларусь на дзіцячым «Еўрабачанні-2010» прадставіць 13-гадовы Данііл Казлоў з песняй «Музыкі свет». У фінальным туры нацыянальнага адбору школьнік з Жабінкі абышоў сваіх канкурэнтаў, набраўшы 24 балы. Другое месца заняла мінчанка Эвеліна Лашук з песняй «Дзядулеў хіт», на трэцім радку — мазырчанка Кацярына Атрошчанка і яе песня «Купала».**

Данііл Казлоў вучыцца ў восьмым класе СШ № 1 г. Жабінка. З дзевяці гадоў займаецца ў школе мастацтваў па класе скрыпкі, удзельнік дзіцячага эстраднага калектыву «Алегра-Нова» пад кіраўніцтвам Нэлі Дуколі.

У творчым багажы хлопчыка — Гран-пры конкурсу «Залатая пчолка» (2009), перамога ў рэспубліканскім конкурсе «Юныя таленты Беларусі» ў лагеры «Зубраня», першае месца на конкурсе «Рытмы маладосці» ў Брэсце (2010).

Данііл — шостае дзіця ў сям'і, яго тата — пастыр царквы евангельскіх хрысціян-баптыстаў.

— Я прысвячаю сваю перамогу ўсім сваім родным і Богу, — сказаў пасля свайго выступлення хлопчык.

Тлумачачы творчую канцэпцыю песні, Данііл адзначыў: «Музыка — гэта ўсё, што нас акружае. Выконваючы песню, я думаў, што музыка дадзеная нам звыш».

**Ілья ЛАПАТО.**

Фота БЕЛТА.

Спорт-тайм

## Мінскае «Дынама» атрымала першую перамогу ў КХЛ

Мы спадзяваліся на перамогу сталічнага «Дынама» ў дзень горада, але і баяліся, каб не было другога запар паражэння. У яраслаўцаў у той дзень таксама было свята — дзень нараджэння горада, прычым тысячагадовы юбілей. Але перамога, цалкам заслужаная, аказалася ў мінчан. Яраслаўскі «Лакаматыў» прайграў усухую 0:3.

Першы перыяд ініцыятывай валодала каманда гасцей, а беларусы правялі яго, па трапным выразе Марэка Сікоры, «пад коўдрай». У другім перыядзе мінчане разняволіліся, але на табло па-ранейшаму былі нулі. Пад канец другога перыяду «Лакаматыў» застаўся ўтраіх, але і гэта вынікаў не прынесла. Праўда, у пачатку трэцяга тайма, калі да выхаду поўнай пяцёркі суперніка заставалася пяць секунд, лік дынамаўцамі быў адкрыты. Пачынанне Аляксандра Кулакова працягнуў Максім Спірыдонаў. А потым у пустыя вароты яраслаўскай каманды той жа Кулакоў адправіў і трэцюю шайбу.

Учора сталічнае «Дынама» правяло чарговы матч на выездзе з навакузнецкім «Металургам» і перамагло з лікам 5:2.

## Карстэн выйграла чэмпіянат Еўропы

Шматразовая чэмпіёнка свету па акадэмічным веславанні, алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн выйграла ў гэтыя выхадныя чэмпіянат свету, які праходзіў у Партугаліі. Яна апярэдзіла сваю даўнюю суперніцу чэшку Мірку Кнапкаву больш чым на секунду. Трэцяе месца заняла шведка Фрыда Свенсан.

За дзень да гэтага залатыя медалі выйгралі два беларускія экіпажы. Жаночая чацвёрка без рулявога (Ганна Гаўра, Наталля Гелах, Наталля Гаўрыленка і Зінаіда Ключынская) з вынікам 7 хв. 28,81 сек. амаль на 7 секунд апярэдзіла італьянскую лодку, якая была адзіным супернікам беларусак у фінале. Мужчынская двойка з рулявым (Вадзім Лялін, Аляксандр Казубоўскі, Пётр Пятрыніч) пераадолела дыстанцыю 2000 м за 7 хв. 45,50 сек., больш чым на 3 сек. апярэдзіўшы сярэбраных прызёраў італьянцаў і на 8 секунд — чэхаў, якім дасталася бронза. Тут за ўзнагароды змагаліся тры экіпажы.

## Аксана Папко стала двойчы чэмпіёнкай Еўропы

Беларуска Аксана Папко стала лепшай у індывідуальнай гонцы праследавання на 3000 м, а таксама ў групавой гонцы па ачках. З вынікам 3 хв. 42,301 сек. спартсменка выйграла на дыстанцыі 3000 м. Сярэбранай медалісткай стала Люцыя Залешка з Чэхіі (3 хв. 49,762 сек.), бронзу заваявала літоўка Вайда Пікаўскацтэ. Яшчэ адна беларуска Ірына Кручкова заняла шостае месца.

У групавой гонцы па ачках Аксана Папко набрала 38 балаў, у сярэбранай медалісткі італьянкі Марты Талыфера 32 ачкі, у бельгійкі Жульен Дор, якая стала трэцяй, — 31, беларуска Ірына Кручкова заняла тут чацвёртае месца.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Сяргей Гурэнка прайграе, але не здаецца

### Галоўны трэнер жодзінцаў высветліў адносіны з суддзямі

**Тое, што Сяргей Гурэнка не дасць засумаваць у беларускім футболе, пацвердзіў 24 тур чэмпіянату Беларусі. На гэты раз Сяргей Вітальевіч, заўсёды неабыякавы да судзейскай тэмы, вызначыўся запісам у пратаколе: «Пасля заканчэння матчу галоўны трэнер ФК «Тарпеда» Жодзіна Гурэнка С.В. і трэнер Дрозд А.М выйшлі на футбольнае поле і сталі зневажаць судзейскую брыгаду, ужываючы нецэнзурныя выразы. У падтрыбунным памяшканні працягвалі зневажаць, і Гурэнка С.В. пагражаў фізічнай расправай».**

Паклала пачатак інцыдэнту падзенне ў штрафной плошчы «Шахцёра» тарпедаўца Антона Бруснікіна, пасля якога, насуперак меркаванням футбалістаў, балельшчыкаў і трэнерскага штаба «Тарпеда», арбітр пенальці не прызначыў. Было гэта ў першым тайме, а ўвогуле матч не быў багаты на моманты і ўсё ішло да мірнай нулявой нічыёй. А на 87-й хвіліне салігарчане пасля банальнага аута забілі гол. Адыгравала «Тарпеда» ні часу, ні сілаў не было — 0:1. Пасля такога інцыдэнту «Тарпеда» яшчэ і аштрафуюць, а галоўны трэнер, цалкам верагодна, паплаціцца дыскваліфікацыяй.

Вызначыўся, праўда, паводзінамі балельшчыкаў, матч паміж наваполацкім «Нафтанам» і барысаўскім БАТЭ. Наваполацкі футбаліст Філіп Рудзік летась меў неасцярожнасць выказацца, што суддзі дапамагаюць БАТЭ. А барысаўскія балельшчыкі дагэтуль не даюць спуску гульцу, і зноў выкрыквалі знявагі ў яго адрас з трыбун. Матч скончыўся на карысць чэмпіёна 1:0, адзіны гол быў забіты Максімам Скавышам у дабаўлены да другога тайма час. БАТЭ мае 54 ачкі, і пасля 24-га тура інтрыга ў барацьбе за золата вастрыню страціла. «Мінск» усухую прайграў на выездзе «Дняпру» — 0:3. Каманда застаецца на другім месцы, але цяпер узмацняецца барацьба за серабро. «Шахцёр» адстае ад «гараджан» на тры ачкі, следам ідзе сталічнае «Дынама». «Бела-блакітныя» разграмілі дома «Белшыну» 4:0 і правялі адзін з лепшых матчаў у перыяд трэнерства Уладзіміра Гольмака.

«Нёман» перамог «Партызан» (2:0), і ў ніжняй частцы турнірнай табліцы адбыліся змены — гродзенскі клуб пакінуў зону вылету, перамясціўшыся на трэці знізу радок. Другі — заняло «Тарпеда», на апошнім — «Партызан». З такім жа лікам згулялі і «Віцебск» з брэсцкім «Дынама». Каманда Юрыя Пунтуса ўзяла верх 2:0.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Падсобная гаспадарка

# Зорка і Субота Андрэя Глёкава

— На вёсцы як можна грошы зарабіць? Толькі працай! — усміхаецца **жыхар аграгарадка Сялецкае Касцюковіцкага раёна Андрэй Глёкаў**. — Я адразу пасля арміі і пачаў: спачатку адна карова была, прыдбаў другую, потым стала 5, а цяпер — 19! Зорка, Субота, Вячора, Пляцёна, Чарнуха... Усіх ведаю па мянушках. З каровамі ў мяне добра атрымліваецца.

Вясковец Андрэй, разам з жонкай і маленькай дачкой, жыве пагарадскому. Трохпакаёвая кватэра з усімі выгодамі ў доме, які быў пабудаваны для чарнобыльскіх перасяленцаў. Праўда, зусім не часта Андрэю і Наталлі ўдаецца вось так спакойна пасядзець на лаве каля агароджанага жоўтым плотам агародчыка з кветкамі і дрэвамі.

— Жывём па-гарадскому, а гаспадарку трымаем сельскую, — пагаджаюцца Глёкавы. — Але супярэчнасці тут няма, проста працаваць трэба.

Селянін пачынае знаёмства са сваёй гаспадаркай з хлявоў. Калі Андрэй пачаў набываць кароў, то папрасіў у аднавяскоўцаў, якія не трымаюць жывёлу, здаць непатрэбныя хлявы ў арэнду. Цяпер ён мае цэлы «комплекс», дзе і праходзіць асноўная працоўная дзейнасць яго сям'і.

Што і як рабіць з жывёлай, 33-гадовы Андрэй добра ведае з маленства: маці працавала на ферме, трымала кароў дома, а памочнікам па гаспадарцы стаў сын. Наталля, жонка Андрэя, родам з Украіны.

— Я прыязджала сюды з Чарнавіцкай вобласці працаваць на бураках: і зарабіць хацелася, і пахудзець, — усміхаецца жанчына. — І на трэці год засталася ў Сялецкім!

Калісьці пасёлак перасяленцаў, дзе жывуць цяпер Глёкавы, назвалі «Барбарай», па аналогіі з вядомым амерыканскім серыялам «Санта-Барбара». Узгадваюць, што жарсці тут кіпелі зусім не жартоўныя. Усе яны не маюць ніякага дачынення да Андрэя і Наталлі, хоць і іх сямейную гісторыю не назавеш шараговай. Украінка Наталля, старэйшая за свайго мужа, у 39 гадоў нарадзіла дачку. Сёння Даша ходзіць у дзіцячы садок, а бацькі ўсімі сіламі імкнуцца забяспечыць ёй добрую будучыню і шмат працуюць.

— Гэта ў нас ва Украіне зашмат садавіны і гародніны, а тут цяпер можна толькі на малацэ зарабіць, — лічыць Наталля. — Хоць і крыўдна, што малако ўсё ж не вельмі цэніцца. Бутэлька мінеральнай вады каштуе 2 тысячы рублёў, а закупачны кошт літра малака і да тысячы рублёў не дацягвае! Але мы не сумуем. Калі малако не будзе даваць заробку, што-небудзь іншае прыдумаем.

— Розныя людзі зарабляюць і жывуць па-свойму, — падхоплівае Андрэй. — Я з жывёлай корпаюся, а нехта паедзе ў Маскву і там на будоўлі па-чорнаму заробіць за месяц столькі, колькі я за год адкладу. Мне, вядома, крыўдна, што мая праца цэніцца ніжэй. Але, з іншага боку, як яны там жывуць, у якіх умовах працуюць? Так што, калі з'явілася дачка, зніклі і думкі пра хуткія заробкі.

Усе дні Глёкавых запоўненыя працай. Першай а 5-й раніцы падымаецца Наталля і бяжыць на дойку, а муж застаецца з дачкой. Па дарозе сняданак, потым дзіцячы сад, і зноў хлявы. Андрэй таксама працуе зборшчыкам малака ў Сялецкім: даводзіцца дбаць аб працоўным стажы.

— Цяпер толькі з майго асабістага статка здаю ў Касцюковічы больш за 150 літраў малака штодзень, — расказвае Андрэй. — Але гэта мала: здаралася даіць і па 300 літраў. Сёлета ў спякоту было зусім мала малака, а цяпер прыйшла восень...

Гаспадары гавораць, што статак з 19 кароў (а таксама бык, конь, парсючок і 3 гектары зямлі з усім, чым можна) — гэта і цяжар, і выратаванне. Цяжар — таму што справіцца з такой гаспадаркай складана, патрабуецца шмат сілаў і часу. А выратаванне — таму што дае грошы, і альтэрнатывы такому заробку пакуль няма.

— Хацелася б паехаць у горад, а яшчэ лепей — на мора, — прызнаецца Андрэй. — Я мора аднойчы бачыў у дзяцінстве. А цяпер і выхадныя дні, і водпуск праводжу каля хлявоў.

— Наш поўдзень на сене! — смяецца Наталля.

Цяпер у гаспадарцы з'явілася палёгка: з сенам дапамагае мясцовая гаспадарка. Аднак галоўная праблема статка Глёкавых так пакуль і не вырашана: Андрэй марыць пра добрую пашу.

— Я браў удзел у «круглым стале», арганізаваным Касцюковіцкім райвыканкамам і прысвечаным праблемам асабістых падсобных гаспадарак, — расказаў Андрэй. — І я там узняў пытанне наконт пашы і вадапою для прыватнага статка ў Сялецкім.

Сапраўды, хлявы і пашу тут падзяляюць кіламетры: штодня коровам прыходзіцца праходзіць немалыя адлегласці. Ды і шмат гадоў паша не аралася і не засявалася. Аднак праблему з пашай мясцовыя ўлады абяцаюць вырашыць.

— На наступны год будзе зроблена пераазалужэнне каля вёскі, — запэўніў старшыня Сялецкага сельскага Савета Сяргей Прахарэнка. — Сёлета на тым полі сабралі ўраджай, а на наступны год пасеюць авёс. Будзе вельмі добрая паша, і побач з вёскай.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік, каб падтрымаць асабістыя падсобныя гаспадаркі ўсяго рэгіёна, запатрабаваў выдзяліць іх уладальнікам пашу ў разліку 1 гектар на карову. У Сялецкім лічаць, што выканаць паказчык — не праблема: плошчы ёсць, патрабуюцца толькі сродкі на перазалужэнне.

— Сялян трэба падтрымліваць добрай пашай, сенакосам, — пагаджаецца з рашэннямі ўладаў Андрэй. — Трэба, каб у чалавека, які хоча трымаць гаспадарку, была магчымасць раскруціцца, даць болей прадукцыі, пашырыцца.

— Ведаеце, мой муж — вельмі працалюбівы чалавек, — сказала Наталля. — Ён вельмі любіць жывёлу, сам настойлівы і ўпарты. А калі хочаш нечага — усё атрымаецца. Будзем жыць і працаваць.

— Сялянскую ініцыятыву варта падтрымліваць, — лічыць старшыня Савета Сяргей Прахарэнка. — Калі чалавек працуе — ён жыве. А як толькі працы няма, то адразу пачынаюцца праблемы. Таму такім людзям, як Глёкавы і іншым дбайным гаспадарам на вёсцы, трэба дапамагаць.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Касцюковіцкі раён.*

І так бывае...

## Прыцягальныя дрэвы

**Пры дапамозе спецыяльнага інструмента двух пенсіянераў вызвалялі з легкавога аўтамабіля «Ака», дзверцы якога заклініла пры сутыкненні з дрэвам.**

Транспартнае здарэнне адбылося ў вёсцы Казіміраўская Слабодка Жлобінскага раёна. Мужчына і жанчына атрымалі складаныя траўмы, але засталіся жывыя. Як і кіроўца аўто «Сітраен С-5», які ў той жа дзень не змог размінуцца з дрэвам перад населеным пунктам Кіраў, што ў Нараўлянскім раёне. І тут дарэчы аказаліся выратавальнікі. Яны вызвалілі грамадзяніна, які аказаўся ў бездапаможным становішчы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Лісавай (Бурлачэнка) Валянціны Уладзіміраўны**, 23 сакавіка 1978 года нараджэння, ураджэнкі г. Рэчыца Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства якой: г. Рэчыца, вул. Навумава, д. 24, кв. 21. Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Лісаву (Бурлачэнка) Валянціну Уладзіміраўну, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Канавалавай Наталлі Паўлаўны,** 17 студзеня 1977 года нараджэння, ураджэнкі г. Рэчыца Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства якой: г. Рэчыца, вул. Ракасоўскага, д. 17, кв. 42. Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Канавалаву Наталлю Паўлаўну, паведаміць суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Краіна здароўя

Выпуск № 46 (215)

**ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...**

**На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**14 верасня** — галоўны ўрач 22-й мінскай гарадской паліклінікі Уладзімір Аркадзьевіч ЛАГОЙСКІ.

**15 верасня** — галоўны ўрач мінскай гарадской гінекалагічнай бальніцы Аляксандр Ільіч БІЧ.

**16 верасня** — начальнік адзела гігіены Міністэрства аховы здароўя Юрый Яўгенавіч ФЁДАРАЎ.

**17 верасня** — намеснік дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Сяргей Уладзіміравіч ЗАРЭЦКІ.

**Доктар адкажа**

**«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25**

**14 верасня** — загадчык філіяла № 1 Мінскай ЦРБ Атолінская бальніца Мікалай Георгіевіч ГРЫШУК.

**15 верасня** — загадчык гінекалагічнага аддзялення № 2 Мінскага абласнога радзільнага дома Ганна Мікалаеўна ФОКІНА.

**16 верасня** — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ігар Віктаравіч ЛАЗАРЧЫК.

**17 верасня** — загадчык эндакрыналагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Алена Пятроўна ІНДЗЮКОВА.

Што рабіць?

# КАБ ЗУБЫ ЗЗЯЛІ БЕЛІЗНОЙ...

**Асляпляльныя ўсмешкі знакамітасцяў... Хто з нас не марыць стаць уладальнікам такой жа? Аднак ці існуе тоеснасць паміж словамі «белы» і «здаровы»? Ці варта выкарыстоўваць такую працэдуру, як адбельванне зубоў? І што трэба ведаць, каб яна аказалася сапраўды паспяховай?**

Абсалютна белых зубоў у прыродзе не бывае. Іх колер залежыць ад аптычных уласцівасцяў эмалі і дэнціну (цвёрдай тканкі асаблівай будовы, якая складае большую частку зуба) і часта перадаецца ў спадчыну. Так, у большасці славян колер зубоў бліжэй да жоўтага, а, напрыклад, у амерыканцаў — з шэрым адценнем. І першае, і другое з'яўляецца паказчыкам нормы. Акрамя генетычных фактараў, на колер зубоў уплываюць нашы звычкі і дыета. Напрыклад, частае ўжыванне гарбаты, кавы, а таксама курэнне могуць прывесці да змянення колеру эмалі.

Працяглы прыём некаторых антыбіётыкаў у дзіцячым узросце часта вядзе да ўстойлівага змянення колеру зубоў (так званыя «тэтрацыклінавыя зубы»). Другая магчымая прычына — траўма або ўскладненні падчас лячэння каналаў зуба. На колер зубоў дзіцяці могуць паўплываць таксама некаторыя хваробы маці падчас цяжарнасці.

## Аднаго жадання мала

Часта аднаго жадання пахваліцца жамчужна-белымі зубамі недастаткова. Для гэтай працэдуры існуюць дакладныя медыцынскія паказанні і супрацьпаказанні.

Адбельванне зубоў — гэта акісляльная хімічная рэакцыя, у выніку якой пігменты, размешчаныя ў глыбіні зубной тканкі, пад дзеяннем адбельвальнага агента ператвараюцца ў празрыстыя рэчывы, змяняючы такім чынам аптычныя ўласцівасці і, адпаведна, колер зуба, бачны навакольным.

Працэдура праводзіцца толькі ў тым выпадку, калі зубы знаходзяцца ў ідэальным стане. Таму перад адбельваннем праводзяць лячэнне зубоў. Калі эмаль тонкая або аголены дэнцін, то адбельванне можа толькі ўскладніць сітуацыю. Адбельванне — радыкальная працэдура, якая парушае структуру эмалі. Толькі стаматолаг можа сказаць, варта ці не варта яе праводзіць.

## Справа тэхнікі

Працэдуру адбельвання можна правесці як у кабінеце ў стаматолага, так і дома. Для дасягнення найлепшага выніку рэкамендуецца спалучэнне гэтых метадык.

Найбольш эфектыўнае адбельванне зубоў у кабінеце ўрача з выкарыстаннем спецыяльных лямпаў. Гэта дазваляе асвятліць зубы на вялікую колькасць тонаў і за меншы час, чым простае адбельванне ў назубных капах. Пры гэтым звычайна дастаткова гадзіннага візіту да ўрача.

**Памятайце:** за два тыдні (!) перад хімічным адбельваннем неабходна правесці ўсе працэдуры прафесійнай гігіены поласці рота: вылечыць карыес, зняць зубныя адкладні і налёт. Пакалькі пломбы не паддаюцца адбельванню, то паставіць іх лепш пасля правядзення працэдуры, падабраўшы колер пломбаў пад абноўлены колер сваіх зубоў.

Нягледзячы на высокую эфектыўнасць урачэбнай працэдуры адбельвання, так званае «хатняе адбельванне» на сёння застаецца найбольш распаўсюджаным. Для тых, хто спыняе свой выбар на гэтым метадзе, стаматолаг вырабляе індывідуальную пластыкавую капу, якая, як люстэрка, паўтарае форму зубнога рада. У капу ўносіцца адбельвальны гель. Стандартная схема заключаецца ў нашэнні капы штоноч на працягу 14—20 сутак.

Больш ашчадным (абсалютна нехімічным) спосабам адбельвання з'яўляецца прафесійная чыстка зубоў (тыпу Air Flow), якая здольная выдаліць зубны камень, адкладанні і мяккі зубны налёт, забяспечыць ачышчэнне прасторы паміж зубамі. У гэтым выпадку на зубы пад ціскам падаецца сумесь вады са спецыяльна апрацаванымі часцінкамі соды. Эмаль пры выкарыстанні гэтага метаду не траўмуецца. У выніку такой працэдуры вы ўбачыце сапраўдны колер сваіх зубоў, а навакольным будзе здавацца, што эмаль значна пабялела.

**Увага!** Пасля адбельвання на некалькі дзён з рацыёну харчавання варта выключыць наступныя прадукты: гарбату, каву, чырвонае віно, кока/пепсі-колу, буракі, чарніцы, соевы соус, кетчуп і г.д. А таксама спецыялісты раяць устрымацца на суткі ад курэння.

Сёння на рынку прадстаўлены вялікі выбар так званых «адбельвальных» сродкаў для хатняга выкарыстання: жавальныя гумкі, зубныя пасты, спецыяльныя гелі. Аднак не варта прымяняць іх рэгулярна. Напрыклад, адбельвальнымі пастамі трэба карыстацца не часцей як 2 разы на тыдзень, інакш гэта можа справакаваць павышаную адчувальнасць зубоў. Калі ж эмаль тонкая, а дзясны запаленыя, то карыстацца адбельвальнай пастай супрацьпаказана.

Адбельвальны эфект жавальнай гумкі не даказаны, а асноўнае яе прызначэнне — дэзадарыраванне і выдаленне рэшткаў ежы.

**ПРАВІЛЫ НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ**

- Белізна зубоў яшчэ не паказчык іх здароўя. Галоўнае — захаванне правільнай гігіены поласці рота, рэгулярнае (не радзей як 1-2 разы на год) наведванне стаматолага, захаванне тэмпературнага рэжыму харчавання.
- Чысціць зубы трэба не радзей як 2 разы на дзень на працягу 3-4 хвілін. Падчас хваробы зубы неабходна чысціць з асаблівай стараннасцю. У ідэале карыстайцеся зубной шчоткай пасля кожнага прыёму ежы. Хаця б проста без пасты. Пры гэтым жорсткасць шчаціны падбіраецца ў залежнасці ад стану вашай эмалі. Дарэчы, пры дапамозе правільна падабранай зубной шчоткі можна дабіцца і асвятляльнага эфекту.
- Не варта таксама забываць пра зубныя ніці (флосы) і розныя апалосквальнікі для поласці рота. Флосы ачысцяць міжзубную прастору і прадухіляць утварэнне карыесу, апалосквальнікі для поласці рота асвяжаюць дыханне і перашкаджаюць прымацаванню бактэрый да паверхні зуба.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Ціхае паляванне

# АТРУЦІЦЦА МОЖНА НЕ ТОЛЬКІ ЯДАВІТЫМІ ГРЫБАМІ

**Кожны год у рэспубліцы рэгіструецца 250—300 выпадкаў атручвання грыбамі. Найбольш праблемнай з гэтай прычыны з'яўляецца восень, асабліва верасень. Менавіта на гэты час прыходзіцца пік збору грыбоў і робяцца грыбныя нарыхтоўкі на зіму. А грэбаванне некаторымі правіламі можа прывесці да таго, што закаткі і закруткі стануць прычынай атручвання і ў зімовы перыяд.**

Па сваёй цяжкасці вострыя атручванні грыбамі займаюць вядучае месца сярод усіх небактэрыяльных харчовых атручванняў. Захворванне, як правіла, пачынаецца раптоўна, часта ноччу, праз 3—12 гадзін пасля ўжывання грыбоў. Клінічны малюнак на пачатковых стадыях захворвання выглядае так: рэзкі боль у жываце, моцная рвота, панос, слабасць, галаўны боль. Потым да гэтых сімптомаў могуць далучыцца сутаргі, галюцынацыі, трызненне. Смяротны зыход пры атручваннях неядомымі грыбамі дасягае 25-50 працэнтаў выпадкаў. Калі ў ежу трапіў мухамор, пад уздзеяннем алкалоідаў, якія грыб утрымлівае, развіваецца рухальнае ўзбуджэнне, узнікаюць галюцынацыі. На пачатковай стадыі атручвання бледнай паганкай хворыя ўсхваляваныя, неспакойныя.

Аднак атруціцца можна не толькі ядавітымі па сваёй прыродзе грыбамі, але і так званымі ўмоўна-ядомымі, калі грэбаваць асноўнымі правіламі іх гатавання. Да ўмоўна-ядомых адносяцца некаторыя віды сыраежак, свінушкі, смаржкі, ваўнянкі, чарнушкі. Яны ўтрымліваюць смолападобныя рэчывы і могуць выклікаць гастраэнтэрыт — запаленне страўніка і тонкага кішэчніка.

Ужываць у ежу ўмоўна-ядомыя грыбы без спецыяльнай кулінарнай апрацоўкі нельга. Іх трэба адварваць двойчы, не менш за 50 хвілін кожны раз. Абодва разы грыбы пасля варкі неабходна прамываць у праточнай вадзе.

Увогуле ўрачы-гігіеністы рэкамендуюць грыбнікам, перш чым адправіцца на ціхае паляванне, запомніць некалькі правілаў. Ідучы ў лес, неабходна ведаць відавы склад грыбоў і збіраць толькі тыя, што не выклікаюць сумненняў.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на тое, што ядомыя грыбы пры неспрыяльных экалагічных умовах (паблізу прамысловых прадпрыемстваў і аўтамабільных трас, у радыеактыўных зонах) становяцца таксічнымі, бо назапашваюць у высокіх канцэнтрацыях ртуць, свінец, кадмій і іншыя цяжкія радыеактыўныя рэчывы.

Трэба памятаць, што грыбы — прадукт, які хутка псуецца, таму іх трэба перабраць і адсартаваць адразу. Перабіраючы грыбы, неабходна выкідваць старыя, бо пры іх старэнні ў тканках адбываюцца складаныя хімічныя працэсы з утварэннем ядавітых рэчываў. У старых грыбах, нават такіх, як белыя, падасінавікі, падбярозавікі, паколькі яны ўтрымліваюць бялкі і тлушчы, у працэсе старэння ўтвараюцца высокатаксічныя спалучэнні. Сарціроўкай і гатаваннем грыбоў павінны займацца толькі дарослыя. Бацькам таксама неабходна ведаць, што грыбы павінны быць выключаны з рацыёну дзяцей да трох гадоў.

Не варта купляць грыбы ва неўстаноўленых месцах. Зусім відавочна, што тут не будзе гарантыі якасці і бяспекі. А вось на рынках усё прадукцыя падлягае абавязковаму кантролю, што дапаможа застрахавацца ад непрыемнасцяў.

Грыбы валодаюць здольнасцю паглынаць з навакольнага асяроддзя і назапашваць таксічныя рэчывы ў канцэнтрацыях, якія ў некалькі разоў перавышаюць утрыманне іх у глебе, вадзе, раслінах, таму ўсе грыбы неабходна адварваць, а адвар зліваць. Таксама без папярэдняга адварвання не варта смажыць грыбы.

Гаспадыням медыкі нагадваюць, што пры нарыхтоўцы запасаў на зіму лепш не кансерваваць грыбы пад шчыльнай накрыўкай, а замарынаваць іх ці засаліць.

Марынаваць рэкамендуецца ядомыя грыбы без едкага смаку мякаці: трубчатыя (белыя, падбярозавікі, маслякі і г. д.) і пласцінчатыя (шампіньёны, таўстушкі, лісічкі, апенькі, зялёнкі). У засол дапускаюцца ўсе ядомыя грыбы. Пласцінчатыя грыбы — толькі пасля папярэдняй апрацоўкі: іх замочваюць, двойчы адварваюць па 20 мінут.

Пры падазрэнні на атручванне грыбамі трэба выклікаць «хуткую дапамогу». Позна (на 2-я -5-я суткі) пачатае лячэнне пры атручванні ядавітымі грыбамі неэфектыўнае і прыводзіць да смерці.

Што рабіць да прыходу ўрача? Перш за ўсё неабходна прамыванне страўніка: дайце пацярпеламу выпіць 5-6 шклянак вады ці малака. Потым, раздражняючы пальцам ці чайнай лыжкай корань языка, выклічце рвоту. Гэту працэдуру можна паўтарыць 3-5 разоў, прычым у цёплую ваду ( не гарачую! ) дабаўляць можна пітную соду, па адной чайнай лыжцы на шклянку вады. Можна дабаўляць таксама сыры яечны бялок, змяшаўшы яго добра з вадой. Прамыванне можна праводзіць з дапамогай шчолачнай мінеральнай вады, злёгку падагрэтай. Хворага варта пакласці ў ложак, прыкласці да яго рук і ног цёплыя грэлкі, даваць яму больш піць, а пры рэзкай слабасці — моцную цёплую гарбату ці адвар рамонку.

**Вольга ШАЎКО.**

## САМЫ БЯСПЕЧНЫ ШРЫФТ КАМП'ЮТАРА — VERDANA

**Verdana з'яўляецца найбольш бяспечным для вачэй сярод усіх камп'ютарных шрыфтоў, сцвярджаюць амерыканскія навукоўцы.**

Доўгая праца за камп'ютарам можа прывесці да развіцця так званага «сіндрому камп'ютарнага зроку». Ён праяўляецца такімі сімптомамі, як часовая блізарукасць, дысфункцыя вочных мышцаў, паніжэнне адчувальнасці зроку, смыленне ў вачах і інш.

Аднак існуюць фактары, якія зніжаюць неспрыяльнае дзеянне камп'ютара на вочы. Напрыклад, выкарыстанне правільнага камп'ютарнага шрыфту. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што пры чытанні тэкстаў, набраных шрыфтам Verdana, вочы зведваюць найменшае напружанне.

Якасць жыцця

# 7 КРОКАЎ ДА ЦІХАМІРНАГА СНУ

**Вы не п'яце каву ўвечары, не глядзіце на ноч фільмы жахаў і не думаеце пра тое, што трэба зрабіць заўтра? У спальні цёмна і ўтульна. Чаму ж тады вы да гэтай пары варочаецеся і ніяк не можаце заснуць?**

Як запэўніваюць спецыялісты-самнолагі, некаторыя звычкі, пра якія мы нават не падазраём, могуць перашкаджаць спакойнаму сну. Не звёўшы вачэй уначы, увесь наступны дзень вы будзеце ў «туманным» стане, але гэта далёка не самае непрыемнае наступства. Пастаяннае недасыпанне павышае рызыку з'яўлення сардэчна-сасудзістых захворванняў, дыябету, дэпрэсіі і нават залішняй вагі. Як гэтага пазбегнуць? Прапануем некалькі хітрасцяў, якія дапамогуць вам штораніцы прачынацца бадзёрымі.

## Крок першы: пакіньце свае дзённыя звычкі

Відавочна, што кубак кавы або гарбаты, выпіты познім вечарам, не спрыяе здароваму сну. Але, як сцвярджаюць спецыялісты, неабходна сачыць таксама і за тым, што вы п'яце на працягу дня. У гарбаце, араматызаваных напоях і нават некаторых лімонадах утрымліваецца кафеін. Таму ўважліва вывучыце этыкеткі напояў, якія вы п'яце днём. Калі яны могуць «пахваліцца» ўтрымліваннем рэчываў, што павышаюць энергію, лепш не піць іх пасля 14 гадзін, каб падбадзёрлівы эфект паспеў зменшыцца да вечара.

## Крок другі: будзьце пераборлівымі ў ежы

Добра паеўшы перад сном, вы забяспечваеце сабе неспакойную ноч — набіты страўнік не дасць спакойна адпачыць. Аднак дыетолагі запэўніваюць, што некаторыя прадукты, наадварот, дапамагаюць заснуць.

Прыгатуйце на вячэру пасту са свежай агароднінай (галоўнае, каб макаронныя вырабы былі з цвёрдых гатункаў пшаніцы). Дадайце кавалачкі курынай грудкі (адварной або прыгатаванай на грылі), трохі таматнага соусу і пасыпце дзёртым пармезанам. Такая страва ўтрымлівае карысную камбінацыю з бялку і трыптафану — амінакіслаты, якая ператворыцца ў арганізме ў сератанін, што садзейнічае сну.

Калі ж ваш страўнік пачне буркаваць пасярод ночы, з'ешце невялікую порцыю тварагу, дадаўшы ў яго кавалачкі банана. Гэтыя прадукты таксама змяшчаюць неабходны трыптафан.

## Крок трэці: не піце алкаголь позна ўвечары

Нягледзячы на тое, што чарчка спіртнога на ноч дапамагае расслабіцца і хутчэй заснуць, яно дрэнна ўплывае на другую палову сноннага цыклу.

Алкаголь скарачае фазу глыбокага сну і павялічвае колькасць абуджэнняў, адзначаюць самнолагі. Таму, калі вы любіце выпіць за вячэрай бакал віна, лепш зрабіць гэта гадзін у 18.00 — так уздзеянне алкаголю паспее нейтралізавацца да таго часу, як вы зберацеся спаць. І, зразумела, трэба памятаць пра ўмеранасць.

## Крок чацвёрты: прымайце ванну раней

Вы любіце папесціцца ў цёплай вадзе, каб расслабіцца перад сном? Гэта можа здацца дзіўным, але гарачая ванна, наадварот, не спрыяе спакойнаму сну. Любыя дзеянні, якія прыводзяць да павышэння тэмпературы цела, фактычна перашкаджаюць заснуць.

Рэч у тым, што, каб паглыбіцца ў здаровы сон, ваша цела павінна астыць да пэўнай тэмпературы. Гэта не азначае, што пасля цяжкага дня трэба зусім адмовіцца ад гарачай ванны, проста прымаць яе пажадана раней, напрыклад, калі прыходзіце дадому з працы, а не прама перад сном.

## Крок пяты: пацягніцеся перад сном

Магчыма, вы ўжо ведаеце, што вечарам не рэкамендуецца займацца спортам. Любыя фізічныя практыкаванні лепш выконваць як мінімум за шэсць гадзін да сну. Але крыху мяккай агульнаўмацавальнай ёгі не пашкодзіць. Наадварот, яна дапаможа ўраўнаважыць розум, стабілізаваць дыханне і знізіць мышачную напружанасць, пры гэтым захоўваючы сэрцабіцце спакойным і раўнамерным.

Паспрабуйце расслабляльную позу матылька. Ляжце на спіну і злучыце ступні, сагнуўшы ногі. Калені старайцеся апусціць на падлогу. Рукі раскіньце па баках, далонямі ўгору, раскрываючы плечы і грудную клетку. Заплюшчыце вочы і павольна ўдыхайце праз нос, у галаве лічачы да чатырох. Затым гэтак жа павольна выдыхайце, лічачы назад да аднаго. Выконвайце практыкаванне да таго часу, пакуль не адчуеце сябе цалкам расслабленым. Звычайна гэта займае каля дзесяці хвілін.

## Крок шосты: стварыце сонную атмасферу

Адна з галоўных умоў спакойнага сну — цемра. Пры гэтым важна не толькі выключаць святло на ноч, але і прыглушаць у той час, калі вы яшчэ толькі рыхтуецеся да сну. Прыцемкі падаюць нашаму біялагічнаму гадзінніку сігнал аб тым, што пара засынаць, а яркае святло паведамляе: «Цяпер дзень, не спаць!». Таму асвятленне ў спальні павінна быць вельмі мяккім.

## І, нарэшце, крок сёмы: адключыце мабільны тэлефон

Трэба тэрмінова адправіць апошні электронны ліст перад тым, як можна будзе «афіцыйна выключыцца»? Лепш адкладзіце гэта на заўтра. Друкуючы ў ложку, вы прыводзіце нервовую сістэму ва ўзбуджаны стан, што, натуральна, перашкаджае спакойна заснуць. Наогул, лепш за ўсё адключыць ноўтбук за гадзіну да таго, як вы адправіцеся спаць. Тое ж самае датычыцца і смартфонаў. Такім чынам, калі вы хочаце добра выспацца, адключыце ўсе цуды сучаснай тэхнікі і прыбярыце іх падалей, лепш наогул у іншы пакой.

І яшчэ: абзавядзіцеся сапраўдным будзільнікам, бо той, што ёсць у вашым мабільніку, — дадатковае апраўданне для таго, каб трымаць тэлефон у межах дасягальнасці нават ноччу.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Прыміце да ведама

## СЭКСУАЛЬНАЯ АНАРЭКСІЯ ПРАГРЭСУЕ

**У сучасным грамадстве тэма сэксу даўно перастала быць забароненай. Пры гэтым у пасцелі ўсё большая колькасць людзей перастае зведваць жаданне.**

Як заяўляюць эксперты, у гэтай сітуацыі няма нічога дзіўнага. Такія паводзіны сучаснага чалавека з'яўляюцца ахоўнай рэакцыяй на сэксуальны тэрор, якому людзі пастаянна падвяргаюцца, піша MigNews.com.ua. Масавы псіхалагічна-сэксуальны гвалт спараджае адваротную рэакцыю, бо жаданне заўсёды звязанае з некаторай ступенню немагчымасці і недаступнасці. Псіхолагі называюць такую з'яву масавай сэксуальнай анарэксіяй. У адрозненне ад харчовай, сэксуальная анарэксія сама па сабе не выклікае якіх-небудзь захворванняў або змен у арганізме, небяспечных для здароўя і жыцця хворага.

Калі чалавек гадамі жыве «манахам» або «манашкай», магчыма, што ў яго сур'ёзныя праблемы — увогуле можа адсутнічаць натуральная патрэба ў інтымнай блізкасці. Існуюць людзі, якія лічаць, што такім чынам яны канцэнтруюць сваё жыццё. Яны лічаць за лепшае не мець ніякіх спраў з супрацьлеглым полам, цураюцца сэксу і робяць усё, каб справа не дайшла да блізкасці. Паводле іх меркавання, спыненне інтымных кантактаў азначае паляпшэнне іх жыцця.

Іншая форма сэксуальнай анарэксіі — гэта калі чалавек можа весці вельмі насычанае сэксуальнае жыццё, але толькі ў коле тых людзей, якія не будуць патрабаваць ад яго больш сур'ёзных стасункаў. Часам той, хто панічна баіцца сэксу, робіць выгляд, што закаханы ў кагосьці вельмі папулярнага — таго, хто ніколі не запатрабуе ад яго больш блізкай сувязі.

У любым выпадку, калі чалавек доўгі перыяд не зведвае любоўнай цягі і жадання заняцца сэксам, яму варта прааналізаваць свае адчуванні і высветліць прычыну такога стану. Пастаянныя стрэсы на працы, штодзённая бытавая руціна — усё гэта трэба пакідаць за межамі спальні, якая павінна стаць ціхай гаванню, вызваленай ад усіх пабочных праблем.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Жаночыя сакрэты

# 5 СПОСАБАЎ прафілактыкі маршчын

**З'яўленне маршчын не радуе прадстаўніц цудоўнага полу. Маршчынкі нагадваюць пра няўмольны бег часу.**

Пасля трыццаці многія жанчыны пачынаюць заўважаць у сябе першыя трывожныя прыкметы з'яўлення маршчын. У сорак гадоў праблема становіцца дастаткова сур'ёзнай. **Чаму ж у нас з'яўляюцца маршчыны? Ёсць некалькі прычын:**

- Узрост. З часам арганізм знижае выпрацоўку рэчываў, неабходных для падтрымання эластычнасці скуры. Часткова іх можна папоўніць шляхам касметычных працэдур і стараннага хатняга догляду твару. Але канчаткова спыніць працэс пакуль не пад сілу нават вучоным.
- Ультрафіялетавыя прамяні. Іх празмернасць выклікае дачаснае старэнне скуры.
- Забруджванне навакольнага асяроддзя. Шкодныя рэчывы ў атмасферы вельмі негатыўна ўплываюць на здароўе ў цэлым і на знешнасць у прыватнасці.
- Харчаванне. Недахоп вітаміну Е і жалеза прыводзіць да страты скурай эластычнасці.
- Курэнне. Шкодныя рэчывы ў тытуні дачасна стараць курцоў.
- Хуткая страта вагі. Калі за кароткі перыяд часу страціць вялікую колькасць кілаграмаў, скура пачынае абвісаць, і на ёй утвараюцца складкі і маршчынкі.

Каб адкласці з'яўленне маршчын, неабходна рабіць захады па прафілактыцы:

— ніколі не заставайцеся на сонцы, не нанёсшы на скуру спецыяльныя сонцаахоўныя сродкі. Не забывайце пра скуру шыі і рук;

— пастаянна ўвільгатняйце скуру твару і цела;

— піце больш вады, каб увільгатніць скуру знутры;

— адмоўцеся ад курэння;

— прытрымлівайцеся збалансаванага рацыёну харчавання, багатага на вітаміны і пажыўныя рэчывы. Асабліва неабходныя вітаміны А, С, Е і К, якія ўтрымліваюцца ў наступных прадуктах: пячонцы, яйках, моркве, шпінаце, брокалі, белакачаннай капусце, семках сланечніку, мігдалі, ільняным і аліўкавым алеі і інш.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Прафілактыка

# ТРЫМАЕМ СПІНКУ, СПАДАРЫ!

**Боль у спіне — з ім рана ці позна сутыкаюцца ўсе. Праўда, да першых прыкмет немачы многія ставяцца занадта бестурботна: маўляў, пабаліць — і перастане. Між тым, болі ў спіне з'яўляюцца па зусім розных прычынах, у тым ліку — як сімптом сур'ёзнага захворвання.**

Перш за ўсё, спіна можа балець з-за пазваночніка, асабліва калі ў вас сядзячая праца і адсутнічаюць фізічныя нагрузкі. Болі часта з'яўляюцца ў тых, хто па некалькі гадзін на дзень праводзіць за камп'ютарам або падоўгу стаіць на нагах. Калі не прымаць мераў, вашы мышцы могуць атрафіравацца, а з часам адбудзецца зрушэнне пазванкоў і зашчамленне карэньчыкаў спіннога мозга. І тады болі ў спіне стануць рэзкімі і нясцерпнымі. Часам гэта прыводзіць нават да частковай непрацаздольнасці, паколькі некаторыя віды работ чалавек ужо не можа выконваць.

Калі ваша праца звязаная з неабходнасцю доўга сядзець або стаяць на адным месцы, для прафілактыкі атрафіі пазваночніка старайцеся кожныя паўгадзіны выконваць размінку: прайдзіцеся па пакоі, а яшчэ лепш — зрабіце некалькі простых практыкаванняў для пазваночніка (нахілы наперад і ў бакі, прагін назад). Іх карысна выконваць штодня на працягу 10—15 хвілін.

Вам даводзіцца доўга стаяць? Старайцеся раўнамерна размяркоўваць вагу цела на абедзве нагі або, прынамсі, пераступаць з нагі на нагу. Калі падымаеце прадмет з падлогі, трымайце спіну прама. Пры пераносе цяжараў часцей спыняйцеся і перакладайце груз з адной рукі ў другую. Таксама не варта насіць абутак з абцасам вышэй за 4 см.

Звярніце ўвагу на ваш ложак — медыкі нездарма раяць спаць на цвёрдай паверхні. Падчас сну на вельмі мяккім матрацы ваш пазваночнік можа моцна прагінацца, што выклікае нагрузку на мышцы. Спачатку спіна за ноч стамляецца, а потым пачынае балець.

Боль у вобласці спіны можа паказваць і на няправільнае харчаванне. Так, недахоп мінеральных рэчываў — кальцыю, фосфару, калію і магнію — вядзе да астэапарозу, які робіць косці крохкімі. Таму ў рацыён неабходна рэгулярна ўключаць тлусты тварог, капусту, моркву, фасолю, гарох, рыс, буракі, грэцкія арэхі і фундук. А вось ужыванне ў ежу белага цукру, наадварот, варта пазбягаць: яго засваенне арганізмам патрабуе расходу карысных рэчываў і аслабляе пазваночнік.

Таксама варта памятаць, што далёка не заўсёды болевыя адчуванні ў спіне азначаюць праблемы менавіта з ёю — яны могуць быць звязаныя і з унутранымі органамі. Напрыклад, у левую частку спіны можа аддаваць сардэчны боль, а сімптомам неладоў з жоўцевым пузыром можа быць ныючы боль у правай частцы спіны.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 4 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць міксер, кухонную ЭЛ-машыну, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **7 кастрычніка 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 кастрычніка 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 снежня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 01.09.10 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 1.09.10 па 31.12.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1754 ад 27.08.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

## 5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** _____

_____

**Падпіска афармлена і аплачана ў** _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на IV кв. або 2-е паўг. 2010 года**

**Хатні адрас і тэлефон** _____ _____
(індэкс)

_____

_____

**Удачы ў розыгрышы!**

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____
Колькасць камплектаў _____

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету _____
(індэкс выдання)

**ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| ПВ | месяца | літар |
|---|---|---|
| | | |

Кошт: падпіскі _____ руб.; пераадрасоўкі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Транспартная філасофія

# УВАГА! ЗА РУЛЁМ ЗАБОЙЦА

З роднага Краснаполля прыйшла горкая навіна: у аўтакатастрофе загінуў мой аднакласнік. Дзімка. Весялун. Дабрак. Малады муж і тата. «Камаз» выехаў на сустрэчную паласу — і ўсё...

Я імгненна ўзгадваю сваю нядаўнюю аварыю, атаясамліваю сябе з ім. Восем месяцаў таму пад коламі аўто магла загінуць і я. У мяне абышлося. А ў яго — не.

80 адсоткаў аварый здараюцца па віне вадзіцеля. Як сведчыць Вікіпедыя, прыкладна 30 % ДТЗ адбываюцца з-за таго, што кіроўца знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. 25 % — з-за павелічэння хуткасці. Каля 15 % аварый здараюцца з-за парушэння правілаў праезду скрыжавання. І каля 10 % ДТЗ займае выезд на сустрэчную паласу руху.

Я еду ў грамадскім транспарце і наўмысна праз акно назіраю за кіроўцамі аўтамабіляў, якія праязджаюць міма. Займаюцца хто чым. Адна фарбуе вусны, пакуль стаіць на святлафоры; другая грызе нешта на ходу; трэцяя наталяе смагу, закрыўшы сабе агляд; чацвёртая нахілілася да дзіцяці, якое сядзіць побач, пятая адной рукой гартае часопіс. Мужчыны паляць за рулём, размаўляюць па тэлефоне, пішуць смс-кі. Да якога б аўтаматызму ні даходзіла кіраванне транспартным сродкам, які б стаж ні быў у вадзіцеля, — за дарогай увесь час трэба сачыць, быць уважлівым. Гэта работа, ад якой стамляешся, бо ўвесь час пад напружаннем. Нельга дазволіць мозгу расслабіцца, атрымаўшы дозу нікаціну, нельга пагрузіцца ў размову. Мяне абураюць умельцы, якія віртуозна круцяць абаранак і эмацыйна жэстыкулююць, падтрымліваючы размову з пасажырам, які сядзіць на заднім месцы. Ездзіла я нядаўна ў такой маршрутцы. Ён яшчэ, каб бачыць суразмоўцу, выварочвае шыю назад, ды на павароце! На заўвагі, як правіла, такія кіроўцы абураюцца: «Ты паездзі столькі, колькі я праехаў! Не падабаецца — выходзь!» і г. д.

Мой жаніх некалькі месяцаў назад набыў машыну і ездзіць з максімальнай асцярожнасцю, хоць правы атрымаў дзесяць гадоў таму. Сяргей не дазваляе ўключаць музыку, заводзіць гаворку, калі ён за рулём. Ён прапускае кожнага пешахода і спыняецца ўжо на жоўтае святло. І нават гэты ахайны кіроўца атрымаў штраф за перавышэнне хуткасці! Пры дазволеных 90 км/г па трасе ён едзе 80: мы не спяшаемся, няхай абганяюць, каму трэба (а трэба, аказваецца, многім!). І на сваіх 80 ён прапусціў знак 50 на трасе, за што і атрымаў штраф. Да такой незапланаванай растраты, як і да язды, хлопец ставіцца адказна: гэта папярэджанне, можа, аднекуль з Неба — трэба быць яшчэ больш уважлівым.

Нядаўна падвозіла мяне адна немаладая дама, якая ўжо стала свякроўю і чакае ўнукаў. Яна везла нявестку да доктара. Не аднойчы праскоквала на чырвонае святло (эх, не было на яе даішніка!). Нявестка жартам зрабіла заўвагу, а тая абурылася: «Для цябе стараюся — ты ж да доктара спазняешся!». Так можна і не да таго доктара трапіць, падумалася мне.

Малады чалавек клапоціцца пра свае грошы і піша на адным з форумаў: «Я ездзіў у Балгарыю і, не ведаючы, што за мной назіраюць відэакамеры, перавышаў хуткасць на машыне, якую ўзяў напракат. Ці варта разлічваць на тое, што мне прыйдуць штрафы ў Беларусь?» Вось гэта клопат пра сябе любага! Ключавыя словы тут: «не ведаючы, што за мной назіраюць відэакамеры, перавышаў хуткасць». Самае страшнае, што для такіх кіроўцаў галоўны назіральнік — інспектар ДАІ ці відэакамеры, а не ўласная бяспека.

Я перакананая, што давяраць аўто нельга любому ахвотнаму і здольнаму заплаціць пару мільёнаў за навучанне. Тут павінен быць ашчадны адбор, кастынг, калі хочаце. Будучых кіроўцаў трэба правяраць, як правяраюць будучых пажарных: на кемлівасць, уважлівасць, рэакцыю. Ёсць людзі — і такіх нямала — няздольныя вадзіць машыну. Рассеяныя па жыцці, няўважлівыя, якія ўвесь час забываюцца, куды паклалі свой пашпарт, і якія ненаўмысна кожны дзень б'юць посуд. Яны ездзяць за рулём. А таксама несумленныя, неабавязковыя, прыхільнікі алкаголю, імпульсіўныя, неўраўнаважаныя. І яны ездзяць за рулём. Толькі ў Мінску за 2009 год 39 аўтамабілістаў з тых, што трапілі ў аварыі, селі за руль без правоў. Па іх віне загінулі пяцёра і 47 чалавек атрымалі пашкоджанні.

Знаёмы маёй сяброўкі ехаў п'яны за рулём і на скрыжаванні збіў дзвюх дзяўчынак на веласіпедах. Адну — насмерць, другая засталася інвалідам. У яго нават правы не забралі. Ён і зараз ездзіць на тым жа аўтамабілі. Не здзіўлюся, калі па-ранейшаму «на грудзі прымае» за рулём.

Сеўшы ў машыну (я езджу выключна на пасажырскім месцы), я абавязкова перахрышчуся і супакою сваю трывогу: мы ездзім толькі па правілах. Але спакойней ад гэтага не становіцца. Мы ж кіруемся правіламі, а выедзе які-небудзь дурань на дарогу... Дарагія дурні, звяртаюся да вас: будзьце разумнымі, сачыце за дарогай, не парушайце правілы, думайце пра тых, хто едзе да сваіх любых, бацькоў, дзяцей. Дазвольце ім сустрэцца. Сачыце за спідометрам, дарогай. І беражыце сябе.

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**

Падарожныя нататкі

# МУЗЕЙ САЛЬВАДОРА ДАЛІ РАЗМЯСЦІЎСЯ Ў КУПАЛАЎСКІМ ТЭАТРЫ

**Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА даведаўся ў іспанскім Фігерасе, навошта вялікі мастак упрыгожыў свой тэатр-музей агромністымі яйкамі**

**Некалі сучаснікі сказалі пра французскага паэта Стэфана Малармэ: «Перакладаць яго з французскай? Ды вы спачатку перакладзіце з ягонай мовы на французскую!» Пра тое, як перакласці мастацтва Сальвадора Далі на газетную мову, я думаю, гледзячы за акно электрычкі, якая імчыць мяне з хуткасцю 150 кіламетраў за гадзіну з Барселоны ў родны горад Далі — Фігерас.**

Агульны выгляд музея.

## «У шэсць гадоў я хацеў стаць кухаркай, у сем — Напалеонам»

Сальвадор Далі нарадзіўся ў Фігерасе ў 1904 годзе. З дзяцінства хлопчык адрозніваўся ад астатніх. Пазней мастак пачне свой літаратурны дзённік «Маё таемнае жыццё» згадкай: «У шэсць гадоў я хацеў стаць кухаркай, у сем — Напалеонам». Свае іншыя ўспаміны Далі назаве проста — «Дзённік генія».

Цягам жыцця мастак праславіўся не толькі сваім талентам стварэння карцін, але і талентам эпатажу. Калі студэнта Сальвадора Далі выключылі за грэблівае стаўленне да выкладчыкаў з мастацкай акадэміі, Далі паабяцаў, што вернецца ў гэтыя сцены пераможцам. Так і сталася: праз гады, калі Далі ўжо быў сусветна вядомым мастаком, ён прыехаў чытаць сюды лекцыю ў белым лімузіне, запоўненым качанамі капусты.

У свой час Далі паспеў пажыць у Парыжы і Амерыцы, аднак Фігерас заўжды заставаўся радзімай ягонай душы. У 1961 годзе Сальвадор дамаўляецца з уладамі Фігераса і ідзе ва-банк: на ўсе свае ашчаджэнні выкупляе напаўразбураны і спалены будынак былога гарадскога тэатра, каб стварыць тут свой уласны тэатр-музей. 28 верасня 1974 года Тэатр-музей Сальвадора Далі быў афіцыйна адчынены.

## Хуткасць — 150 км/г

Квіток да Фігераса табе прадалі на барселонскім вакзале Сантс за 12,85 еўра — на тваёй Радзіме гэта крыху больш за 50 тысяч рублёў. Ад Барселоны да Фігераса 140 кіламетраў, але хуткасная электрычка, праз вялікую колькасць прыпынкаў, едзе іх 2 гадзіны. Іспанскія электрычкі ў параўнанні з беларускімі выглядаюць як касмічны карабель у параўнанні з «Запарожцам». Ты дарэмна зараджаў ноўтбук у барселонскім хостэлі — каля кожнага сядзення ёсць персанальная разетка. І яна нават працуе. Ты глядзіш на горы за шыбай і згадваеш, куды цябе паслала правадніца ўдасканаленай (з мяккімі сядзеннямі і тэлевізарам) электрычкі Брэст-Мінск на просьбу ўключыць адзіную на ўвесь вагон разетку. Электрычка ідзе мякка, усе вагоны з кандыцыянерамі. За працаю час мінае хутка.



Галоўны фасад: ну чым вам не Купалаўскі тэатр?

«Імжыстае таксі».

— Ці гэта ўжо Фігерас? — пытаецца ў цябе па-свойму прывабная іспанка.

Ты, усцешаны, што цябе прынялі за мясцовага, адказваеш ёй:

— Сі!

Куды ісці з вакзала, ты ведаеш — папярэдне раздрукаваўшы з інтэрнэта падрабязны аповед аднае дзяўчыны, якая ўжо бывала тут. Мінуўшы два кварталы, выходзіш на Рамблу — так, бадай, у кожным тутэйшым горадзе называецца галоўны бульвар. Прадавец латарэйных білетаў на тваю просьбу падказаць дарогу да музея ажно падскоквае і, махаючы рукамі, падрабязна тлумачыць, што да мэты зусім недалёка. Бы міннае поле, ты мінаеш вулачку каля музея, напоўненую сувенірнымі крамамі, — і бачыш перад сабой

## Купалаўскі тэатр

Ты трасеш галавой і думаеш, што іспанскае сонца занадта актыўна грэла тваю патыліцу. Расплюшчваеш вочы. Ды не, так і ёсць: перад табой — будынак Купалаўскага тэатра. Толькі не ружовы, а шэра-малочны. І не зняважаны савецкімі перабудовамі, а ў першасным выглядзе. А зверху напісана: «Тэатр-музей Сальвадора Далі».

Ты чытаеш каля ўвахода, што гэты будынак з'явіўся тут у 1850 годзе намаганнямі архітэктара Жазэ Рока-і-Броса. І згадваеш тым часам, што Купалаўскі тэатр адкрыўся ўсяго на 40 гадоў пазней — можна сказаць, адна эпоха. Твой мінскі патрыятызм усцешаны неверагодна — 120 гадоў таму на тваёй Радзіме трымалі нос па ветры, практычна паспяваючы за агульнаеўрапейскай модай!

З бакавой сцяны на цябе паглядае барадаты мужык з тэлевізарам у ілбе. На даху расстаўленыя залацістыя манекены — адны з мыліцамі ў руках, іншыя з батонам на галовах, кутнія трымаюць у руках атам вадароду. А над уваходам стаіць вадалаз. Ты таксама рыхтуешся трапіць у самую глыбіню мастацтва Сальвадора Далі.

## Хто хоча патаптацца па магіле Далі?

Магіла Далі зверху і знізу.

Аддаючы 11 еўра на ўваходзе ў музей, ты ціха радуешся, што касірка Купалаўскага тэатра Леакадзія Іосіфаўна бярэ з тэатралаў нашмат меншыя грошы. Ва ўнутраным дворыку музея, які раней служыў партэрам, і дагэтуль тырчаць са сцен абгарэлыя бэлькі — рэшткі колішняга пажару. Далі забараніў іх прыбіраць — і паступова яны сталі адным з экспанатаў. Пасярод дворыка стаіць шыкоўны старадаўні «Кадылак», за стырном якога сядзіць манекен, а на галаву яму з жалезных трубачак ліецца вада. Гэта інсталяцыя «Імжыстае таксі», якую Далі стварыў да Сусветнай выставы сюррэалізму 1938 года ў Парыжы, а пазней змясціў тут. Дадаўшы колькі дэталяў — «Вялікую Эсфір» Эрнста Фукса на капоце (пышная мадам з формамі Вілендорфскай Венеры), якая за ланцугі цягне калону Траяна з аўтамабільных пакрышак, лодкай Гала наверсе, дапрацаваным Далі «Рабом» Мікеланджэла і чорным парасонам наверсе. Сам Далі называў усё гэта, ні многа ні мала, «найвялікшым сюррэалістычным помнікам у свеце».

З партэра ты падымаешся на сцэну — у самую вялікую залу музея. Яна накрытая неверагодным купалам — шкляным шарам, які быў створаны ў 1969 годзе Энрыке Перэсам Пінэйра. Гэты купал стаў своеасаблівым сімвалам Тэатра-музея і нават усяго Фігераса.

Разам з табой у музей заходзіць група рускамоўных людзей. Па размове ты здагадваешся, што да спадарыні, якая жыве тут, прыехалі госці — і яна ўзялася паказаць ім гэты тэатр-музей. Адзін з гасцей, разглядаючы творы, пытаецца, калі памёр Далі. Жанчынка адказвае:

— Ведаеш, не так даўно, ужо ў дваццатым стагоддзі!..

Згадваючы, што Далі нарадзіўся ў 1904, а памёр у 1989 годзе, ты дзівішся, што чалавек, які памёр усяго 21 год таму, так хутка паспеў стаць вечнасцю.

Сярод экспанатаў хола — выява аголенай Галы (жонка і муза мастака). Цалкам карціна завецца «Аголеная Гала, якая глядзіць на мора і на адлегласці ў 18 метраў трансфармуецца ў партрэт Аўраама Лінкальна». Усё слушна: стаіш блізка — бачыш голую Галу, адыходзіш далей — на цябе глядзіць шаснаццаты прэзідэнт Амерыкі. Гэтая праца — сведчанне захаплення Далі дакладнымі навукамі. Карціна створана ў 1975 годзе, паводле аблічбаванага партрэта Лінкальна, які выканаў праграміст Леон Хармон.

Іншы экспанат — вяршыня тэлеграфнага слупа са шклянымі шашачкамі. Далі сцвярджаў, што праз шмат гадоў гэты слуп выкліча неймаверную цікавасць у археолагаў.

А дзе ж галоўны экспанат сцэны? А вось, па ім якраз топчуцца цікаўныя наведнікі, фатаграфуючы ўсё наўкол. У цэнтры былой сцэны, пад плітой без ніводнага надпісу пахаваны Сальвадор Далі.

## Зала Скарбаў

Так сам Далі назваў першую ж залу са сваімі карцінамі. І гэта праўда скарб. Такая магчымасць пабачыць сусветна вядомыя творы мастака ў арыгіналах! «Кошык з хлебам» (1945), «Атамная Леда» (1949), «Гала са спіны, якая глядзіць у нябачнае люстэрка» (1960), «Прывід сэксуальнай прывабнасці» (1934). Трэба адзначыць, што, паводле жадання самога Далі, у ягоным тэатры-музеі не павінна быць экскурсаводаў. Запавет выконваецца — тут ёсць толькі наглядчыкі і ахоўнікі, якія пачынаюць размаўляць, толькі калі ў іх нешта запытацца. Ты, дагэтуль не верачы сваім вачам, запытаешся ў прывабнай ахоўніцы, ці сапраўды гэта арыгіналы карцін. Яна пацвярджае, што гэта не сон.

Славутая «Атамная Леда».

Сцены залы абшытыя мяккім чырвоным аксамітам (ты не ўтрымаўся і памацаў), нібыта скрыначка для ювелірных упрыгажэнняў. Карціны тут развесіў сам Далі, парушаючы храналагічную паслядоўнасць, акцэнтуючы тым самым найважнейшыя моманты і вобразы ўласнай творчасці. Дарэчы, менавіта «Кошык з хлебам», які вісіць у цэнтры, найбольш выбіваецца з агульнага шэрагу. Стол, кошык і паўбуханкі хлеба — ніякага табе сюррэалізму. Аднак сам мастак зазначаў: «Гэтая тыпова рэалістычная праца, так сталася, больш за ўсё астатняе задаволіла маю фантазію».

Каб даць магчымасць і табе адчуць падобнае задавальненне, Далі паставіў пад карцінай той самы кошык з тым самым акрайцам хлеба (ці такія ж самыя — прынамсі, вельмі падобныя). Хлеб для пераканаўчасці пакрыты залатой фарбай. Да тэмы хлеба Далі вярнуўся і пры вонкавым аздабленні музея. Але пра гэта — крышачку пазней.

## Паміж ног у вярблюда «Кэмэл»

Перад табой праплываюць адна за другой арыгіналы карцін Сальвадора Далі, якія ты бачыў у падручніках, альбомах і інтэрнэце. Сам факт гэтага — ужо сюррэалізм, не кажучы нават пра змест работ.

У крыпце тэатра-музея ты бачыш намагільную пліту мастака. Менавіта тут, на сцяне, ён дазволіў напісаць сваё імя і гады жыцця, зрабіўшы тую самую чыстую пліту наверсе адным з галоўных экспанатаў музея. Ты пачынаеш пабойвацца, што зараз, у адной з залаў, ты пабачыш і ўласна забальзамаванае цела мастака, але на гэта, дзякаваць Богу, Далі не пайшоў.

Бадай, самая славутая зала тут — Зала Мэй Уэст. Гэта — паўтор трохмернай кампазіцыі мастака, якая экспануецца ў Інстытуце Мастацтва Чыкага. На сцяне — дзве карціны з рознымі сюжэтамі. Ніжэй — камін на два агні. Перад ім — канапа ў форме жаночых вуснаў, якую атачаюць залацістыя гардзіны. Пры сцяне насупраць — драбіна. Ты ўзлазіш наверх і апынаешся паміж ног у вярблюда. Ды не абы-якога, а таго самага, што стаў прататыпам для выявы на папіросах «Кэмэл». Да бруха вярблюда падвешаная лупа. Глядзіш у яе — і карціны пераўтвараюцца ў вочы, камін — у нос, канапа — у вусны, а гардзіны — у валасы. Усё разам — жаночы твар, які называецца «Твар Мэй Уэст, які можа выкарыстоўвацца як пакой». Ты думаеш, што з неахвотай пагадзіўся б, каб твой твар выкарыстоўвалі як пакой, — і рушыш далей.

## Сны, мроі і галюцынацыі

Перад табой узнікаюць усё новыя і новыя хрэстаматыйныя творы мастака. Вось аб'ёмны «Рэтраспектыўны жаночы бюст» — цыцкастая мадам з батонам на галаве і кукурузамі на шыі. Вось Венера, цела якой складаецца з высунутых шуфлядак. Вось «Касмічныя атлеты», якія сталі вестуном цэлага кірунку мастацтва XX стагоддзя — поп-арту.

Ты не імкнешся цалкам разгадаць сэнс усіх прац. Сам Далі казаў: «Насамрэч я ўсяго толькі аўтамат, які адасоблена і максімальна дакладна рэгіструе тое, што дыктуе мне мая падсвядомасць: сны, мроі, галюцынацыі і любыя надзеленыя канкрэтнай формай ірацыянальныя праявы цёмнага хвалюючага свету, адкрытага Фрэйдам... Глядач павінен атрымліваць насалоду ад бязмежных магчымасцяў таямніц і загадак, якія прапануюць гэтыя вобразы яго падсвядомасці».

Твая падсвядомасць пераўтвараецца ў фасолевы суп, дзе ёсць бобкі нейкага сэнсу, а ўсё астатняе — суцэльная маса, у якой будзе разбірацца твой страўнік.

З гэтага супу ты адрозніваеш спальню Далі з неверагодным ложкам, які мае ножкі — лапы цмока. Канапу, якую размаляваў сам маэстра (пазней ты з задавальненнем пабачыш здымак, дзе ён сам сядзіць на гэтай канапе). Аголеную дзяўчыну — гіперрэалістычны манекен працы Джона дэ Андрэа. Настолькі гіперрэалістычны, што табе карціць запытацца, колькі плацяць гэтай прыгажуні.

Каля некаторых аб'ёмных экспанатаў усталяваныя апараты для прыёму манет. Кідаеш манетку — і запальваецца святло, экспанат пачынае рухацца. Так 11 еўра за ўваходны квіток можа плаўна пераўтварыцца ў дваццаць. У Далі на карціне гадзіннікі перацякалі грані і галіны дрэва, а ў кемлівых музейшчыкаў адна сума еўра такім чынам перацякае ў іншую.

Асобная частка музея прысвечаная трохмерным працам мастака. Далі з дзяцінства захапляўся аптычнымі ілюзіямі і з'явамі, таму стварыў цэлую серыю такіх работ. Кожная з іх складаецца з дзвюх карцін, практычна аднолькавых. Яны змешчаныя ў скрыню, на дзве бакавыя панэлі пад пэўным вуглом. Пасярэдзіне скрыні трохвугольнікам усталяванае люстэрка. Так, што адна карціна адбіваецца ў адной бачыне, другая — у наступнай. Каля скрыні — інструкцыя: прытулі нос да шкла і глядзі ў люстэрка. Ты прытуляеш нос у самае запэцканае месца шкла — і карціна запраўды робіцца аб'ёмнай! Рэчы, здаецца, пачынаюць ажываць, твая свядомасць, падманутая вачыма, пачынае іх мацаць.

## Што вы памятаеце з жывата мамы?

Твая галава робіцца падобнай да шэйкера, у якой бармен касмічнага карабля перамяшаў усё цюбікі з напоямі на борце. Ты аглядаеш Тэатр-музей звонку, з іншага боку. Чырвоная сцяна ў шахматным парадку ўпрыгожаная злепкамі каталонскага хлеба. На даху — гіганцкія яйкі. Далі казаў, што яйкі сімвалізуюць нараджэнне, а яешня атаясамляецца з успамінамі з жывата мамы. Увогуле, Далі ў сваёй творчасці надаваў асаблівае значэнне ўсяму ядомаму і казаў: «Прыгажосць ці будзе ядомай, ці ёй увогуле не быць».

На Рамбле ты патрапляеш з неба на зямлю — такія сабе Дажынкі ў Фігерасе, свята хлеба і вінаграда. Табе прапануюць набыць квіток за 7 еўра — і дэгуставаць дзясяткі гатункаў віна, што тут ёсць. Аднак нашто табе віно, калі ты толькі што быў у Тэатры-музеі Далі?

Зала Мэй Уэст: агульны выгляд і выгляд праз лупу між ног вярблюда.

Ты ідзеш на вакзал, моцна сумнеючыся, што ён табе не прымроіўся.

У электрычцы хлопец з чорнымі барабаннымі палачкамі просіць цябе падсілкаваць свой MP3-плэер з твайго ноўтбука. А пасля распавядае табе, як нядаўна сядзеў у каталажцы ў Францыі.

Ты пачынаеш верыць у тое, што гэты хлопец сапраўды быў, толькі ў Барселоне, калі знаходзіш на ноўтбуку песні, якія ты перапісаў з ягонага плэера.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**
*Барселона—Фігерас.*

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА IV КВАРТАЛ 2010 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Беларусь — Чарнобылю

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ | СВАЯ СПРАВА | ЖЫРАНДОЛЯ | ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА | КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ | Край здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 12 400 рублёў на месяц<br>74 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 11 600 рублёў на месяц<br>69 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 19 900 рублёў на месяц<br>119 400 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 18 000 рублёў на месяц<br>108 000 рублёў на паўгоддзе |
| ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук») | | |
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9 700—11 180 рублёў на месяц<br>58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 940—10 430 рублёў на месяц<br>53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 13 134—14 080 рублёў на месяц<br>78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12 230—13 170 рублёў на месяц<br>73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе |

* Залежыць ад рэгіёна

Ну і ну!

## РЫБУ НЕ ПАСПЕЛІ ПАДЗЯЛІЦЬ

**Калі супрацоўнікі міжрайінспекцыі ноччу тармазнулі ў адным кіламетры ад ААТ «Рыбгас»Лактышы» (Ганцавіцкі раён) аўтамабіль «Сеат Таледо», то знайшлі ў ім 270 кг рыбы і сеткі даўжынёю 200 метраў.**

Гаспадар аўтамашыны, слесар Клецкага РЖКГ, заявіў, што рыбу ён лавіў разам з 5 жыхарамі в. Завостравечча. Рыбу вярнулі рыбгасу, матэрыяльную шкоду ацанілі ў 1,7 млн рублёў, і цяпер стаіць пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

## ЛЕСНІКУ ЗАХАЦЕЛАСЯ ВЫПІЦЬ?

**У лесе на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», каля в. Попелева, супрацоўнікамі міліцыі быў выяўлены міні-завод па вырабе гаршчэлкі і 2,5 тоны брагі пры ім.**

Устаноўлена, што пакаштаваць гаршчэлкі вырашыў мясцовы ляснік са сваёй жонкай.

## БУЛЬБУ ВЯРНУЛІ, АЛЕ НЕ ЎСЮ

**Гаспадар фермерскай гаспадаркі « Агравеснік» убачыў у сцяне склада, які знаходзіцца непадалёку ад в. Крошын (Баранавіцкі раён), дзірку і выклікаў міліцыю, бо праз гэты пралом невядомыя выцягнулі амаль дзве тоны бульбы.**

Неўзабаве аператыўнікі выйшлі на зладзеяў. Бульбу выкралі мясцовыя жыхары — жывёлавод СВК «Крошын» і рабочы ПМК-1. Частку ўкрадзенага вярнулі фермеру.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ПАЙШОЎ НА ПТУШКУ, А ЗАСТРЭЛІЎ ЛАСЯ

**У паляўнічых угоддзях каля вёскі Камена Вілейскага раёна былі знойдзены рэшткі тушы лася.**

Міліцыянеры з Вілейкі знайшлі побач з адным з дамоў у названай вёсцы аўтамашыну «Аўдзі». У ёй былі сляды крыві і нож — таксама са слядамі крыві. Уладальнік аўтамашыны — муляр ТАА «Радуга-буд» — прызнаўся, што, знаходзячыся на паляванні на вадаплаўную птушку, ён раніцай незаконна здабыў лася, разабраў яго, пагрузіў мяса ў сваю машыну і прывёз дадому. У парушальніка канфіскаваныя паляўнічая стрэльба, патроны і мяса дзічыны. Шкода прыродным рэсурсам ацэнена ў больш чым 3,3 мільёна рублёў. У дадатак супраць браканьера можа быць узбуджана крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Будзьце больш простымі — і міліцыя да вас пацягнецца!»

## ПРЫГАЖОСЦЬ І МУЖНАСЦЬ СУМЯШЧАЮЦЦА

**«Будзьце прасцейшымі, і міліцыя да вас пацягнецца», — жартаваў адзін з вядучых акцыі «Акадэмія МУС запрашае сяброў» Арцём Круговіч. Усе прысутныя ўсміхаліся, аднак міжволі закрадвалася думка: «Якая ж прастата патрэбна, каб табой зацікавілася міліцыя?..» Раней супрацоўнікі ўнутраных органаў па вялікіх святах толькі патрулявалі і ахоўвалі спакой грамадства. Аднак настаў час змяніць і гэта! На Дзень горада Мінска, які адзначаўся 11 верасня, курсанты і афіцэры Акадэміі МУС не толькі змаглі адпачыць, але і самі апынуліся пад пільнай увагай гледачоў.**

Міліцэйскае вяселле — вось чым распачалася іх праграма. Курсант Маргарыта Гаўрова і старшы інспектар штаба МУС Павел Сідарэнкаў разам падняліся на сцэну, сфатаграфаваліся, атрымалі кветкі, а пасля накіраваліся прама ў ЗАГС. Маладыя не выпадкова вырашылі пабрацца шлюбам такім чынам. Абодва ганарацца тым, што служаць у органах унутраных спраў і працягваюць сямейныя традыцыі.

У гэты дзень курсанты і іх афіцэры не толькі спявалі і танцавалі. Былі і выступленні каманды па рукапашным боі. Сярод мужных хлопцаў былі і тры сімпатычныя дзяўчыны. Гледзячы на іх, доўгавалосых, апранутых у чорную форму, станавілася зразумела: «Прыгажосць і мужнасць сумяшчальныя». Пацвердзілі гэта і Дар'я Анацка з Арцёмам Юхнікам з рыцарскага клуба, якія паказвалі шоу з мячом. Ужо некалькі гадоў у Акадэміі існуе такі клуб. Курсанты, якія раней займаліся гэтым у Міры, Нясвіжы, дзеляцца майстэрствам і ствараюць сучасныя, негістарычныя пастаноўкі.

Тут можна было даведацца і пра тое, што такое, напрыклад, дактыласкапія. Аказваецца, гэта счытванне па адбітках рук, ног асобы чалавека. Рабіць такое можна і па мочках вушэй, ілбе, шчоках. У Беларусі такіх звестак няма на дзесяць-пятнадцаць адсоткаў насельніцтва. Ужо пачалі стварацца пашпарты са спецыяльнай ламінаванай старонкай, якая абавязкова змяшчае такія звесткі. Нашы маракі ўжо карыстаюцца такімі дакументамі, дзейнічаюць яны і па ўсёй Еўропе. У краіне такія пашпарты толькі пачынаюць уводзіцца. Але, калі вырашыце змяніць свой дакумент праз пару гадоў, то цалкам магчыма, што ён ужо будзе зроблены па новым узоры.

Наведвальнікі спрабавалі стварыць фотаробат сваіх знаёмых. У следчай дзейнасці яго складанне адбываецца па рысах твару, якія называе сведка. Пасля завяршэння працы фотаробат уводзіцца ў базу звестак, дзе ён счытваецца, і кола падазроных асобаў значна змяншаецца.

Найбольш цікавай была праверка сапраўднасці грошай і пашпартоў. Аказваецца, у нашых пашпартах ёсць мікратэкст, які разгледзець можна толькі пры моцным павелічэнні. А на пустых старонках паміж арнаментам выразна бачныя лісты папараці. Што ж датычыцца доларaў, то іх сапраўднасць вызначаецца па светавых палях, мікратэксце і шурпатасці каўняра асобаў, што на іх выяўлены. Часам махлярам удаецца стварыць суперпадробкі. У іх зроблены ўсе сістэмы аховы, захавана тэхніка друку. Аднак дакладна перадаць усе рысачкі, палоскі малюнка, якія прыходзіцца вывучаць з мікраскопам, немагчыма. У Беларусі такія суперпадробкі трапляюцца зусім рэдка, дзесьці дзве на вобласць за год.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Курсант кафедры крыміналістыкі Зміцер Гвоздзь расказаў нам, што змяшчае «сакрэтны» чамаданчык крыміналіста:

— Гэты набор — стандартны набор спецыяліста, які ён бярэ з сабой, калі выязджае на месца здарэння. У ім знаходзяцца прадметы, з дапамогай якіх ён можа знаходзіць улікі, збіраць іх і фіксаваць. Тут ёсць парашок, які наносіцца з дапамогай пэндзляў. Калі мы знаходзім след, то спачатку ачышчаем яго. Ёсць і спецыяльная плёнка, на якую гэты след можа быць перанесены. Біялагічныя ўлікі, такія як сліна, кроплі крыві, збіраюцца з дапамогай шкельцаў. Ёсць футляры, каб складаць у іх валасы, пазногці. Вось паста, якую мы заліваем у сляды пасля ўзломаў і робім злепак. Лупа ёсць таксама, каб знаходзіць сляды. Каб не пакінуць сваіх адбіткаў — пальчаткі. Сантыметровая рулетка для таго, каб мераць адлегласць ад прадметаў, што акаляюць след. Пінцэты для дробных прадметаў. Таксама рыдлёвачкі для стварэння злепка. Яшчэ інструменты для таго, каб самім рабіць злепкі: стамескі, малаткі, пласкагубцы. Лобзік ручны, каб выпільваць след. Таксама розныя кнігі, часопісы, фольга — для таго, каб збіраць пахі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# ХОЧАШ НЕШТА АТРЫМАЦЬ? ПЕРАСТАНЬ ТАГО ЖАДАЦЬ!

**Згодна з законам бутэрброда, гэты самы бутэрброд заўсёды падае намазаным бокам уніз. І, на жаль, гэтае непрыемнае правіла, якое ў народзе яшчэ называюць «законам подласці», спрацоўвае не толькі з прадуктамі харчавання, але і з куды больш сур'ёзнымі рэчамі (вечарынай, на якую вельмі важна патрапіць, павышэннем па службе, якое так хочацца атрымаць, з «мужчынам мары», які ў вашых снах прапануе вам руку і сэрца, і г.д.). Па законе бутэрброда, на лёсавызначальнай вечарыне вы пацерпіце фіяска, павышэнне па службе вас абміне, «мужчына мары» пабярэцца шлюбам з іншай.**

Цікава, што псіхолагі закон подласці называюць законам касмічнай гармоніі і лічаць яго абсалютна справядлівым. «Іскрай», якая прыводзіць «рухавік» у дзеянне, з'яўляецца палкае жаданне. Бутэрброд, які намазваюць у спакойным стане душы, тлумачаць псіхолагі, нікуды не падае. Іншая справа, калі яго мазаць паспешліва, сквапна, быццам у некага адабраўшы, дрыготкімі рукамі і з адзіным жаданнем — як мага хутчэй праглынуць. Усё, чаго хочацца занадта моцна, падае з рук. Асабліва, калі гэта не просты сэндвіч, а палкая мара. Напрыклад, закрытая вечарына, куды НУ ВЕЛЬМІ ХОЧАЦЦА патрапіць.

Палымянае — на мяжы вар'яцтва — жаданне з'яўляецца тады, калі мозг малюе карціну выдатных перспектыў (весялосці, драйва, карысных і прыемных знаёмстваў, папулярнасці і кахання). Варта звярнуць увагу на тое, што моцнае жаданне звязана з перажываннем эмоцый у крэдыт. А як вядома, крэдыт чалавек бярэ толькі тады, калі ў яго не хапае сваіх сродкаў. Мы малюем карціну будучага шчасця, калі адчуваем эмацыйны голад. І калі б у нас было шмат цікавых спраў, запрашэнняў і прапаноў, мы б не рваліся так на гэтую вечарыну, а сумняваліся: ці варта туды ісці ўвогуле?..

Калі ў чалавека ўсё добра, ён не марыць пра нешта, не малюе ілюзорных карцін, не перажывае палкага жадання ўхапіць менавіта ГЭТА, бо перад ім разгорнута шмат розных перспектыў. Палкае, шалёнае, нястрымнае жаданне — сведчанне энергетычнай няўстойлівасці, душэўнага «голаду», адсутнасці рэсурсаў. Чалавека ў такім стане вельмі лёгка вывесці з раўнавагі, загнаць у кут, выбіць глебу з-пад ног. Калі вы некуды імкняцеся з марай пра тое, што ТАМ абавязкова будзеце шчаслівыя, то закон бутэрброда цалкам гэта абвергне. На доўгачаканай вечарыне жанчына ў прадчуванні шчаслівага знаёмства займае пазіцыю чакання і, не атрымаўшы ўвагі з боку патэнцыйных кавалераў, пачынае паводзіць сябе неадэкватна (становіцца абсалютна прыгнечанай ці занадта шумнай, забіваецца ў куток ці правакуе канфлікт). У любым выпадку ёй будзе цяжка трымаць сябе спакойна і ўпэўнена, каб прыцягнуць станоўчую ўвагу. Жанчына, якая прыйшла на вечарыну без спадзяванняў на «лёсавызначальную сустрэчу», знаходзіцца ў расслабленым і псіхалагічна ўстойлівым стане, яна здольная падтрымаць гутарку з новым знаёмым і мае ў сто разоў больш шанцаў выдатна правесці вечар і завесці карысныя знаёмствы...

Тое ж тычыцца і павышэння па службе. Месца, пра якое вы палка марыце, хутчэй за ўсё, не стане вашым... Пасада, якой вы сапраўды адпавядаеце, не можа быць марай, бо з'яўляецца бліжэйшай рэальнасцю. Хутчэй за ўсё, вы бачыце ўсе мінусы і нязручнасці, звязаныя з гэтым месцам працы, і таму нястрымна яго жадаць не станеце. Калі вы і марыце пра нешта, дык гэта пра штосьці значна больш прэстыжнае, чым гэтая пасада.

Залішняя апантанасць жаданнем сведчыць пра тое, што мы ідэалізуем аб'ект жадання, не маем рэальнага ўяўлення пра яго, а значыць, не зможам знайсці правільны падыход да рэалізацыі сваёй мары.

Дзеянне закона бутэрброда распаўсюджваецца і на сферу асабістых адносінаў. Калі ваш аб'ект кахання хоча з вамі ажаніцца, наўрад ці вы будзеце гэтага палка жадаць. Нават калі вы кахаеце яго, узаемнасць зробіць вас празважлівай. Вы адчуеце, што такая прапанова можа прагучаць, і загадзя станеце аналізаваць верагодныя «падводныя камяні» вашага будучага сумеснага жыцця (хто будзе выкідаць смецце, ці атрымаецца пазбегнуць канфліктаў з яго мамай, ці не надакучыць яму сэкс з вамі пяць пару гадоў, які з яго атрымаецца тата і г.д.). Нават калі вы хочаце выйсці за гэтага чалавека замуж, думкі пра верагодныя праблемы і пэўная занепакоенасць будуць прысутнічаць. І гэтая акалічнасць засцеражэ вас ад апантанасці жаданнем. Вашае жаданне застанецца ў межах разумнага.

Адсутнасць залішняй палкасці жадання азначае — апроч усяго іншага — яго адэкватнасць. Вы не прагнеце шлюбу з тым, каму не падыходзіце і хто вас не варты, з кім у вас мала агульнага. Вы — такі ж падарунак для свайго абранніка, як і ён для вас, таму палкім, нястрымным марам у такіх стасунках проста няма месца. «Мужчына мары» марай і застанецца. Вопытная жанчына разумее яго недасягальнасць. Нават калі гэтая «мара» часам праводзіць ночы ў яе ложку. Яго так і трэба ўспрымаць — як «мужчыну мары», а не як патэнцыйнага кандыдата ў жаніхі. Прызнайце, што ваша мара не мае ніякага дачынення да рэальнасці, і «адпусціце сітуацыю».

Як сцвярджаюць псіхолагі, закон бутэрброда можна выкарыстаць на сваю карысць. Па-першае, трэба своечасова выявіць жаданне, якое стала для вас idee fixe, і ператварыць маніякальную апантанасць ва ўмеранае жаданне.

Як толькі вы пачняце СПАКОЙНА жадаць трапіць на вечарыну, атрымаць павышэнне па службе ці звязаць сваё жыццё з канкрэтным чалавекам, гэта стане сігналам для вышэйшай інстанцыі, што жаданне цалкам рэальнае, а значыць, выканальнае. Для таго, каб знізіць градус жадання, варта зірнуць на аб'ект ці сітуацыю больш рэалістычна. Калі гэта доўгачаканая вечарына, уявіце, што там будзе шмат незнаёмых вам людзей, занятых сабой, а не вамі, што весяліць вас ніхто не збіраецца, а вось сапсаваць настрой — выпадкова ці наўмысна — можа любы. Прадумайце, чым лепш заняцца перад вечарынай, каб прыйсці туды не галодным на эмоцыі, а «сытым» і дзелавым.

Падрыхтуйце «тыл» — некалькі варыянтаў баўлення часу на вечарыне, калі ніхто з прысутных не захоча аказаць вам падтрымку, узгадайце нешта прыемнае і цікавае, што зможа павысіць ваш настрой. Карацей, не ўспрымайце сваю ілюзію сур'ёзна, развейце яе. Без падсілкавання ілюзіяй ваша жаданне стане значна меншым, а раўнавага — большай. У такім настроі вечарына — згодна з законам балансу — пройдзе выдатна.

Калі вы хочаце атрымаць пасаду ці аб'ект кахання, псіхолагі раяць паступаць такім жа чынам. Падумайце пра тое, што, магчыма, вы зусім не падыходзіце адно адначу. І ў пасады, і ў каханага можа выявіцца шмат мінусаў, пра якія вам пакуль невядома, але з якімі вы не зможаце змірыцца і ўжыцца. Гэта панізіць градус вашага жадання. Не канцэнтруйцеся на нейкім адным жаданні, падтрымлівайце сябе іншымі інтарэсамі, знайдзіце як мага больш «пунктаў апоры» — гэта зменшыць накал і дадасць вам сілаў. А ў такім энергетычна правільным стане вам будзе лёгка ўбачыць, што можна і трэба зрабіць, каб атрымаць жаданае. Адначасова вы перастанеце баяцца яго ўпусціць і пачняце «мазаць бутэрброды» няспешна, а з'ядаць — прыгожа, без мітусні, не губляючы ні крошкі.

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**

## У БАЛОТАХ ІРЛАНДЫІ ЗНАЙШЛІ ПСАЛТЫР ІХ СТАГОДДЗЯ

**Старажытную кнігу знайшлі ў тарфяным балоце падчас экскаватарных работ. Кніга была ў разгорнутым выглядзе, яна налічвае каля 20 старонак і датуецца IX—XI стагоддзямі.**

Кніга мае вялікі фармат: на адной старонцы псалтыра змешчана каля 40 тысяч вершаў на латыні. І, як адзначаюць даследчыкі, напісаныя на пергаменце фрагменты Бібліі знаходзяцца ў цудоўным стане — некаторыя з вершаў можна нават прачытаць. На сёння рарытэтная знаходка перададзена ў Нацыянальны музей Ірландыі на экспертызу.

— Знаходка стала сенсацыяй для навукі, — перадаюць словы дырэктара Нацыянальнага музея Ірландыі інтэрнэт-крыніцы. — Разам з тым гэта з'яўляецца сведчаннем таго факта, што хрысціянства ў сваім раннім перыядзе квітнела ў Ірландыі.

«Па словах экспертаў, знаходка нараджае шмат пытанняў і супярэчыць некаторым агульнапрынятым думкам аб гісторыі ранняга хрысціянства ў Ірландыі, — дадае **беларускі партал catholic.by**. — Вучоныя выказваюць думку, што Псалтыр можа быць першым сведчаннем сувязі паміж ранніім ірландскім хрысціянствам і копцкай царквой на Блізкім Усходзе».

Уласцівасці торфу дазволілі захаваць прыкладна 15 % старонак ілюстраванага рукапісу. Самае цікавае, што чалавек, які знайшоў старажытную кнігу, адразу засыпаў яе сырой зямлёй — гэта дазволіла выратаваць рарытэт ад высыхання. Зараз вучоныя думаюць над тым, як прачытаць кнігу: традыцыйным спосабам — гартаючы старонкі, альбо рэнтгенам, каб знаходку не пашкодзіць.

Чакаецца, што на ўсеагульны агляд Псалтыр выставяць у 2011 годзе.

**Ілья ЛАПАТО.**

# «НІЧОГА САБЕ НАВІНЫ!» Дайджэст цікавых, а часам неверагодных навін з замежных газет за 13 верасня

Рэкордная колькасць дзяцей нарадзілася пасля моцнага землятрусу, які скалынуў Новую Зеландыю ў мінулыя выхадныя. 21 нованароджаны з'явіўся ў радзільным аддзяленні жаночага шпіталя горада Крайстчэрч на працягу сутак пасля пачатку падземных штуршкоў. Працаўнікі шпіталя гавораць, што гэта рэкорд для суботы. Першае дзіця з'явілася праз 10 хвілін з пачатку землятрусу.

**The Independent (Англія).**

Значнай частцы жыхароў Германіі страшна ад думкі, што жыццё стане даражэйшым. Да такой высновы прыйшлі супрацоўнікі страхавой кампаніі R+V Versicherung, якая на працягу 20 гадоў цікавіцца, чаго ж баяцца нямецкія грамадзяне. У гэтым годзе індэкс страхаў рэкордны — 50 %. 68 % апытаных баяцца павышэння кошту жыцця, 67 — эканамічнага спаду. Немалую колькасць людзей страшаць прыродныя і тэхнагенныя катастрофы (64 % апытаных). На чацвёртым месцы ў рэйтынгу фобій грамадскасці Германіі — страх за тое, што кіраўніцтва краіны не ў стане вырашыць яе праблемы (62 %).

**Deutsche Welle (Германія).**

У адной з вёсак Англійскага графства Сурэй, размешчанай на беразе ракі Тылінборн, змагаюцца з амерыканскімі рачнымі ракамі. Гэтыя жывёлы пагражаюць мясцовай экасістэме: праз іх знікае папуляцыя англійскіх ракаў. Таму цяпер «амерыканскіх гасцей» ловяць і ядуць. Стравы з гэтых ракаў — самы папулярны далікатэс у мясцовым рэстаране.

**The Independent (Англія).**

Дыпламат з Саудаўскай Аравіі баіцца вярнацца ў краіну з-за сваёй нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі і сяброўства з яўрэямі, да якіх на яго радзіме не надта лаяльнае стаўленне. Супрацоўнік саудаўскага консульства ў Лос-Анджэлесе з гэтай прычыны папрасіў заступніцтва ў ЗША. «Маё жыццё ў небяспецы, і калі я вярнуся ў Саудаўскую Аравію, мяне заб'юць публічна сярод белага дня», — заявіў дыпламат. Ён крытыкуе «адсталасць» сваёй краіны і пагражае абнародаваць не надта прыемныя падрабязнасці жыцця ў ЗША аднаго з прадстаўнікоў саудаўскага каралеўскага дома.

**Die Welt (Германія).**

Навукоўцы медыцынскага факультэта Гарвардскага ўніверсітэта пасля правядзення эксперыментаў з 2757 пацыентамі прыйшлі да высновы, што медыкаменты, якія выкарыстоўваюцца для вылечвання цягліцавых курчэй, больш эфектыўныя ў папярэджванні інсульта, чым аспірын. Акрамя таго такія прэпараты прадухіляюць кровазліццё, якое часта бывае пры прыёме аспірыну. Альтэрнатыўныя медыкаменты, магчыма, у блізкай будучыні стануць даступнымі.

**The Telegraph (Англія).**

«Новы ўбор караля» з вядомай казкі Андэрсена ў хуткім часе можа з'явіцца ў рэальнасці. Навукоўцы з Сіднэя распрацавалі метад стварэння абсалютна празрыстай тканіны. Яна можа прымаць любы колер, але калі празрыстая, то зусім незаўважная на целе. У той жа час, новыя валокны не эфірныя — да іх можна дакрануцца, дадаць да звычайных.. Чалавека, апрануты ў касцюм з новага матэрыялу, ніяк нельга лічыць голым, хоць адзенне і нябачнае.. Наколькі верагодным акажацца выкарыстанне распрацоўкі ў прамысловасці, загадваць рана. Але ж, па словах стваральнікаў цуда-тканіны, у тэорыі і камп'ютарнай мадэлі ўсё функцыянуе проста бездакорна.

**Die Welt (Германія).**

Працадаўцы ўсё болей і болей выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі і іншыя інтэрнэт-сайты для вырашэння кадравых пытанняў, аб чым гаварыць у кадравых агенцтвах чэшскай сталіцы. Такім чынам можна ўпэўніцца, што патэнцыйныя працаўнікі будуць сумленнымі і добрымі супрацоўнікамі.

**The Prague Post (Чэхія).**

Тым, хто шмат цалуецца, можна не клапаціцца аб прышчэпках супраць надакучлівых вірусных інфекцый. Навукоўцы сцвярджаюць, што пацалунак стымулюе выпрацоўку антыцелаў. А гэта значыць, што наш арганізм актыўней супраціўляецца розным сезонным вірусам. Акрамя таго, выпрацоўваюцца адрэналін, які робіць чалавека больш бадзёрым, і так званы «гармон шчасця» сератанін. Пры такой абароне прастудзе проста няма на што спадзявацца.

**Die Welt (Германія).**

У галоўным міжнародным аэрапорце Філіпін прыбіральнікі знайшлі нованароджанага, пакінутага ў сметніцы ў прыбіральні аднаго з пасажырскіх авіялайнераў. Дзіця адвезлі ў шпіталь, дзе дактары запэўнілі, што яно здаровае. Зараз дзіця знаходзіцца ў сацыяльным прыюце, а яго бацькоў шукаюць. Працаўнікі аэрапорта назвалі таямнічага нованароджанага «Джордж Фрэнсіс».

**The Asia Age (Індыя).**

**Замежную прэсу ўчора чыталі Ганна ГАРУСТОВІЧ, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Кватэрнае пытанне

# Адмовілі... і мелі права

**У свой час прадпрыемства, на якім я працую, было ператворана ў ААТ (кантрольны пакет акцый знаходзіцца ў дзяржавы), таварыству ў бязвыплатнае карыстанне перададзены і жыллёвы фонд. Тады чаму мне адмовілі ў прыватызацыі кватэры, якую я атрымаў ад прадпрыемства.**

**С. Горбач,** *г. Мінск*

З пісьма вынікае, што кватэра не з'яўляецца ўласнасцю акцыянернага таварыства, а толькі знаходзіцца ў яго карыстанні. Таму ААТ не мае права не толькі прымаць імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё», але і ўвогуле разглядаць і вырашаць пытанні прыватызацыі або куплі-продажу жылога памяшкання.

У гэтым выпадку рашэнне аб прыватызацыі кватэры павінна прымаць адпаведнае міністэрства (іншы рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання), у аператыўным кіраванні або гаспадарчым распараджэнні прадпрыемства якога знаходзіўся названы жылы дом, перададзены пасля ў бязвыплатнае карыстанне ўтворанаму акцыянернаму таварыству.

Калі ж гэты жылы дом у вызначаным парадку будзе перададзены ў камунальную ўласнасць (уласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі), то рашэнне аб прыватызацыі кватэр у ім павінна прымацца адпаведным мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

**Віктар САВІЦКІ.**


Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 26 (647)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

❒ А/м «Опель-Амега-2000» 1999 г.в., 2,5 ТДІ, седан, серабрысты, АКПП, макс. кампл. 6776 у.а. Тэл. 8 029 654 30 16.

❒ Дом у в. Фалькі Вілейскі р-н, п/а Вязынь. Тэл. 8 01595 38771.

❒ А/м «Івека турба-дэйлі» 35-10, 2,8 ТД, 1999 г.в., ізатэрма, гідраборт, будка 15 м³, 11500 у.а. Торг. Тэл. 8 029 761 53 94.

❒ А/м «Форд-Фокус» 1,8 ТДІ, 1999 г.в., універсал, не патрабуе ўкладанняў. Тэл.: 8 029 931 82 28, 8 01792 55725.

❒ 3-пакаёвая кватэра з гаражом у райцэнтры Гарадок. Нядорага. Растэрміноўка. Тэл. 029 212 97 78.

❒ Газавы балон 50 л, 25 у.а., кацёл на цвёрдым паліве 40 у.а. Торг. Тэл.: 8 029 553 62 63, 8 017 331 01 67.

❒ А/м «Рэно 19» 1992 г.в., 1,8 бензін, мокры асфальт, седан, КПП мех. Тэл.: 8 01770 65727, 8 029 1810890.

❒ 2-пакаёвая кватэра, 3/5, усе выгоды, парк, возера, 30 км ад Мінска. Станькава Дзяржынскага раёна. Тэл. 8 029 854 00 99.

❒ Трактар ЮМЗ акучвальны з вялікай кабінай, на хаду + з/часткі, без дакументаў. Тэл.: 8 029 673 91 38, 613 47 19.

❒ А/м «Пежо-309» 1988 г.в., 1,3 Б, мокры асфальт, трохдзверны, у добрым стане, нядорага. Тэл.: 8 033 621 20 75, 8 01563 32 772.

❒ А/м «Форд-Арыён» 1991 г.в., 1,4 бензін. Тэл. 8 029 871 60 99.

***КУПЛЮ***

❒ Трактар МТЗ-82, можна з пагрузчыкам ці экскаватарам. Тэл. 8 044 473 68 90.

❒ Транспарцёр да польскай бульбакапалкі. Тэл.: 8 01717 47293, 8 029 269 00 92.

***МЯНЯЮ***

❒ 2-пакаёвую кватэру ў Віцебску + дачу на жыллё ў Мінску, С.-Пецярбургу. Тэл. 8 029 290 07 10.

❒ Кватэру ў Гарадку + дачу (возера Лосвіда) на Мінск, С.-Пецярбург або прадам. Тэл. 8 029 212 97 78.

❒ Самаробны трактар (рухавік Д-21) на мотаблок. Тэл. 8 029 583 77 27.

***РОЗНАЕ***

Уступлю ў перапіску з беларусамі па-беларуску. Цікаўлюся культурай Беларусі. Wieslaw Miller. Ul. Przybyszewskiego 32/34, m. 1. 93-189 Łódź. Polska. lucjan1959@gmail.com.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____


Рэверс з сеціва

# «АБВІНАВАЧВАЕЦЦА ШМАТДЗЕТНАЯ СЯМ'Я»

*(24 жніўня 2010 года)*

**Як Вы ставіцеся да шматдзетных? А чаму, увогуле, такія сем'і павінны выклікаць нейкія асаблівыя адносіны?...**

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### «Зараз пайшла тэндэнцыя — замест радзільні ездзіць па машыну ці тэлевізар»

@

Прыгожа пішуць нашы жанчыны. Аж неяк за душу бярэ. Толькі вось калі я спрабую завязаць з дзяўчатамі стасункі з прыцэлам на далейшую сям'ю, то заўсёды атрымліваю адмову, і прычына толькі адна — недахоп маіх фінансаў для таго, каб выгадаваць хаця б адно дзіця (не кажу ўжо пра двух або трох).

Напісана ўсё прыгожа, толькі рэальнае жыццё расстаўляе акцэнты трохі па-іншаму, на вялікі жаль, не так, як пішуць нашы мілыя жанчыны.

**Назіральнік.**

@

Назіральнік, не варта ўсіх дзяўчат беларускіх пад адзін грэбень прычэсваць. Тыя, што адмовіліся стварыць з вамі сям'ю, далёка не ЎСЕ. Дзяўчаты, як і хлопцы — хачу гэта падкрэсліць — розныя бываюць, з рознымі жыццёвымі прыярытэтамі. Магчыма, вы не з тымі дзяўчатамі маеце зносіны — глядзіце шырэй.

**SeriousIness.**

@

Слухайце, не кажыце глупства. Зараз пайшла тэндэнцыя — замест радзільні ездзіць па машыну ці тэлевізар. Вось што пастаўлена на п'едэстал — кар'ера і грошы. Пра дзяцей задумваюцца ў самую апошнюю чаргу. І тое для таго, каб «было каму шклянку вады падаць».

**Коля.**

@

Я гэта ўсё да таго пішу, што колькі б мы не казалі тут пра маральныя каштоўнасці сям'і, рэаліі беларускага жыцця (падкрэсліваю, менавіта беларускага) паказваюць на тое, што матэрыяльныя каштоўнасці пакуль што маюць прыярытэт у большасці выпадкаў. Зразумела, я не збіраюся прычэсваць усіх пад адзін грэбень, тым больш што адзін з маіх галоўных лозунгаў па жыцці — усе людзі розныя. Але ў большасці выпадкаў усё ўпіраецца ў грошы, а не ў мае маральныя або якія-небудзь іншыя якасці.

**Назіральнік.**

@

Рэаліі рэаліямі, але ж гэта не азначае, што мы не мусім альбо не можам іх змяняць, прынамсі ва ўласным блізкім асяроддзі.

Хоць прывязка да матэрыяльных каштоўнасцяў (а часцей жаданне нічога не рабіць і ўсё атрымліваць) — гэта істотная праблема. Таксама жаданне «даць свайму дзіцяці найлепшае» (дбаючы толькі пра дабрабыт і «лепшыя ўмовы») перарастае ў спешчанасць і безадказнасць — бачу на прыкладзе сваіх знаёмых, якія ў 25 гадоў, маючы нават купленую бацькамі кватэру, жывуць у іх «пад крылцам» і хочуць мець усё і адразу.

**Spadar.**

@

Spadar, цалкам згодны. Толькі вось як усё гэта патлумачыць іншым?

У большасці выпадкаў усё зводзіцца да таго, што дзіця трэба ў першую чаргу забяспечыць матэрыяльна. А калі спрабуеш загаварыць пра тое, што не хлебам адзіным, то глядзяць як на ідыёта.

**Назіральнік.**

@

Першаснасць матэрыяльнага нам прыўносіцца часцей з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі. Пераважна тэлебачаннем.

Гэта хутчэй тое, што ў нас жадаюць бачыць, а не тое, што ў людзях ёсць першапачаткова.

Мітусня і шэрасць (быць як усе) — прыглушаюць колеры карціны жыцця.

Свет жа такі, якім мы яго хочам сабе ўяўляць. Думкі і жаданні матэрыяльныя. Беражыце сваю мару. «Думай пра добрае...»

**Брат.**

### «Зараз звычайна размнажаюцца не алкаголікі, а проста людзі недалёкія»

@

Я супраць шматдзетных сем'яў. Яны ў мяне выклікаюць раздражненне. Зараз звычайна размнажаюцца не алкаголікі, а проста людзі недалёкія... Дзеці ў іх недагледжаныя і слабаразвітыя, а бацькі толькі і чакаюць дарэмшчыны з розных крыніц...

**Саша.**

@

Не праўда, што размнажаюцца толькі недалёкія, і што дзеці ў іх недаразвітыя. У маёй знаёмай чацвёра дзетак. Вельмі разумныя малыя. Мама чытае ім кніжкі на дзвюх мовах — рускай і беларускай, старэйшых водзіць у музычную школу. А ў другой знаёмай адно дзіця — казку «Маша і тры мядзведзі» пачула толькі, калі само навучылася чытаць, ходзячы ў першы клас.

Я з задавальненнем пайшла б услед за шматдзетнымі (у мяне пакуль толькі двое), але муж супраць трэцяга — і праблема не ў тым, што мы не зможам зарабіць на тое, каб яго накарміць і апрануць (тут ужо як-небудзь прарвёмся). Самы асноўны артыкул выдаткаў у нас зараз — лекі і плата за паслугі нармальных лекараў, таму што ў паліклініках часта і дыягназ правільна паставіць не могуць. Яшчэ... адукацыя (няпраўда, што сады і школы ў нас бясплатныя — там збіраюць на ўсё, іх рамантуюць і абсталёўваюць з кішэняў бацькоў). Дадатковая адукацыя (гурткі, секцыі, басейн, факультатывы, рэпетытары і г.д.) шалёна дарагая, а ўсё гэта таксама хочацца дзіцяці даць. А вы паспрабуйце аддаць дзіця ў садок у густанаселеным раёне, або калі вы з новабудоўлі — вам адкрытым тэкстам заявяць, што тут «трэба даць».

Мяне не палохае ні тое, што я сабе ў чымсьці буду адмаўляць, што не змагу дазволіць набыць новыя шмоткі або паехаць на курорт, не палохае і дадатковая нагрузка, звязаная і з выхаваннем дзяцей (хоць і з двума ўжо такое адчуванне, што свайго жыцця няма вечарамі: гатуеш, мыеш, пасвіш дзетак на вуліцы або чакаеш з гімнастыкі, робіш дамашнія заданні, а пасля таго, як яны пакладуцца спаць, яшчэ да дванаццаці або гадзіны ночы прыбіраешся, а ўсе выхадныя водзіш іх па гуртках). Мяне не палохаюць ніякія праблемы, і я гатовая гадаваць і выхоўваць (!) яшчэ дзяцей... толькі б дзіцячая медыцына і адукацыя сапраўды былі бясплатнымі.

І я думаю, што не адна такая.

А наконт стэрылізацыі алкагалічак, якія нараджаюць непатрэбных дзяцей, я ўсімі лапамі «за». І дзеткі не будуць пакутаваць, і з іх не вырастуць такія ж. Ізноў жа — навошта дзяржаве ўкладваць грошы ў сям'і, з якіх нічога добрага не будзе. Лепш гэтыя сродкі ішлі б на дзіцячыя садкі, школы, паліклінікі.

**Лёшка.**

### «А мне зусім не хочацца, каб беларусы вымерлі як маманты»

@

У мяне ёсць блізкі чалавек, не свааk. Яго маці — алкагалічка. Яна нарадзіла 8 дзяцей. Мой блізкі чалавек — чацвёрты. Калі б яго маці прастэрылізавалі, то гэтага чалавека не было б на свеце, а таксама двух яго выдатных дзетак. Думаю, маё жыццё было б нашмат менш цікавым у гэтым выпадку. І не толькі маё.

Хто мае права вырашаць — быць ім або не быць? Пакутаваць або не пакутаваць? І дзе гарантыя, што ніхто з тых, што пішуць тут, не спатыкнецца, не патрапіць у гэтую пастку? Сам, або хто-небудзь з яго блізкіх. Усе пра сябе ўсё ведаюць?

У мяне трое дзяцей. Яны ўсе вельмі разумныя і добрыя. Богу дзякую кожны дзень за гэтае шчасце. На чацвёртае не рашаюся з-за ўласнага эгаізму і маладушша. Чаго ўжо тут падманваць сябе і іншых. І трэцяга б не было, калі б не выпадковасць... І за яе дзякую Богу. І за дапамогу.

А наконт «раздражняюць»... Быў у мяне сусед, яго раздражнялі ўсе акулярыкі, маўляў, стаяць ля прылаўка, плюшчаць вочы, рэзкасць наводзяць... Гэта ён мне казаў, а ў мяне блізарукасць, і ў маіх дзяцей таксама. Ну што ж, пашкадаваць чалавека застаецца, калі яго раздражняюць такія рэчы. Бедны ён, бедны. Ну ва ўсіх сэнсах! БЕД-НЫ...

**Mamablue.**

@

Звычайна шмат дзяцей у багатых ці бедных сем'ях — яны могуць гэта сабе дазволіць. Апошнія 20 гадоў я заўважыў, што ў беларусаў лепш атрымліваецца тое, што не трэба рабіць рукамі — дзеці. Таму раю браткам-беларусам лепш рабіць дзяцей...

З павагай, сусед з Усходу.

**Валерык.**

@

Я ўвогуле не разумею, навошта патрэбная высокая нараджальнасць? Дзяцей стала больш — першыя класы зараз з садкоў забіраюць, ды і садкі перапоўненыя, усюды і без таго чэргі, чэргі... Я — за адно дзіця ў сям'і... Адзін спадчыннік, усё яму на 100 працэнтаў ад бацькоў, плюс самі бацькі могуць трохі пажыць для сябе.

**Алена.**

@

Чаму адно дзіця ў сям'і — не заўсёды добра. У адных маіх знаёмых была толькі адна дачка. Яна ўжо выраслa, была разумніцай і прыгажуняй, але сям'ю завесці не паспела. І нейкі наркаман яе забіў. Гэтыя мае знаёмыя зараз ужо на пенсіі, новае дзіця завесці не могуць ні фізіялагічна, ні псіхалагічна. Яны мне так і казалі, што ім няма сэнсу жыць далей.

А зараз паглядзіце вакол: колькі кожны дзень гіне маладых людзей у розных нясчасных выпадках, і ўявіце, што на іх месцы апынулася ваша АДЗІНАЕ дзіця. Гэта калі падыходзіць прагматычна.

А калі думаць не толькі пра сябе, але яшчэ і пра краіну, то для падтрымкі колькасці нас

## Дзве даты

### 14 верасня

**1936 год** — на сакрэтнай нарадзе Палітбюро ЦК УКП (б) прыняло рашэнне аб масавай засылцы супрацоўнікаў НКУС СССР і ваенных спецыялістаў у Іспанію для ўдзелу ў ваенным канфлікце там.

**1954 год** — у Савецкім Саюзе, на ваенных вучэннях у Арэнбургскай вобласці праведзены вучэнні з рэальным выбухам атамнай бомбы. Бомба ўзарвалася на вышыні каля 350 метраў над паверхняй зямлі, г.зн. быў ажыццёўлены наземны выбух. Звесткі пра параметры падарванай бомбы, у тым ліку яе трацілавы эквівалент, дагэтуль засакрэчаны ў архівах Міністэрства абароны. Маршал Г.К. Жукаў назваў эквівалент у 40 000 тон, што ўдвая пераўзыходзіць магутнасць бомбы, скінутай на Хірасіму. Аднак па адлегласці ўзгарання будынкаў і збудаванняў на аддаленні 7 і больш кіламетраў ад эпіцэнтра можна рэканструяваць эквівалент і да 100 000 тон.

## Цытата дня:

***«Хлусня заўсёды ўецца, як змяя, якая ніколі не бывае прамой — паўзе яна ці спакойна ляжыць; толькі калі яна мёртвая, яна прамая і не прытвараецца».***

**Марцін Лютэр (1483—1546), дзеяч Рэфармацыі ў Германіі.**

## ПЕРАВАРОЧВАННЕ ПРАДМЕТАЎ

**У традыцыйнай культуры беларусаў існаваў і да сённяшняга часу захаваўся цэлы шэраг дзеянняў, звязаных з перакульваннем або пераварочваннем прадметаў, якія суправаджаюць асноўныя этапы пахавальна-памінальных абрадаў.**

● Момант надыходу смерці вызначалі па стане перавернутага люстэрка, паднесенага да вуснаў паміраючага. Сухая паверхня сведчыла аб адсутнасці прыкмет жыцця, што патрабавала распачаць адпаведныя рытуальныя дзеянні.

● Калі смерць надыходзіла цяжка, чалавека пераносілі на зямлю (на падлогу), засцеленую саломай мінулагодняга ўраджаю. Пры гэтым яго клалі галавой да дзвярэй (пераварочвалі).

● Алгарытм перавернутасці праглядаўся і ў заключнай частцы пахавальнага абраду. Памерлага выносілі з хаты ўперад нагамі і адразу ж пераварочвалі табурэткі або лаўкі, на якіх стаяла труна. Прычым існуюць два варыянты пераварочвання: або пераварочваюць уверх нагамі абедзве табурэткі, або толькі адну і ставяць яе ніцма на другую. Змест гэтага дзеяння быў адзін і той жа: не даць смерці раней за жывых «заняць» гэта месца і «забраць» яшчэ каго-небудзь з гэтай сям'і.

● У структуры пахавальнай абраднасці важнае месца займаў апошні зямны шлях нябожчыка, з якім звязаны вялікі цыкл вераванняў, прыкмет і прадказанняў, што вызначалі далейшы лёс сям'і, блізкіх або аднавяскоўцаў: непажадана, каб нехта ехаў або ішоў насустрач; кепска, калі за пахавальнай працэсіяй ішла якая-небудзь жывёліна (у гэтым выпадку нехта з мужчын вываротваў шапку і спрабаваў адагнаць яе).

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Новая крама для аматараў рыбнай лоўлі адкрылася па адрасе вул. Лясная, 25. Тут вас чакае шырокі выбар разнастайных прынад, спіртных напояў і прадуктаў харчавання. У продажы ёсць таксама жывая рыба і кніга «Рыбацкія гісторыі», у якой вы заўсёды знойдзеце, што расказаць жонцы ці сябрам.**

☺

Не страляйце ў футбаліста — ён гуляе, чым умее.

☺

**Праезд у электрычках можа падарожжаць у 2 разы. Будзем у 2 разы больш эканоміць! Зайцы.**

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.40 | 19.29 | 12.49 |
| Віцебск — | 6.29 | 19.20 | 12.51 |
| Магілёў — | 6.30 | 19.19 | 12.49 |
| Гомель — | 6.28 | 19.14 | 12.46 |
| Гродна — | 6.56 | 19.44 | 12.48 |
| Брэст — | 6.58 | 19.43 | 12.45 |

### Месяц

***Першая квадра 15 верасня. Месяц у сузор'і Стральца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Марфы, Сямёна.*

***К.*** *УЗВІЖАННЕ (Узвышэнне Крыжа Святога), Альберта, Бярнарда, Рамана, Цыпрыяна.*

Фота Сяргея АЛЯКСАНДРАВА:

### НАДВОР'Е на заўтра

### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (8 верасня). Па гарызанталі:** Караткевіч. Еўра. Кон. Такт. Каракарум. Аўра. Акант. Этап. Мінск. Кір. Рулада. Іла. Штамп. Даёнка. Улан. Тол. Вена. Завала. Кража. Абол. Нар. Карп. Ага. Акр. Секанс. Абат. Дары. Стан. Куляшоў. **Па вертыкалі:** Унікум. Шамякін. Ронда. Увага. Мележ. Коп. Ананас. Танк. Яна. Рак. Ракада. «Есентукі». Кабан. Амар. Бернар. Ігрэк. Стык. «Татра». Зло. Лаза. Арэлі. Век. «Аталанта». Ада. Колер. Лупа. Зала. Прыліў.

# ХТО-ХТО, А ЕГІПЦЯНЕ ДАКЛАДНА ВЕДАЮЦЬ, ЯК ЗАРАБІЦЬ НА ТУРЫСТАХ!

**ПАЕЗДКУ ў афрыканскі Каір з азіяцкага Шарм-эль-Шэйху лічу надзвычай бюджэтнай. Для параўнання: дарога да «мамкі на бліны» з Мінска (і назад) мне абыходзіцца больш як у 20 долараў. А тут — ехаць у два разы далей, ды яшчэ і насычаную экскурсійную праграму прапаноўваюць з абедам не дзе-небудзь, а на беразе Ніла. І ўсё гэта за 150 тысяч беларускіх рублёў...**

## У Афрыцы карэспандэнта «Звязды» вучылі цалавацца са Сфінксам і хацелі скарміць кракадзілам...

### ПА СТАЛІЦЫ ЕГІПТА РАЗ'ЯЗДЖАЮЦЬ НАВАТ НА АСЛАХ

У некалькіх кіламетрах ад Каіра мы прыпынніліся ля прыдарожнай кавярні. Папіць кавы, каб хутчэй прачнуцца (ехалі ж усю ноч), вырашылі на свежым паветры. Пра што адразу ж пашкадавалі, бо побач са смеццем, якое было паўсюль, куды ні кінь вокам, падсілкоўваўся аб'едкамі вялізны пацук. Сон развеяўся ў імгненне, як і не было. Але шэры прожар, можаце сабе ўявіць, усю дарогу працягваў стаяць у мяне перад вачыма.

Дзякуй Богу, да Каіра было рукой падаць. Менавіта гэты горад сваімі кантрастамі прымусіў адразу ж забыць пра ўсё на свеце! Я прыліпла да акна аўтобуса і пачала зазіраць у салоны аўтамабіляў, што праязджалі міма, каб на нейкае імгненне, а калі пашчасціць (упершыню радавалася заторам), і на больш працяглы час, судакрануцца з мясцовым насельніцтвам. І некалькіх хвілін хапіла пераканацца, што ў сталіцы Егіпта жывуць надзвычай веруючыя людзі. Гаворыць пра гэта не столькі вялікая колькасць мінарэтаў, колькі тое, што практычна ў кожным салоне аўто на заднім сядзенні ляжыць Каран, а на люстэрку вісяць ружанцы.

**Раптам бачу на гарызонце — жанчына ў чорным на асле. Пад'ехала да мяне бліжэй і злосна пачала нешта мне гаварыць па-свойму, суправаджаючы маналог жэстамі.**

Машыны па вуліцах Каіра рухаюцца надзвычай хаатычна, па нейкіх сваіх унутраных няпісаных правілах. І нядзіўна — там жа няма святлафораў!.. Вось і бібікаюць кіроўцы адзін аднаму бесперастанку: хто раней бібікне, той першым і паварочвае...

У сярэдневяковай частцы горада дык наогул людзі пераважна ездзяць на аслах ды конях. Мясцовыя мужчыны не прамінуць памахаць туристам рукой і ўсміхнуцца. Егіпцянкі ж, якіх дастаткова шмат як сярод кіроўцаў, так і сярод пешаходаў, не праяўляюць да іншаземцаў ніякай цікавасці. Чаго не скажаш пра нас. Асобныя з тамтэйшых жанчын здзівілі майстэрствам эквілібрыстыкі. У думках не ўкладаецца, як кволая каірчанка можа столькі ўсяго насіць на галаве... Запомнілася мне і гандлярка, якая сядзела непадалёку ад праезнай часткі ў позе лотаса побач з непрыглядным металічным тазам з рыбай...

За рулём дарагога мініяцюрнага аўтамабіля прыкмеціла маладую дзяўчыну з шыкоўнымі распушчанымі валасамі і ў па-еўрапейску яркай майцы з кароткім рукавом.

— У нашай краіне большасць жанчын, як вы, пэўна, заўважылі, ходзяць у хіджабах, — злавіў мой погляд наш егіпецкі гід Ісмаіл. — Ёсць і такія, але іх засталося не так шмат, якія строга выконваюць Каран і не выходзяць на вуліцу без парандж. Але ёсць і іншыя... Вы ж самі бачылі. Прычым ведаю прыклады, калі ў межах адной сям'і сёстры апранаюцца кардынальна па-рознаму. Адна носіць паранджу і сядзіць дома, а другая — носіць сучасную вопратку і зарабляе грошы. Егіпцянка мае права сама выбіраць, як ёй апранацца і чым займацца па жыцці.

Ніколі не забуду і жанчыну ў чорным на асле, якая, убачыўшы, што я яе фатаграфую, пад'ехала да мяне бліжэй і злосна пачала нешта вельмі хутка гаварыць, суправаджаючы маналог жэстамі. Наколькі я зразумела, яна папрасіла мяне сцерці фотаздымак з ёй альбо заплаціць за фотасесію грошы. Фотаздымка мне было шкада, таму пайшла ў аўтобус за грашыма. Калі вярнулася, прадпрымальную егіпцянку як вецер звеяў...

### «АЖАНІЦЦА З РУСКАЙ — МАРА МНОГІХ ЕГІПЦЯН»

Самымі прыгожымі будынкамі ў Каіры, як мне падалося, з'яўляюцца мячэці. Большасць жа астатніх распрацовак архітэктараў нагадваюць, шчыра прызнацца, запыленыя кардонныя каробкі. А месцамі горад наогул выглядае так, быццам па ім толькі што прайшоў Кінг-Конг пад ручку з Гадзілай.

Праязджалі мы і ля эфектнага гатэля, уладальнік якога, паводле слоў нашага гіда, адзін з самых багатых людзей Егіпта.

— Ён, палітык і бізнэсмен, зараз чакае смяротнага пакарання праз павешанне за арганізацыю забойства сваёй палюбоўніцы — ліванскай попзоркі Сюзан Тамім, — распавядае Ісмаіл. — Матывам забойства, кажуць, была рэўнасць. Справа ў тым, што дзяўчына выйшла замуж за чэмпіёна Ірака па кік-боксінгу. Гэтая гісторыя ў нашай краіне атрымала вялікі грамадскі рэзананс.

Па дарозе да Сфінкса заехалі на парфумную фабрыку, дзе кошты на эфірны алей, адразу скажу, завоблачныя. У Шарм-эль-Шэйху можна набыць усё тое ж самае, але значна танней. Менавіта там я ўпершыню ўбачыла чатырох рускіх эмігрантак. Бачна было, што Надзя, самая ўсмешлівая, сваёй працай і жыццём у Каіры задаволеная, пра астатніх траіх я б так не сказала.

— Рускіх жанчын, якія выходзяць замуж за егіпцян, з кожным годам становіцца ўсё больш і больш, — кажа Ісмаіл. — Ажаніцца з рускай — мара многіх егіпцян. Гэта, калі так можна сказаць, нават прэстыжна.

У Егіпецкім Нацыянальным музеі, дзе сабрана больш за 150 тысяч экспанатаў, каб дэталёва агледзець усе, спатрэбіцца вельмі шмат часу. Таму наш гід, на якім была, дарэчы, чырвоная кепка, вельмі падобная на нашу «звяздоўскую», выбіраў самае цікавае. Паводле яго слоў, найбольшую цікавасць для рускіх турыстаў уяўлюць залатая маска і шматразовы льняны прэзерватыў, якія знайшлі ў магільні фараона Тутанхамона. З гідам нам, да слова, вельмі пашанцавала, бо ён аказаўся гумарыстам. Жартаваў не толькі падчас экскурсіі, але і калі мы пад'ехалі да рэстаранчыка, што месціцца ля берага Ніла.

— Зараз, мае даражэнькія, у нас па праграме абед. Мы скормім вас кракадзілам...

Пакуль я спускалася ў піраміду, мой спадарожнік усё ж такі паддаўся гіпнозу. Гляджу, стаіць усмешлівы на фоне піраміды, на галаве белая хустка, замацаваная жоўтай коскай. Калі я падышла, усмешка з твару сябра паспела знікнуць. Як высветлілася, егіпцянін, як нас і папярэдзвалі, згадзіўся вярнуць фотаапарат толькі ўзамен на долары.

### «ДАРМАВЫХ» ВЯРБЛЮДАЎ НЕ БЫВАЕ?»

Пасля сытнага абеду і наведвання папіруснай фабрыкі аўтобус адвёз нас у Гізу (зараз прыгарад Каіра), дзе мы на свае вочы ўбачылі адзіны цуд свету, які дайшоў да нас скрозь стагоддзі — Егіпецкія піраміды. Менавіта там Ісмаіл вучыў трымаць піраміду Хеопса на далоньцы і цалавацца са Сфінксам — маналітнай статуяй, якая адлюстроўвае загадкавую істоту з тулавам ільва і галавой чалавека. У мяне доўга не атрымліваўся пацалунак, бо разбіраў смех. А паколькі часу было ў абрэз, то я папрасіла Ісмаіла паказаць майстар-клас. На што пачула жартаўліва : «Мне да заходу сонца нельга. Рамадан». Вось ён — усё той жа выключна мусульманскі гумар.

— Дакранацца да жанчыны бедуіну катэгарычна нельга, інакш прыйдзецца жаніцца, фатаграфавацца побач — таксама, — пракансультаваў нас, перад тым як развітацца на 30 хвілін, Ісмаіл. — Адным словам, мужчыны, не спускайце вачэй са сваіх каханых. І не згаджайцеся на прапанову егіпцян сфатаграфаваць вас, інакш рызыкуеце атрымаць свой фотаапарат назад толькі за грошы...

**Маладую парачку, пэўна, не папярэдзілі, што каля пірамідаў «дармавых» вярблюдаў не бывае...**



**Паўсюль, і каля папіруснай і парфумнай фабрык, і каля пірамідаў гандляры-егіпцяне не даюць праходу турыстам са сваімі ўпрыгажэннямі, пірамідкамі-сувенірамі і, безумоўна ж, папірусамі. Таргуйцеся, як гэтая рускамоўная парачка, якая ехала з намі ў аўтобусе, і вы зможаце скінуць першапачатковы кошт як мінімум на палову.**

Пасля выхаду публікацыі «Егіпецкі шарм для беларускіх шэйхаў» на сайт «Звязды» прыйшло пытанне ад Веры, якая ў кастрычніку збіраецца ляцець у Егіпет. **«Я мару пабачыць піраміды і пакатацца на вярблюдзе, — піша чытачка. — Але кажуць, што бедуіны прапаноўваюць пакатаць на вярблюдзе бясплатна, а пасля не спускаюць на зямлю, пакуль не заплаціш грошы. Ці праўда гэта?»**

Калі мы пад'язджалі да пірамідаў, наш гід Ісмаіл расказаў таксама, што ніхто дакладна не ведае, колькі бедуінаў у Егіпце. Яны качуюць па пустыні і не маюць не толькі пастаяннага месца жыхарства, але нават і пашпарта. Маўляў, калі звязуць турыста ў пустыню, то яго, зразумела, нялёгка будзе знайсці. «Я б на вашым месцы не рызыкаваў і не паддаваўся на ўгаворы мужчын у арафатках. Паверце мне, ля пірамідаў «дармавых» вярблюдаў не бывае. Бедуіны згаджаюцца апусціць «карабель пустыні» на калені, як правіла, не менш як за сто долараў». Шчыра прызнацца, пасля гэтых слоў жаданне катацца на вярблюдзе адпала ва ўсёй нашай групы. Асабіста ў мяне яшчэ больш пасля таго, як адзін егіпцянін на вярблюдзе каля пірамідаў Хеопса спрабаваў патрабаваць у мяне грошы за тое, што я сфатаграфавала яго найдаражэйшую персону. Праўда, пасля Ісмаіл параіў тым, хто ўсё ж такі марыць апынуцца паміж гарбамі вярблюда, запісацца на экскурсію «ў гасцях у бедуінаў» (у гэтым выпадку паездка на «караблі пустыні» будзе ўключана ў экскурсійную праграму, якая каштуе 25 долараў).

***

Развіталіся мы з Каірам пасля шасці гадзін вечара. А палове на сёмую, якраз пасля захаду сонца, назірала праз акно аўтобуса, як мусульмане, адклаўшы ўсе справы, пачынаюць актыўна есці і піць. Прычым, заўважыла, тут ніхто не есць па адным. Не выключэнне і нашы праважатыя, ахоўнік з аўтаматам і прадстаўнік турагенцтва Шэрыф. Яны набылі ў маладога чалавека на ўзбочыне два цэлафанавыя празрыстыя пакеты з вярблюджым малаком і карычневым безалкагольным напоем. Апошні, каштавала яго ў Шарм-эль-Шэйху, шчыра прызнацца, не прыйшоўся мне па душы. Хоць егіпцяне яго вельмі любяць і сцвярджаюць, што ён вельмі карысны і вельмі добра наталяе смагу. Дарэчы, што тычыцца егіпецкіх страў, то знаёмыя, якім даводзілася пабываць у бедуінскай вёсцы, расказвалі, што там на іх вачах бедуінка прыгатавала праснак на іржавай накрыўцы ад бочкі, замест вугалёў быў вярблюджы памёт. Ім сказалі, што накрыўку кладуць спецыяльна для тутэйшых, а для сябе пякуць прама на гэтых «вуглях». Смачны праснак ці не, знаёмыя так і не даведаліся, бо ветліва адмовіліся ад дэгустацыі...

**Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.**

### Парада турысту: паспех — людзям на смех!

*Не паспелі мы размясціцца ў гатэлі, як прыехаў менеджар і са словамі «ў нас самыя выгадныя кошты» прапанаваў з'ездзіць у Каір за 120 долараў. Мы, на сваё шчасце, сказалі, што падумаем. Праўда, думалі не надта доўга, на наступны дзень набылі пуцёўку за 50 (!) долараў у тураператара (іх там, дарэчы, хоць гаць гаці), з якім пазнаёміліся падчас прагулкі па Шарм-эль-Шэйху.*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4473 Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12